32 старонкі

№ 48 (358) 26 сьнежня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Калядны нумар

## Сем апавяданьняў на сем калядных вечароў

Уладзімер Арлоў
«Крыжы Мантэнэгра»........................старонка 20
Джэці «Язьмінчыны калядкі»..............старонка 22
Ульям Трэвар
«Каляды ў Лёндане»..........................старонка 23
Рубэн Давід Ганзалес Гальега
«Я — герой».........................................старонка 24
Сяргей Астравец «Цыфэрблят»...........старонка 26
Марыя Вайцяшонак
«Тэрарыстка».......................................старонка 29
Аляксандар Прышывалка
«Калядная дзіцячае»............................старонка 30

## Вынікі году

Тэма нумару.

Старонкі 3–8

## Адстаўкі Шэймана

патрабуе Эўропа.

старонка 4

## Рэйтынгі «НН»

Найлепшыя фільмы, кнігі, песьні, бурбалкі году.

Старонкі 10–13

# Шчасьлівых Калядаў, героі году!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Андрэй Хадановіч
## Адвечным шляхам

Той парою, калі ў дзяўчатак шалік на горле
і на тварах бамжоў імгненна сінеюць насы,
і мясцовыя алькаголікі, каб ня ўмёрлі,
спажываюць унутар вадкасьць чароўнай красы,

трое дзіўных суб'ектаў адвечным шляхам цярністым
паміж пустак, балот заваленай сьнегам зямлі,
псуючы лыжню беларускім біятлянiстам,
у нязнаным напрамку, хістаючыся, брылі.

Назавем іх «магі». (А раптам здарыцца шанец
скарыстаць камэрцыйным чынам вядомы брэнд!)
Хай адзін, для паліткарэктнасьці,
будзе афраамэрыканец,
а другая — жанчына, а трэці — арабскі студэнт.

Так бадзяліся, гнаныя прагай прыгод і сплінам,
бадуном і проста пошукамі цяпла,
калі сьветлая зорка над раўбіцкім лыжным трамплінам
узышла і сьветлыя згадкі з сабой прывяла.

І, згадаўшы, пайшлі — і кульгаюць па сьвеце ўрачыста,
і, як вірус, разносяць патрэбу дзяліцца дабром:
то ўначы падкінуць налепку ў партфэль ліцэіста,
то драўляны брусок — берасьцейскім
галодным бабром...

Замяло ўсе кірункі — адно сьнегавыя карункі,
і бялюткі лядзяш вісіць на чырвонай губе.
І для кожнага разьдзяўбая ў іх падарункі,
і, магчыма, нешта абломіцца нават табе.
**сьнежань 2003**

**Калядная паласа вершаванага радка на старонцы 23.**

БУХГАЛЬТАРСКІЯ ПРАГРАМЫ
**Анжэліка**
*лепшы сродак для аўтаматызацыі малых і сярэдніх прадпрыемстваў*
апошні дзень ручнога ўліку
я ўжо вырашыла

• плацежкі
• склад • АС • зарплата
• бухгальтэрыя • мэню
• арэнда • гандаль
• білетная гаспадарка
ПРАСЬЦЕЙ НЕ БЫВАЕ
220013 г. Менск, вул. Я.Коласа, 23/1-1
Тэл: (017) 232-13-33, факс: (017) 231-35-46
E-mail: support@gsbelarus.com
www.gsbelarus.com

## Вацлаў Гавал

Для «НН» мінулы год адзначыўся перадусім прэміяй імя Ганны Эленбоген, якую перадаў газэце былы прэзыдэнт Чэхіі Вацлаў Гавал. У Калядным нумары — гутарка з Гаўлам. Былы чэскі прэзыдэнт разважае пра тое, чаму ён захапляецца Чэ Геварам, чаму людзі крыўдуюць на Амэрыку, а таксама чаму ён займаецца беларускімі справамі. **Старонка 9.**

## Пра вялікія і малыя справы

...Яны жылі далёка, а якраз здарылася строгая зіма, дарогі былі пакрытыя галалёдам і грамадзкі транспарт амаль не хадзіў. Я быў у клопаце, бо ня ведаў, як мне дабрацца ў час да гэтай сям'і. Мой сумазмоўца нейкі час маўчаў. Нарэшце ўсклікнуў: «Народ церпіць і гіне, а вы хваліцеся, што нехта недзе памёр»... **Каляднае пасланьне айца А.Надсана.** **Старонка 2.**

## Твары году



**Старонка 14.**

**Мы страцілі героя — памёр Васіль Быкаў. І мы набылі герояў — у асобе выкладчыкаў і вучняў закрытага Беларускага Ліцэю... Ліцэй, зачынены без усякіх важкіх прычынаў і зразумелых тлумачэньняў, працуе. Пад бясконцым прэсінгам ён працягвае даваць навуку дзецям. Гэта тая падзея, якая праз дзесяцігодзьдзі, нават стагодзьдзі застанецца ў беларускай гісторыі, — змаганьне за свабоднае навучаньне на беларускай мове. Засталіся ў гісторыі філяматы і філярэты, застануцца й ліцэісты.**
**Варты найменьня чалавека году і Ўладзімер Колас, кіраўнік Ліцэю. Ён здолеў арганізаваць навучальны працэс, хоць улада пазбавіла гэтую ўнікальную школу памяшканьня, а выкладчыкаў — заробку...**
**На Каляды ліцэістаў «вывезьлі» на два тыдні ў Вільню беларусы Літвы і літоўскі ўрад. Шчасьлівых Калядаў, героі году!**
**Асобы году — старонка 32.**

КАЛЯДНАЕ ПАСЛАНЬНЕ

# Пра вялікія і малыя справы


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Нядаўна я атрымаў ліст, заадрасаваны проста «The Priest» (Сьвятару). Аўтар ліста, не падаючы свайго прозьвішча, пісаў: «Мы жывём па суседзтве, і нам балюча бачыць, як цяжка вам хадзіць... Хочам параіць вам лекі...»

Сацыёлягі часта называюць сучасны вялікі горад асфальтавымі джунглямі, дзе людзі могуць жыць гадамі побач, ня ведаючы адзін аднаго. Таму я быў моцна ўзрушаны гэтым лістом. Ня столькі лекарскімі парадамі, як увагаю да патрэбаў іншага і жаданьнем прыйсьці з дапамогаю. Міжволі прыйшла на памяць прыпавесьць пра добрага самараніна.

Мы жывём у часе, калі ўвесь сьвет стаў адной вялікай вёскай, і таму ўзьнікаюць пытаньні палітычнага і эканамічнага ладу, сацыяльнай справядлівасьці, аховы асяродзьдзя і г.д., якія датычаць усіх нас. Для іхняга вырашэньня патрэбны больш шырокі, часта глябальны падыход. Трэба, аднак, мець на ўвазе, што такі падыход, пры ўсёй сваёй неабходнасьці, хавае ў сабе небясьпеку дасягаць дабра грамадзтва коштам дабра людзкой асобы.

Дабро грамадзкай супольнасьці — сям'і, нацыі, усяго чалавецтва — ня можа быць нечым асобным ад дабра ейных складовых адзінак. Таму мэтай добраўпарадкаванай супольнасьці ёсьць стварэньне ўмоваў для як мага больш поўнага разьвіцьця кожнай асобай дадзенага ёй Богам патэнцыялу аж да Боскага ўсынаўленьня.

Шмат гадоў таму, калі яшчэ існаваў Савецкі Саюз і Беларусь была ягонай часткаю, я меў нагоду сустрэцца з адным вядомым беларусам, якому пашчасьціла наведаць Захад. Як часта бывала ў такіх выпадках, у нас пайшла гутарка пра долю беларускага народу, пра цяжкае становішча, у якім апынулася беларуская мова і культура. Раптам нашу гутарку перарваў тэлефонны званок: сям'я аднаго беларуса паведамляла мне пра сьмерць бацькі і прасіла прыехаць пахаваць яго. Яны жылі далёка, а якраз здарылася строгая зіма, дарогі былі пакрытыя галалёдам і грамадзкі транспарт амаль не хадзіў. Я быў у клопаце, бо ня ведаў, як мне дабрацца ў час да гэтай сям'і. Мой суразмоўца нейкі час маўчаў, але было бачна, што нэрваваўся. Нарэшце ўсклікнуў: «Народ церпіць і гіне, а вы хвалюецеся, што нехта недзе памёр». Мне стала прыкра, я разгубіўся і адразу ня ведаў, што адказаць. Безумоўна, гутарка з гэтым чалавекам пра цяжкую долю нашага народу страціла для мяне цікавасьць. Я зразумеў, што нельга заўсёды складаць на вонкавыя абставіны віну за цяжкасьці і няшчасьці, якія нас сустракаюць: часта мы іх ствараем самі, асабліва сваім нячулым і безуважлівым стаўленьнем да іншых людзей.

Хрыстос, наш Бог і Збаўца, прыйшоў у сьвет, каб збавіць яго. Прыйшоў Ён ня ў боскай славе і сіле, але як бездапаможнае дзіцятка, якое залежыць ад спагады іншых. Мусіць, гэткім чынам Ён нам нагадвае: перад тым як брацца за вялікія справы, пастараемся бачыць маленькія патрэбы тых, што блізка нас.

Для Дзіцяткі Хрыста і Ягонай Маці не знайшлося месца сярод людзей. Няхай жа Ён знойдзе месца ў нашых сэрцах і зробіць нас чулымі да патрэбаў нашых блізкіх, памятаючы словы Збавіцеля: «Усё, што вы зрабілі аднаму з маіх найменшых братоў, — мне зрабілі» (Мц 25:40).

Вось гэтымі думкамі мне хацелася б падзяліцца з вамі, дарагія чытачы, у гэты сьвяты Калядны час і пажадаць вам ласкі Божай і шчасьця ў Новым 2004 годзе.

**Айцец Аляксандар Надсан,**
апостальскі візытатар
для беларусаў-каталікоў замежжа

# Калядныя вітаньні Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі



Дарагія Суродзічы. Браты і Сёстры Беларусы!

З глыбіні сэрца віншую Вас зь Сьвятамі і жадаю Вам шчасьця і посьпехаў у Вашым жыцьці.

У Сьвяты Вечар Божага Нараджэньня буду прасіць Яго, каб даў нам волю і сілу разбурыць сьцяну, якая яшчэ ўсё ўздымаецца між намі і свабодай.

Буду прасіць Усёмагутнага, каб дапамог кожнаму з нас зразумець так, як разумелі стагодзьдзямі нашыя слаўныя продкі, што няма большай каштоўнасьці, як свая вольная і незалежная дзяржава, большага дару, як свой уласны дом.

І, як Натальля Арсеньнева, буду прасіць Бога Ўсёмагутнага, каб рассыпаў над нашай Бацькаўшчынай праменьні Сваё хвалы.

Запрашаю ўсіх Вас далучыцца да мае малітвы.

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла**

## Папа заклікаў да міру

**«Зашмат крыві праліваецца на Зямлі», — падкрэсьліў папа Ян Павал II у казані ў ноч Божага Нараджэньня ў саборы Сьв.Пятра ў Ватыкане.** Папа заклікаў, каб зьзяньне Божага Нараджэньня «асьвяціла ноч сьвету», каб людзі дзякуючы дару Ўцелаўленьня Ісуса маглі «штораз лепш разумець, як дорага каштуе жыцьцё кожнае чалавечае істоты».

## Навагодняя ялінка на гародзе

**Упершыню сёлета ў Менску можна набыць шматразовыя навагоднія ялінкі.** Жывыя блакітныя елкі ў кадушках зь зямлёй пасьля навагодніх сьвятаў можна высадзіць у сябе на лецішчы ці вярнуць Менскаму зелянгасу. Каштуюць яны ў дзесяць разоў даражэй за аднаразовыя. Калі вяртаеш елку, атрымліваеш зьніжку на наступны год, але ня грошы. Жывыя елкі застаюцца самымі таннымі, таму пасьля 13 студзеня яны зноў будуць валяцца ў сьмецьцевых кантэйнэрах ля пад'ездаў. Жывая елка каштуе ад 7 да 12 тысяч, а штучная — ад 50 да 230 тысяч у залежнасьці ад вышыні. Польскія штучныя елкі здалёк не адрозьніш ад натуральных, толькі што ня пахнуць. Акрамя таго, можна выбраць сасну альбо піхту. Зьявіліся ў гандлі й падвесныя елачкі, таксама ад 50 тысяч.

У апошнія гады ў Беларусі скарацілася колькасьць аматараў жывых елак. У краіне вырошчвае цца каля 800 тыс. калядных дрэваў, а патрэба насельніцтва ў іх складае каля 300 тыс. Рэшта будзе экспартавацца. З 20 сьнежня міліцыя вылоўлівае елчыных рабаўнікоў на вялікіх аўтамагістралях.

**ВДз**

АД РЭДАКЦЫІ

# Дэмакратыя і прыбіральні

Перш чым адказаць на пытаньне «Ці так я жыву?», чалавек мусіць адказаць на пытаньне «Хто я?». Калі ж зьвяртацца з заклікамі аб дэмакратыі да ўсё яшчэ савецкага па духу чалавека, яны будуць падаць на камень. Яму такія заклікі па прыродзе чужыя. А вось калі абудзіць у гэтым чалавеку беларуса, расейца ці габрэя, ён на такі покліч адгукнецца. Пытаньне толькі ў тым, як яго абудзіць.

Дарэчы, а што такое дэмакратыя? Гэта адзін з сучасных цывілізаваных стандартаў жыцьця грамадзтва. Можна сказаць, што ў Беларусі настолькі ж менеей дэмакратыі, наколькі менеей і чысьціні ў грамадзкіх прыбіральнях. Тым больш што сёньня (глябалізацыя) усё гэта ідзе ў адным пакеце — цывілізацыі. Так што ўзровень дэмакратыі — гэта ўзровень санітарыі. Слушна сказаў Яўлінскі: за нас будуць галасаваць тады, калі ў кватэрах будзе гарачая вада. З гэткага гледзішча Лукашэнка таксама — «пакетны» прэзыдэнт. А можна сказаць і так: дэмакратыі ў Беларусі меней, чым ва Ўкраіне ці Літве, настолькі ж, наколькі меней нацыянальнага пачуцьця. Ізноў жа — «пакетам».

Гэткія думкі абудзіў артыкул, якім адгукнулася на нумар 46 «НН» газэта «Народная воля». Той нумар быў прысьвечаны вынікам выбараў у Расеі ў кантэксьце беларуска-расейскіх адносінаў, а таксама магчымым уплывам гэтага кантэксту на ўнутрыпалітычныя працэсы ў Беларусі. Аўтар водгуку Сямён Букчын пабачыў у гэтым сыгналы ўладам. Ён дакарае: «Наша Ніва» дае «ўказаньні» і нават «карт-бляншь» Лукашэнку. Сапраўдны кашмар русафіла. Але не захапляйцеся тым, якую важную газэту вы трымаеце ў руках, дарагі чытач. Па-першае, С.Букчын іранізуе. Па-другое ж, публіцыст «Народнай волі» толькі піша «Наша Ніва», а мае на ўвазе нешта шырэйшае — «национально ориентированные круги» ў значэньні «все эти спадары». Гэта значыць — вы, чытач, але не зусім вы і ня толькі вы.

Не было дэмакратыі і кампрамісу ў Беларусі, няма і ня будзе, цьвердзіць С.Букчын. Калі ў Польшчы сталася інакш, «дык то ж у Польшчы!» — прымярае ён сьвітку Аліндаркі.

Ягонае права так лічыць, што «кепска будзе». Але можна бачыць сытуацыю і інакш.

Лукашэнкаўская рэспубліка на доўгім схіле, які вядзе ўніз. Яе час мінае. Надыдзе чарговы момант перавярнуцца пескавому гадзіньніку гісторыі, чарговы 1991-ы ці 1994-ы год, грамадзтва зробіць сьвядомы выбар сваёй будучыні ў рамках аб'ектыўных магчымасьцяў. Напрыклад, канец Лукашэнкі можа прыкра стаць і канцом беларускае незалежнасьці. Або іншы працяг лукашэнкаўскае рэспублікі: Лукашэнка сыходзіць, лукашэнкаўцы застаюцца. Як засталіся туджманаўцы пасьля сыходу Туджмана. Варыянтаў — сьвет.

Слабасьць пазыцыі публіцыста «Народнай волі» ў тым, што яна выключае любое пазытыўнае разьвіцьцё беларускай story. Маўляў, фішкі «ўжо даўно ў адной кішэні».

С.Букчын ня верыць у магчымасьць унутрыпалітычнага кампрамісу і канкурэнцыі на адным полі. Ён ня верыць і ў «рэвалюцыю выбарчых скрыняў», і тым больш — у імпарт дэмакратыі з Расеі ці добраахвотнае адрачэньне «ўсясільнага прэзыдэнта» ад пасады з далейшым рачкаваньнем у Каносу беларускай дэмакратыі.

Калі ня верыш у магчымасьць сьвядомага і адказнага выбару грамадзянаў, тады можна бясконца клеймаваць грамадзянаў несьвядомых, безадказных, ці, як выказваецца С.Букчын, тых, чыё месца «каля парашы» (гэта таксама адзін з магчымых узроўняў туалетнае цывілізацыі). Асабліва калі дыскутаваць ня толькі з напісаным чорным па белым у іхнай вузка арыентаванай газэце, а яшчэ крышку — і з запаветнымі марамі яе аўтараў. Аднак калі б усе разважалі, як С.Букчын, Кадафі ніколі не адрокся б атамнай зброі, а Літва не была б дэмакратычнай незалежнай дзяржавай.

Улюбёны жупел Сямёна Букчына — «нацыянальная абмежаванасьць» нацыянальнага руху. Аўтар нядаўна перавыдадзенай кнігі «Народ, издревле нам родной», С.Букчын абвінавачвае гэты рух і ў антырасейскасьці. Пад апошнюю ён падвёрстае і антырусіфікатарства, і нежаданьне браць Расею за ўзор. Тым самым ён ажыцьцяўляе падмену паняцьцяў. Антырусіфікатарская і антырасейская пазыцыі — розныя, нават процілеглыя рэчы. Мы сьцьвярджаем сваю культуру, акцэптуем культуру расейскую, але мы супраць аднаўленьня любых сувязяў нераўнапраўнага характару і супраць наських русіфікатараў. А ў С.Букчына выходзіць, як у Лукашэнкі пра «супэрнацыяналіста Шушкевіча», у якога «расейцы сядзелі на чамаданах». С.Букчын размахвае такім самым жупелам, што і Лукашэнка. Натуральна, для падмацаваньня хісткіх гіпотэзаў Букчыну прыходзіцца зьвяртацца да тых самых шарлатанскіх псэўдагістарычных аргумэнтаў з Лукашэнкавага партфэлю 8-гадовай даўніны. (Як і зьбівацца на Лукашэнкаву тэрміналёгію кштальту «национально ориентированных спадароў».)

Калі глядзець на Беларусь як на паўнавартасную краіну, на беларускую палітыку — як на паўнавартасную палітыку, на беларускі народ — як на паўнавартасны народ, а на беларускі нацыянальны рух — як на звычайны і нармальны, такі ж людзкі, як і ўсе астатнія нацыянальныя рухі, а не «нацыянальна абмежаваны і нацыянальна арыентаваны», тады — тут мы чапляем іншую цытату, падвярстаную «Народнай воляй», — становіцца зразумелы і абсурд сытуацыі, калі *крытыкуе антыбеларускасьць* уладаў той, хто сам займаецца русіфікатарствам. Толькі — у апазыцыйным стане. Нібы апазыцыйнасьць — гэта індульгенцыя за несправядлівасьць. Абсурд з роду тых жа абсурдаў, што і крытыка парушэньня правоў чалавека ў Амэрыцы вуснамі БТ.

Аднак паралелі, праведзеныя С.Букчыным, яшчэ і алягічныя. Мы жывём не ў БССР, захопленай немцамі ці саветамі. Мы жывём не пад акупацыяй, а ў незалежнай Беларусі, якой мы — сьведамыя грамадзяне. Мы нясём адказнасьць за будучыню краіны. Таму мы проста па лёгіцы (пастаўце на наша месца ўкраінца або расейца) супраць таго, каб нас ставілі з ног на галаву і патрабавалі лаяць сваю краіну, яе незалежнасьць, казаць, што мы проці іншых нейкія недаробкі, і чакаць немавед чаго.

Урэшце гэта наша жыцьцё, наша грамадзянская адказнасьць, нашы дзеці. Мы не жадаем жыць ня тут і цяпер, а ў нечых там праектах.

Аналітык запаветных мараў беларуса, сп.Букчын не аспрэчыў галоўнага, замаўчаў яго. Што мы мелі на ўвазе, закідаючы думку пра магчымасьць тлустае рысы, непаўтарэньня 90-х, змаганьня на адным полі? Што якраз хуткі рост здаровага нацыянальнага пачуцьця ў Беларусі, які мы назіраем цяпер, урэшце дасьць і шанец на дэмакратызацыю, так бы мовіць, «у пакеце».

Добра вам адсьвяткаваць і ўдалага году, дарагія чытачы. «НН» абяцае і ў 2004 годзе трымацца незалежнасьці і аб'ектыўнасьці. Мы імкнёмся кіравацца нацыянальнымі інтарэсамі Беларусі, якія б тэмы ні асьвятлялі.

# Мы нацыя патрыётаў

## і апантаных нацыянальнай ідэяй лібэралаў

На выхадзе з 2003 г., году актыўнае распрацоўкі і масавае прапаганды малапрывабнае дзяржаўнае ідэалёгіі, «НН» вырашыла даведацца, якім жа ідэям сымпатызуюць суграмадзяне. На замову «НН» сацыялягічная служба «Люстра» інфармацыйнай кампаніі БелаПАН правяла зандаж грамадзкае думкі. Апытаньне прайшло 9—12 сьнежня ў Менску. Апытана 500 чалавек ад 18 гадоў і старэйшых*.

**Якая зь ніжэй пералічаных ідэалёгіяў Вам падабаецца?**

| | Падабаецца | Не падабаецца | Цяжка адказаць |
|---|---|---|---|
| Анархізм | 4 | 74 | 22 |
| Беларуская нацыянальная ідэя | 35 | 29 | 36 |
| Беларускі нацыяналізм | 14 | 51 | 35 |
| Камунізм | 10 | 68 | 22 |
| Кансэрватызм | 8 | 54 | 38 |
| Лібэралізм | 34 | 32 | 34 |
| Патрыятызм | 68 | 12 | 20 |
| Сацыялізм | 33 | 35 | 22 |
| Расейскі нацыяналізм | 3 | 66 | 31 |
| Хрысьціянская ідэалёгія | 33 | 29 | 38 |
| Фашызм | 1 | 88 | 11 |

Што ж падабаецца? Найперш патрыятызм, які ўласна ідэалёгіяй ня ёсьць, а проста слова харошае. На наступным месцы — сарамяжлівы эўфэмізм беларускага нацыяналізму, «беларуская нацыянальная ідэя». Яго прапагандуюць і прафэсар Лыч, і былы (?) маёр (?) Праляскоўскі, але кожны ўяўляе па-свойму. Грамадзтва сымпатызуе таксама хрысьціянскім каштоўнасьцям, але, не без здумленьня адзначым, падзяляюць іх далёка ня ўсе. Беларускае, прынамсі ўсходнебеларускае грамадзтва застаецца вельмі сьвецкім. Нарэшце, лібэралізм. Апошняе супярэчыць ацэнкам, зробленым Лукашэнкам у яго ным лёсаносным сакавіцкім дакладзе. Няхай сабе гэта й вынікі з самага капіталістычнага гораду краіны, дзе большасьць вымушаная пакладацца толькі на свае сілы, каб выжыць ды яшчэ й сплаціць стотысячныя жыроўкі.

Сацыялізм згубіў сваю прыцягальнасьць. Па меры росту несацыялістычнага дабрабыту гэта, трэба думаць, толькі ўзмоцніцца. Знаходзяцца рэдкія аматары фашызму, расейскага нацыяналізму і анархізму.

Самым жа парадаксальным вынікам у горадзе, дзе дзьве трэція вуліцаў па-ранейшаму называюцца імёнамі правадыроў камуністычнае эпохі і дзе гарадзкія чыны паклапаціліся сёлета перайменаваць мэтро «Плошча Незалежнасьці» ў «Плошчу Леніна», стала поўная (10:68) антыпатыя да камунізму. У галовах гэтае вучэньне даўно памерла. Значыць, грамадзтва гатовае і да дэкамунізацыі гарадзкога асяродзьдзя.

**Мікола Бугай**

* Выбарка квотная. Кантраляваныя парамэтры: пол, узрост, адукацыя. Памылка выбаркі ня большая за 1%.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Камунізм падабаецца толькі 10-ці адсоткам насельніцтва**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Сухая рэшта

Ці памятаеце вы, які ў нас сёлета быў год? Правільна — год навядзеньня парадку на зямлі. Амэрыканскія войскі навялі парадак у Іраку, ачысьціўшы Багдад ды іншыя гарады ад помнікаў Садаму Хусэйну, а потым і захапіўшы сам арыгінал. Ірацкія ж фэдаіны працягваюць прарэджваць шэрагі амэрыканскіх вайскоўцаў ды акучваць офісы ААН і іншых міжнародных арганізацыяў. У адной суседняй зь Беларусяй невялікай дзяржаве прэзыдэнт быў заўважаны ў «беспарадачных» сувязях, і навядзеньнем парадку ў сфэры нацыянальнае бясьпекі занялася бесстароньняя дэпутацкая камісія. У іншай, вялікай суседняй дзяржаве, увесь год займаліся навядзеньнем канстытуцыйнага парадку ў Чачэніі, а таксама ўпарадкаваньнем партыяў і асобных палітыкаў.

У Беларусі пазытыўныя зьмены яшчэ больш відавочныя. Плошча Перамогі ў Менску, у народзе — Круглая, у выніку рамонту зрабілася яшчэ больш круглай ды гладкай і цяпер можа служыць хоць пляцоўкай для спаборніцтваў у шорт-трэку. Без усялякае іроніі, праспэкты Скарыны і Машэрава сапраўды цяпер больш прыстасаваныя для адносна хуткага і бясьпечнага аўтамабільнага руху ў сталіцы. Што тычыцца астатніх вуліцаў — дык і Масква ж не адразу будавалася. Дарэчы, у тэмпах будаўніцтва сучасны Менск можа даць сто пунктаў наперад ня толькі лужкоўскай Маскве, але й зуокасаўскай Вільні (Зуокас — цяперашні мэр Вільні. — **Заўвага рэд.**)

Тэрміны, у якія ўклалася адбудова менскай ратушы, можна лічыць рэкорднымі для такога будаўніцтва. Узьвядзеньне піраміды Нацыянальнае бібліятэкі таксама зойме меней часу, чым узьвядзеньне пірамідаў у старажытным Эгіпце. А ў блізкай будучыні нас чакае будаўніцтва новай тэлевежы — чацьвертай у сьвеце паводле вышыні. Пра зьяўленьне новых гандлёвых комплексаў і шматпавярховых аўтастаянак можна й не казаць — і без таго ясна, што краіна перажывае будаўнічы бум.

Тут напрошваюцца пэўныя аналёгіі. Ня столькі зь Нямеччынай, дзе пры Гітлеру ўсенародна будавалі высакаякасныя аўтабаны як стратэгічныя аб’екты, колькі з Італіяй. Італія ў XX ст. ажно двойчы перажыла будаўнічы бум. Спачатку пры Мусаліні пачалі будаваць палацы ў стылі позьняй рымскай імпэрыі. Потым, у 60-я, паўсюдна сталі ўзьнікаць жалезабэтонныя жылыя дамы, як тыя хрушчоўкі ў СССР. Хутка многія з тых дамоў пачалі развальвацца, бо былі пабудаваныя фірмамі, зьвязанымі з мафіяй, літаральна на пяску — замест скрадзенага цэмэнту.

Я хачу сказаць пра будынак зусім несучасны і зусім непрывабны з выгляду, хоць і зь сьлядамі канструктывізму 20-х у архітэктуры. У будынку месьціцца адна з найстарэйшых менскіх больніцаў. Цягам апошніх тыдняў мне давялося наведваць яе штодня — сваяк па няшчасьці туды трапіў. За тыя некалькіх тыдняў мой сваяк прыйшоў да высновы, што больніца гэтая ёсьць ідэальнай мадэльлю сацыялістычнага грамадзтва, аб якой настальгуе і аб якой марыць пераважная колькасьць беларускага насельніцтва. Тут бясплатна кормяць, прычым тры разы на дзень. І хаця ежа пакідае жадаць нашмат лепшага, чэргі хворых зь місамі й лыжкамі выстройваюцца ў сталовую нязьменна. У больніцы бясплатна лякуюць, таму чэргі на ўколы выстройваюцца гэтаксама, як у сталоўку ці ў бясплатны туалет, дзе працуе адна прыбіральня з адным унітазам на ўсіх. Тут кожнага дня бывае лекарскі «абход» і «ціхі час». Твой стан здароўя і твой рэжым дня кантралююць, а гэта азначае, што пра цябе дбаюць.

> Ці памятаеце вы, які ў нас сёлета быў год? Правільна — год навядзеньня парадку на зямлі.

Параўнаньне шпітальнага ладу жыцьця зь цяперашнім беларускім рэжымам напрошваецца. Але меней за ўсё хацелася б гаварыць пра «хворы народ». Папросту тэма больніцы міжволі прыводзіць нас да галоўнае тэмы жыцьця кожнага чалавека — тэмы сьмерці. Кожны з нас сёлета працягваў складаць свой уласны мартыралёг — сьпіс непапраўных стратаў і разьвітаньняў. Але была адна страта, якая ненадоўга аб’яднала ўсіх. Гэта сьмерць Быкава. У тае колькасьці зусім розных людзей, якія прыйшлі правесьці яго ў апошні шлях, ёсьць і надзея. Той самы пазытыў, які застаецца пасьля заканчэньня зямнога шляху чалавека ў выглядзе «сухой рэшты». Быкаву цяпер ужо ня быць нобэлеўскім ляўрэатам. Але хто ў Беларусі, акрамя адмыслоўцаў, адразу, «на ўзьлёт» назаве імя сёлетняга ляўрэата Нобэлеўскае прэміі па літаратуры? Калі б нават спраўдзілася мара тых, хто лічыў, што нобэлеўскі камітэт даўно абавязаны быў уганараваць пісьменьніка, — хіба гэта зьмяніла б нешта ў нашым стаўленьні да Быкава і да Беларусі?

Чым яшчэ, акрамя ўсенароднага пахаваньня, запомніцца 2003 год беларусам? Стварэньнем БРСМ? Выхадам беларускай моладзевай зборнай у фінал чэмпіянату Эўропы па футболе? Падвышэньнем кватрплаты да 40 даляраў за месяц? Сваркамі прэзыдэнтаў Беларусі й Расеі? Ці арыштам Садама, якога яшчэ на пачатку году Аляксандар Лукашэнка чакаў у госьці?

У апошняй падзеі ёсьць пазытыўны момант. Але для мяне асабіста гэты эпізод ня зьвязаны наўпрост з палітыкай. Тое, што ўсёмагутны ўладар, за якога на выбарах галасуюць сто адсоткаў, празь некаторы час вымушаны хавацца ад усіх у яме з павукамі, прымушае задумацца над хуткаплыннасьцю жыцьця. І над пераменлівасьцю лёсу. Лёс у мінулым годзе ня быў занадта прыхільны да Беларусі. Але ж і асаблівых катаклізмаў, дзякаваць Богу, ня здарылася. Яшчэ год можна было спакойна паразважаць, упарадкаваць жыцьцё, навесьці парадак у доме. Выкрасьліць гэты год з жыцьця, як бы каму ні хацелася, немагчыма. Таксама, як нікому шчэ не ўдавалася пачаць новы год з чыстага ліста.

**Віталь Тарас**

# Адстаўкі Шэймана

## патрабуе Эўропа


PHOTO.BYMEDIA.NET

Дакладчык Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы Хрыстас Пургурыдэс абнародаваў сваю справаздачу ў справе зьніклых палітыкаў. Ён вывучыў абставіны гэтае справы і прыйшоў да высновы: незалежнага расьсьледаваньня зьнікненьняў у Беларусі не было. Пургурыдэс заклікае Раду Эўропы дабіцца ад беларускіх уладаў незалежнага расьсьледаваньня справы. Галоўная ўмова такога расьсьледаваньня, на думку дакладчыка, — адстаўка Шэймана. Беларускія ўлады адмоўчваюцца.

Дэпутат ПАРЭ Хрыстас Пургурыдэс быў прызначаны дакладчыкам у справе зьнікненьняў у чэрвені 2002 г. Справа для цяперашняй Эўропы беспрэцэдэнтная. Такога не было ў іншых краінах, каб адзін за адным зьнікалі самыя яркія лідэры апазыцыі. І як у ваду. Білі трывогу праваабаронцы, беларуская непарлямэнцкая апазыцыя, урэшце, група «Рэспубліка». Паколькі палата прадстаўнікоў прабіваецца ў Раду Эўропы, ПАРЭ вырашыла стварыць падкамітэт па расьсьледаваньні беларускіх зьнікненьняў, каб магчы ацаніць дэмакратычнасьць краіны.

У Беларусі Х.Пургурыдэс упершыню пабываў на пачатку лістапада 2003 г., другі раз — у сьнежні. Вынікам стаўся папярэдні мэмарандум «Зьніклыя асобы ў Беларусі». Аўтар прааналізаваў абнародаваныя дакумэнты, сустрэўся з сваякамі, сьведкамі, у тым ліку высокімі дзяржаўнымі службоўцамі. Пасьля размоваў з генпракурорам Шэйманам, міністрамі Сіваковым і Навумавым Пургурыдэс зрабіў выснову, што яны «дамовіліся пра супольную пазыцыю загадзя». Але ў іх тлумачэньнях ён пабачыў шэраг супярэчнасьцяў. Сівакоў гаварыў, што адночасова дні выдачы расстрэльнага пісталета і зьнікненьня апазыцыянэраў — «чыстае супадзеньне». Калі прычыну першай выдачы пісталета ён неяк патлумачыў, дык пра другую «не памятаў». «Можна знайсьці пісьмовыя дакумэнты пра выпрабаваньне пісталета — калі іх пашукаць», — сказаў генэрал, але не парадзіў, дзе шукаць.

### Вялікія гуманісты

З Шэйманам Пургурыдэс гаварыў пра запіску генэрала міліцыі Лапаціка. У ёй паведамлялася, што забойства Юр’я Захаранкі сплянаваў уласна Шэйман, а выканаў Паўлічэнка. Улады Беларусі цьвердзілі, што запіска фальшывая, але перад пагрозай графалягічнае экспэртызы пацьвердзілі сапраўднасьць дакумэнту. Праўда, зазначылі, што «высновы сп.Лапаціка былі папросту памылковымі» і што ёсьць іншыя «вэрсіі» гэтай запіскі. Але іх Пургурыдэсу не паказалі. На пытаньне, ці быў, у такім разе, Лапацік пакараны за паклёп, Навумаў з Шэйманам адказалі, што генэрал захварэў і з ім не разьбіраліся «з гуманітарных прычынаў». Ні ў якай іншай краіне «гуманітарныя прычыны» не спынілі б расьсьледаваньня паклёпу генэрала на кіраўніцтва дзяржавы — дзівіцца Пургурыдэс. «Улады ясна аддалі перавагу пазьбяганьню публічнага суду, дзе былі б узятыя сьведчаньні й заслуханыя сьведкі», — піша ён.

### Прэзыдэнт незадаволены зьместам

Пургурыдэс падазрае генпракурора Шэймана і ў скажэньні фактаў. Той у лістападзе 2002 г. назваў дэпутату палаты прадстаўнікоў Фралову адны прычыны затрыманьня Паўлічэнкі, а ў ордэры на арышт, падпісаным былым кіраўніком КДБ Мацкевічам, яны былі зусім іншыя. Але найбольш зьдзівіў кіпрыёта намесьнік старшыні палаты прадстаўнікоў Канаплёў. У таго падчас «закрытай сустрэчы» вырвалася, што «беларускаму боку ўдалося забясьпечыць сябе копіяй першага праекту гэтага мэмарандуму». Лукашэнка прачытаў яго і застаўся «незадаволены зьместам». Пургурыдэс мяркуе, што прычынай уцечкі інфармацыі стала праслухоўваньне яго тэлефону.

Пургурыдэс просіць даць адказ на сваю справаздачу да 10 студзеня 2004 г.

### Аповед Забалоцкага

Тым часам 18 сьнежня расейская «Новая газета» надрукавала аповед нейкага Віктара Забалоцкага, які нібыта быў сьведкам расстрэлу Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. Яго маналёг, на аснове відэазапісу, падрыхтавала да друку Ірына Халіп.

Забалоцкі сьцьвярджае, што ў кастрычніку 1999 г. ён выпадкова стаў сьведкам расстрэлу на Паўночных могілках Менску. Людзі перад сьмерцю крычалі: «Я — Ганчар! Я — Красоўскі!» Сьведка быццам бы ўцёк у Расею, хаваўся ў манастыры, а пасьля зрабіў гэты запіс. Аднак ягоныя сьведчаньні і нават біяграфія выклікаюць шмат сумневаў.

Калісьці ён лічыўся асобай «псыхічна неўраўнаважанай», называў сябе праваабаронцам, быў беспрацоўным, у чэрвені 1998-га адзін ладзіў акцыю пратэсту ля Дому ўраду. Дый нічога істотнага да ўжо вядомага сьведчаньні Забалоцкага не дадалі. Пра сакрэтныя пахаваньні на Паўночных могілках гавораць ад прэзыдэнцкіх выбараў’2001. Шматлікія ўдзельнікі абмеркаваньня гэтай публікацыі на сайце «Хартыі’97» схіляюцца да думкі, што зьяўленьне гэтага відэазапісу менавіта цяпер можа быць правакацыяй нейкіх спэцслужбаў.

Мэта — адцягнуць увагу ад сапраўды сур’ёзнага працэсу, які можа быць ініцыяваны эўраструктурамі. Зь іншага боку, гэты тэкст нібыта зьмяншае віну ў справе зьніклых некаторых высокіх дзяржаўных чыноўнікаў, перакладаючы яе на асобу самую высокую. Бо таму ж міністру спорту і турызму Сівакову ўлетку 2004 г. давядзецца ехаць на чале беларускай дэлегацыі на Алімпійскія гульні. А ня хочацца паўтарыць лёс Паўла Барадзіна.

Справа зьніклых палітыкаў застаецца ключом і да нармалізацыі адносінаў з цывілізаваным сьветам, і да любых пераменаў унутры краіны. Пакуль ня будзе пастаўленая кропка ў справе палітычных забойстваў, ніякія геапалітычныя расклады ня зьменяць сёньняшняга стаўленьня Захаду да беларускае ўлады.

## Рэкамэндацыі Пургурыдэса

### Лукашэнку

**1. Зладзіць незалежнае расьсьледаваньне справы зьніклых палітыкаў пасьля адстаўкі генэральнага пракурора Шэймана.**

**2. Распачаць крымінальную справу з мэтай высьветліць, ці датычныя да зьнікненьняў генпракурор Шэйман, цяперашні міністар спорту Сівакоў і афіцэр Паўлічэнка. Высьветліць, ці вінаватыя іншыя высокапастаўленыя чыноўнікі ў хаваньні інфармацыі пра сапраўдных злачынцаў.**

### Нацыянальнаму сходу

**1. Спрыяць правядзеньню незалежнага расьсьледаваньня і ажыцьцяўленьню правасудзьдзя, стварыць парлямэнцкую камісію ў гэтай справе, надзяліўшы яе адпаведнымі паўнамоцтвамі.**

### Радзе Эўропы

**1. Ажыцьцяўляць максымальны палітычны ціск на кіраўніцтва Беларусі, у тым ліку праз санкцыі, пакуль ня будзе праведзенае вартае даверу незалежнае расьсьледаваньне мажлівай датычнасьці высокапастаўленых чыноўнікаў да зьнікненьняў.**

**2. Запрасіць суды краінаў, законы якіх прадугледжваюць міжнародную юрысдыкцыю іх нацыянальных судоў на справы сур’ёзных парушэньняў правоў чалавека, распачаць працэдуры супраць высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў за мажлівае забойства аднаго ці большай колькасьці людзей зь ліку Захаранкі, Ганчара, Красоўскага і Завадзкага.**

# Сяргей Кавалёў: Такія сьведкаў не пакідаюць



На пытаньні карэспандэнта «НН» адказвае расейскі праваабаронца, пакуль яшчэ дзейны старшыня адмысловага падкамітэту Парлямэнцкай Асамблеі Рады Эўропы па расьсьледаваньні зьнікненьняў у Беларусі Сяргей Кавалёў.

**«НН»: Вы верыце, што сёньняшнія беларускія ўлады могуць урэшце арганізаваць незалежнае і аб’ектыўнае расьсьледаваньне?**

**С.К.:** Што яны, дурні? Я бачу такое расьсьледаваньне толькі ў далёкай пэрспэктыве. Спадзяюся, што тады на трыбунале ў Гаазе будуць прысутнічаць ня толькі былыя прэзыдэнты, як цяпер Мілошавіч, але і прэзыдэнты дзейныя...

**«НН»: Якія дакумэнты і сьведчаньні па справе зьніклых зрабілі на Вас найбольшае ўражаньне?**

**С.К.:** Пастанова сьледчага Чумачэнкі, які не жадае хаваць усе дзіўныя павароты справы і піша пра іх адкрыта. Уразіла мяне і тлумачэньне Алкаева, чаму ў справе зьнікненьняў фігуруе расстрэльны пісталет. Гэта давала выканаўцу ўпэўненасьць, што ён не забойца, а выконвае прысуд, што ён пры выкананьні абавязкаў, якія на яго ўсклала Радзіма.

**«НН»: «Новая газета» піша, нібыта знайшоўся сьведка забойства Ганчара і Красоўскага...**

**С.К.:** Тыя, хто ідзе на такія справы, сьведкаў не пакідаюць!.. Я ня бачыў гэтага Забалоцкага, але мае знаёмыя, што зь ім сутыкаліся, кажуць пра яго неадэкватныя паводзіны.

**«НН»: У Беларусі пагаворваюць, што дакумэнты час ад часу ўкідваюцца ў прэсу з маскоўскіх крыніцаў.**

**С.К.:** Цяжка паверыць. Адкуль яны могуць зьявіцца ў Маскве? Вось калі гаварыць пра ідэнтыфікацыю «расстрэльнага» пісталету, дык у маскоўскіх архівах з савецкіх часоў павінны захоўвацца дакумэнты зь яго характарыстыкамі. Раней жа ўсё было цэнтралізавана. Але гэта цяпер не актуальна, бо няма чаго дасьледаваць: трупаў няма.

**Падрыхтаваў Алег Тачоны**

# БНФ зьмяняецца — Вячорка застаецца

**Абсалютная большасьць дэлегатаў зьезду БНФ падтрымала Вячорку і ўдзел у «Народнай кааліцыі 5+». Апанэнты выступалі за адмову ад хаўрусу зь лібэраламі й камуністамі ды гуртаваньне з нацыянальнымі сіламі.**

Зьезд БНФ адбыўся 20 сьнежня пад Менскам. Памяшканьне шукалі сьпехам, бо «Раўбічы» скасавалі папярэднюю дамову арэнды. Ахову папярэдзілі не пускаць у залю паседжаньняў чужынцаў кшталту Севярынца ды Сіўчыка, якія, на думку арганізатараў, маглі сарваць работу. У прэзыдыюме быў заўважаны нядаўна вызвалены Віктар Івашкевіч. Дэлегаты і госьці, агульнай колькасьцю пад трыста чалавек, заслухалі справаздачу старшыні і намесьнікаў. Выступалі як дэлегаты, так і госьці сходу.

Прадстаўніца АГП Людміла Гразнова ўхваліла ўдзел БНФ у стварэньні «пяцёркі». Мастак Марачкін выказаў абурэньне паводзінамі Лукашэнкі на сустрэчы з інтэлігенцыяй. Сп.Яўменаў з Асіповіч адзначыў, што цяжка растлумачыць людзям, чаму немагчымы эканамічны рост без адраджэньня Беларушчыны. Чуліся прапановы адкрыць партыйную газэту, падтрымаць (хоць маральна) дэпутатаў Фронту ў мясцовых саветах.

З трыбуны гучала й рэзкая крытыка. Амаль не праводзяцца масавыя акцыі, замест працы з насельніцтвам — размовы ў кабінэтах. Фронт рассыпаецца, губляе знакавыя фігуры і актыўную, дзейную моладзь. Слова «БНФ» незваротна забруджанае прапагандай. Трэ зьмяняць назву арганізацыі (сьмех у зале). Дасталося Вячорку за кантакты з калякінцамі, за тое, што Фронт саступае ў папулярнасьці АГП. Гучалі заклікі зьмяніць тактыку, стратэгію і кіраўніцтва. Вінцук слухаў гнеўныя тырады моўчкі, амаль не перабіваючы нават тады, калі адведзены прамоўцу час сканчаўся. Калі ж яго занадта нахвальвалі асобныя прыхільнікі, старшыня званіў у званочак. Сапраўдны палітык.

Хвалілі за тое ж, за што й лаялі: за пашырэньне міжнародных стасункаў партыі, супрацоўніцтва зь іншымі дэмсіламі, пераход ад вулічных формаў барацьбы, як малапэрспэктыўных, да спробаў стварыць сыстэмную апазыцыю. Прыхільнікі Вячоркі адзначалі, што Севярынец сам бачыў «Малады фронт» самастойнай арганізацыяй. «Давайце будзем сябрамі», — заклікалі выступоўцы. Пагадзіцца з тэзысам, што Беларусь акупаваная, што выбары трэба байкатаваць, няма ніякай магчымасьці. «Увогуле, грамадзтва нашае нармальнае. Трэба толькі пазбавіцца лукашызму», — адзначаў Вячорка.

Алесь Астроўскі з Горадні наракаў на слабы ўдзел Фронту ў курапацкай справе. Вінаваціў кіраўніцтва ў правале сьвяткаваньня 85-й гадавіны БНР, няўменьні захоўваць адзінства з ідэйна блізкімі сіламі. Галоўнае, на яго думку, не адхіленьне Лукашэнкі, а пабудова беларускай дзяржаўнасьці: «Мы павінны быць службоўцамі-прафэсіяналамі, а ня вулічнымі змагарамі. Трэба набываць веды. Грамадзтва павінна адчуць, што ёсьць альтэрнатыва ўладзе. І гэта — мы!» Адчувалася, што крытыкі Вячоркі ня маюць ідэалягічных разыходжаньняў зь ім, але не ўхваляюць ягонае практыкі кіраваньня і сумняюцца ў ягоным лідэрскім патэнцыяле. Іхным прапановам не ставала канкрэтыкі. «Перайсьці да дзеяньняў па дэлегітымізацыі рэжыму», — прапаноўваў Анатоль Фёдараў. Але якіх? «Яднацца з патрыятычнымі сіламі». Але зь якімі, калі большасьць зь іх пабудавана на прынцыпе правадырызму? Хоць незадаволенасьць і боль, што гучалі ў іхных выступах, больш чым зразумелыя.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Вызвалены з «хіміі» Віктар Івашкевіч, Галіна Сямдзянава і Вінцук Вячорка ў прэзыдыюме зьезду Партыі БНФ, што прайшоў у матэлі ў Менскім раёне**

Пасьля гарачых дыскусій 151 дэлегат з 221 ацанілі дзейнасьць кіраўніцтва як здавальняючую. На пасаду старшыні партыі былі вылучаныя Алесь Астроўскі, Анатоль Фёдараў, які вінаваціў кіраўніцтва Фронту ў партыйных чыстках, Алесь Міхалевіч і Вінцук Вячорка. Фёдараў сваю кандыдатуру зьняў на карысьць Астроўскага. «Астроўскі разумны, адукаваны чалавек, але ж як ён будзе кіраваць з Горадні», — разважалі ў калідорах. Міхалевіч адмовіўся на карысьць Вячоркі. За Вячорку прагаласавалі 149 дэлегатаў, Астроўскі здабыў падтрымку 55 чалавек.

Старшыня прапанаваў кандыдатуры намесьнікаў. Хтосьці прапанаваў Астроўскага, але, згодна з рэглямэнтам, намесьнікам ня можа стаць чалавек, які балятаваўся на пасаду старшыні. У Фронце павінна быць строгая падпарадкаванасьць. Гэта вам не лібэральная АГП. Намесьнікамі абралі Віктара Івашкевіча, Юр'я Хадыку, Аляксея Янукевіча і Алеся Міхалевіча.

У рэзалюцыі зьезду патрабуецца спыніць прыніжэньне беларусаў «ва ўгоду палітыканскім задумам А.Лукашэнкі», заяўляецца, што нельга называць «выбарамі» спэктакль, які ладзіцца рэжымам, але ж вітаецца ўдзел у кампаніі з мэтай рэклямы ідэй партыі і руху ў грамадзтве. Рэзалюцыя зьмяшчае заклік да міжнароднай супольнасьці ажыцьцяўляць перадвыбарчы маніторынг у краіне. Будучыня Беларусі — у супольнасьці свабодных народаў Эўропы. Зьезд вітае стварэньне «Народнай кааліцыі 5+», заснаванай на прынцыпах дэмакратызацыі, сфармуляваных АБСЭ. Гэта спыненьне палітрэпрэсіяў, свабода СМІ, празрыстыя, роўныя і справядлівыя выбары, падзел уладаў. І, канечне, захаваньне незалежнасьці Беларусі.

Нельга не адзначыць сьмеласьці, зь якой Вячорка прывёў у кіраўніцтва партыі моладзь — Янукевіча й Міхалевіча. Гэта вястуе непазьбежную калісьці зьмену пакаленьняў.

**Яўген Лагоўскі**

# Што варта есьці

**Навагрудзкія сыры, пастаўская сьмятана, баранавіцкія кілбасы, койданаўскія куры, браслаўскія кансэрвы, гарадзенскія паштэты, салігорскае малако зь ёдам, цукеркі ад «Камунаркі» — няпоўны пералік найлепшых прадуктаў году**

Вызначалі іх на конкурсе «Найлепшая прадукцыя году. Прадукты харчаваньня», які ладзілі ТАА «Экабрэйн», Беларускае таварыства абароны спажыўцоў і БелНДІ харчовых прадуктаў. Канкурсанты прайшлі мікрабіялягічны тэст і тры ўзроўні дэгустацыі: экспэртамі-дэгустатарамі, журналістамі й прадстаўнікамі грамадзкасьці. Удзел у конкурсе маглі браць прадукты, якія маюць усю неабходную дакумэнтацыю і карэктную маркіроўку тавару. На перамогу ўплывала ня толькі якасьць, але і пазнавальнасьць, «раскручанасьць» гандлёвай маркі.

Прадуктамі году сталі шакалядка «Чырвоны каптурок» ад «Камунаркі», цукеркі «Птушынае малако» і «Аэрафлёцкія» ад «Спартака», бела-ружовы зэфір і мармэляд «Апэльсынавыя і лімонныя долькі» нараўлянскага «Чырвонага мазыраніна».



PHOTO.BYMEDIA.NET

Найлепшыя рыбныя кансэрвы вырабляюць на Браслаўскім і Нарачанскім харчовых камбінатах. Нездарма абодва прыбрала да рук Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта.

Найлепшыя кураняты, курыныя паштэты і руляды вырабляе Койданаўская птушкафабрыка, найлепшыя мясныя кансэрвы — Баранавіцкі і Бярозаўскі мясакансэрвавыя камбінаты. Дыплёмы конкурсу атрымалі таксама Менскі, Гарадзенскі, Слонімскі, Барысаўскі і Жлобінскі мясакамбінаты. Былі адзначаныя і паштэты сумеснага беларуска-польскага прадпрыемства «Гродфуд» ды сардэлькі УП «Лімонія».

Найлепшымі малочнымі прадуктамі былі прызнаныя салігорскае пастэрызаванае малако, узбагачанае ёдаваным бялком, а таксама пастэрызаванае малако з лактулёзай «Божая кароўка», грэйпфрутавы напой на аснове сыроваткі «Біярытм», ёгурт «Разыначка» (менскага ААТ «МЛІТЭПС»). Адзначана дыплёмамі прадукцыя Навагрудзкага масларобчага камбінату, Слуцкай сыраварні (на здымку), Гарадзенскага малочнага, Клецкага масларобчага, Пастаўскага і Ляхавіцкага малаказаводаў, Лідзкага малочна-кансэрвавага і Ваўкавыскага ААТ «Беллакт».

Найлепшым маслам году прызнана расьлінна-сьметанковае масла «Залацістае» ТАА «Алькатыў». Узровень халестэрыну ў ім у тры разы ніжэйшы за дапушчальную норму.

Кідаецца ў вочы тое, што большая частка з 28 вытворцаў-фіналістаў «паходзяць» з заходняй і Цэнтральнай Беларусі.

**ВДз**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

12 сьнежня актывісту незарэгістраванага «Маладога фронту» **Артуру Фінькевічу** адміністрацыйная камісія Заводзкага раёну дала 60 тыс. руб. штрафу за «распаўсюд друкаваных выданьняў, выробленых з парушэньнем усталяванага парадку». За тую самую расклейку ўлётак А.Фінькевіч ужо быў асуджаны на 15 сутак арышту. Тады яго вінавацілі за «парушэньне арганізацыі масавых мерапрыемстваў». Агулам за распаўсюд улётак «маладафронтавец» прабыў ужо 30 сутак за кратамі. 18 сьнежня, падчас расклейкі ўлётак у Менску, былі затрыманыя «зуброўцы» **Павал Юхневіч** і **Гай Маеўскі**. На П.Юхневіча склалі пратакол. 19 сьнежня ў Фрунзэнскім райаддзеле міліцыі **Аксану Новікаву** афіцыйна папярэдзілі аб магчымасьці патрапіць у жаночую калёнію: раней яна была асуджаная «за абразу гонару і годнасьці прэзыдэнта», а цяпер яе будуць судзіць за ўдзел у антырэфэрэндумнай акцыі 24 лістапада і пікет каля гарадзкога суду ў падтрымку суду прысяжных. 20 сьнежня на акцыі ў памяць «зуброўца» Андрэя Зайцава, даведзенага да самагубства, у Гомелі былі затрыманыя **Дзяніс Чыкалёў**, **Дзяніс Дашкевіч**, **Зьміцер Крывашэй**, **Алена Коўшык**. Іх адпусьцілі без складаньня пратаколу. **Сяргей Сямёнаў**, затрыманы адразу пасьля акцыі, 22 сьнежня быў асуджаны на 5 сутак за «дробнае хуліганства» і «непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўніка міліцыі». 22 сьнежня ў Віцебску, падчас збору подпісаў за скасаваньне «саюзнай дамовы», былі затрыманыя актывісты КХП-БНФ **Уладзімер Плешчанка** і **Аляксандар Салаўян**: іх абвінавацілі ў правядзеньні несанкцыяванага пікету і далі штрафу — Плешчанку 2 млн 475 тыс., Салаўяну 2 млн 640 тыс. 22 сьнежня ў Воршы на штраф у 330 тыс. руб. быў асуджаны сябра КХП-БНФ **Юрась Конышка**, які 11 студзеня ўдзельнічаў у пікеце. Раней яго асудзіць не маглі, бо Конышка быў народным засядацелем у судзе.

**АШ**

падзеі году

# Год як век,

Новы 2003 год пачынаўся новымі песьнямі: выйшаў альбом NRM «Дом культуры» з супэргітамі «Лёгкія-лёгкія» і «Маё пакаленьне».

**5 студзеня** на прэзыдэнцкіх выбарах у Літве неспадзявана перамагае Раландас Паксас. **У сьнежні** парлямэнт распачне супраць яго працэдуру імпічмэнту, пасьля таго як спэцслужбы апублікуюць інфармацыю пра ягоную сувязь з мафіяй і расейскімі спэцслужбамі.

**26 студзеня** ў маскоўскай лякарні памірае лідэр «Песьняроў» Уладзімер Мулявін.

**1 лютага** разьбіўся амэрыканскі касьмічны карабель «Калюмбія».

**20 лютага** палата прадстаўнікоў нацыянальнага сходу становіцца сябрам Пастаяннага камітэту Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ. Палата марна дамагалася гэтага статусу цягам шасьці гадоў, бо эўрапейскія структуры не прызнавалі законнасьці рэфэрэндуму 1996 г.

**27 лютага** дэпутацкая група «Рэспубліка» ладзіць круглы стол «Незалежная Беларусь яднае нас», запрашаючы на яго апанэнтаў рэжыму. Упершыню пасьля 1996 г. прадстаўнікі дэмакратычнай апазыцыі трапляюць у муры парлямэнту.

**У тым жа месяцы** выходзіць з друку кніжка туркмэнскага дыктатара «Рухнама» па-беларуску. Гэта выклікае вялікую дыскусію пра этычнасьць удзелу ў перакладзе такіх твораў.

**2 сакавіка** адбываюцца выбары ў мясцовыя органы ўлады. Выбарцы масава галасуюць «супраць усіх» — а «ўсімі» найчасьцей зьяўляецца адзін кандыдат, ад улады.

**У ноч з 5 на 6 сакавіка** ў мястэчку Магдаленка пад Варшавай польскі спэцназ штурмуе дом, дзе заселі два падазраваныя. Аднаго зь іх абвяшчаюць «былым супрацоўнікам беларускага КДБ, які знаходзіцца ў вышуку». КДБ адхрышчваецца, а польская паліцыя не дае рады ўзяць злачынцу ў палон. Падчас шматгадзіннага штурму з удзелам бранятэхнікі спэцназаўцы церпяць страты, гінуць і падазраваныя.

Ня меншую ваяўнічасьць дэманструе і афіцыйны Менск, які да апошняга актыўна супрацоўнічае з Хусэйнам. **У пачатку сакавіка** мэр Багдаду чатыры дні гасьцюе ў Менску, а сусьветная прэса абмяркоўвае Садамавы шанцы атрымаць прытулак у нашай краіне.

**20 сакавіка** пачынаецца вайна ў Іраку. Да 10 красавіка ўсё скончаецца: жаўнеры ЗША бяруць Багдад. Але партызанскія дзеяньні працягнуцца, забіраючы больш жыцьцяў амэрыканскіх жаўнераў, чым сама вайна.

**Тым часам** прэзыдэнт Беларусі абвяшчае аб неабходнасьці ўзмацненьня ідэалягічнае працы і стварэньня дзяржаўнае ідэалёгіі. Зь верасьня ва ўнівэрсытэтах уводзіцца курс дзяржаўнае ідэалёгіі. Міністар адукацыі Брыгадзін моўчкі сыдзе ў адстаўку.

**На пачатку траўня** прэм'ер Італіі Бэрлюсконі робіць экстравагантную заяву: «Каб стаць палітычным і вайсковым гігантам ды зраўняцца з ЗША, Эўразьвязу трэба прыняць у свой склад Турэччыну, Беларусь, Украіну і Расею».

**14 траўня** на мястэчка Арэхаўск, што на Аршаншчыне, выпаў надзвычай буйны град. Пяцісантымэтровы ў дыямэтры ледзяны шрот павыбіваў шкло ў парніках цяплічнага камбінату.

**28 траўня** ў Беларускі ліцэй прызначаюць расейскамоўную дырэктарку. Улада спрабуе ўзяць пад кантроль неўпадабаную ёй навучальную ўстанову, але сутыкаецца з дружным супрацівам навучэнцаў, бацькоў і выкладчыкаў.

**У той самы дзень** міністар інфармацыі Падгайны на тры месяцы спыняе выданьне «БДГ» і «БДГ. Для служебного пользования». Такая ж доля пры канцы траўня напаткала «Навінкі». Зачыненая «БДГ» працягвае выходзіць пад шапкамі іншых газэтаў, якія даюць ёй свае старонкі.

**У чэрвені** хакеіст Руслан Салей, першы з нашых суайчыньнікаў, трапляе ў фінал Кубку Стэнлі. І хоць яго «магутныя качары» не ўзыходзяць на самую высокую прыступку, твар Руслана пачынае мільгаць у рэкляме прадукцыі беларускіх вытворцаў. Ён ды яшчэ Максім Мірны ў 2003-м робяцца канчаткова пазнавальнымі «сваімі» чэмпіёнамі.

**18 чэрвеня** Лукашэнка кажа пра адсутнасьць «эканамічных падставаў» для пагадненьня аб валютным саюзе Беларусі і Расеі. А пагадненьне аб увядзеньні расейскага рубля «супярэчыла б нашай Канстытуцыі», урачыста абвяшчае Беларускае радыё.

**22 чэрвеня** на 80-м годзе жыцьця ў Бараўлянах памірае Васіль Быкаў. Яго пахаваньне ператвараецца ў шматтысячную маніфэстацыю пад нацыянальнымі сьцягамі па праспэкце Скарыны. Прэзыдэнт у гэты дзень дэманстратыўна ад'яжджае ў Сьветлагорск.

Пасьля неўпадабанага Лукашэнкам рэпартажу з пахаваньня **пры канцы чэрвеня** ўлады зачыняюць карпункт НТВ у Менску.

**10 ліпеня** за невыкананьне пастаўленых задачаў у адстаўку адпраўлены ўрад Уладзімера Навіцкага. Выконваць абавязкі прэм'ера (паўнавартасным прэм'ерам ён стане толькі **19 сьнежня**) пастаўлены Сяргей Сідорскі. Першай пастановай новага кабінэту стане вызначэньне канчатковых умоваў прыватызацыі «Белтрансгазу», на які квапіцца «Газпром».

**12 ліпеня** пазбавілі частаты ў FM-дыяпазоне беларускамоўную станцыю «Сталіца». Замест яе зьявілася расейскамоўная.

**Ліпень** стаў месяцам рэзкага павелічэньня цэнаў на камунальныя паслугі.

**6 жніўня** ў адстаўку сыходзіць міністар інфармацыі Падгайны. Апошнія месяцы яго кіраваньня адзначыліся хваляй рэпрэсій супраць незалежнай прэсы.

**1 верасьня** ліцэісты пачалі новы навучальны год на дварэ, побач зь Ліцэем.

**10 верасьня** ў стакгольмскім супэрмаркеце забітая міністарка замежных справаў Швэцыі Ганна Лінд. Забойцам аказаўся швэд сэрбскага паходжаньня.

**У той жа дзень** прэзыдэнты Беларусі, Расеі, Украіны і Казахстану падпісваюць у Ялце ўгоду аб утварэньні Адзінай эканамічнай прасторы. Эўразьвяз, украінская і беларуская апазыцыя засьцерагаюць Беларусь і Украіну ад падпісаньня пагадненьня.

**Між тым** вядомы амэрыканскі палітоляг Бжазінскі заяўляе пра неабходнасьць прыняць Беларусь у заходнія арганізацыі (перш за ўсё ў NATO). Хоць і абгаворваецца, што гэта справа няблізкага часу.

**У кастрычніку** ў Беларусі адбываецца самая масавая галадоўка пратэсту. У Ваўкавыску адмаўляюцца ад ежы 30 таксоўшчыкаў. Яны пратэстуюць супраць дзеяньняў падатковай інспэкцыі, якая канфіскавала іх машыны. Акцыя скончацца перамогай таксістаў.

**У кастрычніку** ж стартаваў міжрэгіянальны тэлеканал «Лад». Ім замянілі «Культуру» ў Менску і РТР — у правінцыі. На 12-м годзе незалежнасьці ўлады нарэшце пачалі разьвіваць нацыянальную тэлепрастору. АНТ, СТВ і «Лад» робяцца неад'емнай часткай тэлепраграмаў, хоць і складаюцца яшчэ пераважна з праграмаў расейскае вытворчасьці.

**25 кастрычніка** ў Расеі арыштоўваюць Міхаіла Хадаркоўскага, самага багатага чалавека краіны, кіраўніка кампаніі «Юкас». Многія камэнтатары лічаць гэта спробай перагляду вынікаў прыватызацыі ў Расеі. Затое **7 сьнежня** на выбарах у Расеі партыя ўлады заваюе канстытуцыйную большасьць у Думе. А **23 сьнежня** Уладзімер Пуцін заявіць, што «думае над пытаньнем пераразьмеркаваньня прыбытку здабыўных кампаніяў».

**2 лістапада** ў Грузіі адбываюцца парлямэнцкія выбары. Улады спрабуюць сфальсыфікаваць іх вынікі, што выклікае палітычны крызыс у краіне. **23 лістапада** апазыцыя штурмам бярэ парлямэнт. Прэзыдэнт Шэварднадзэ сыходзіць у адстаўку.

**У сярэдзіне сьнежня** МЗС Беларусі спрашчае працэдуру атрыманьня беларускіх візаў для жыхароў Заходняй Эўропы.

**13 сьнежня** абвешчана пра тое, што Хусэйн злоўлены. Ён хаваўся ад амэрыканцаў на працягу 249 дзён.

**19 сьнежня** Хрыстас Пургурыдэс апублікаваў мэмарандум у справе зьніклых палітыкаў. Ён патрабуе адстаўкі Шэймана і незалежнага разбору справы.

**Справа: фота Анатоля Клешчука, Андрэя Лянкевіча ды photo.bymedia.net**



Гэтае фота абышло газэты: мэр Багдаду ў Менску ў момант, калі амэрыканскія войскі ўжо займаюць пазыцыі ў Кувэйце




Мясцовыя выбары: альтэрнатывы няма



Частачка Беларусі: Пурым у Менску



Выйшаў на волю журналіст Павал Мажэйка, асуджаны за паклёп на прэзыдэнта

Далоў, Садаме: у першы дзень акупацыі Багдаду амэрыканскімі войскамі іракцы зрынаюць статую дыктатара



# год як дзень

## фатаграфіі году



Вербніца ў Ракаве: як і штогод, як і пяцьсот гадоў таму



Спэцыялісты прапанавалі ўнесьці рытуал беларускага Купальля ў сьпіс Сусьветнае духоўнае спадчыны



Грыбны год: фота з спэцыяльнага нумару «НН»



Міхаіл Хадаркоўскі: мільярдэр у турме



БНФ зладзіў экалягічную вандроўку за закрыцьцё расейскае радыёлякацыйнае станцыі пад Вялейкай





«Дажынкі»: людзі ядуць, міністры на подыюмах





Пратэстанты масава пратэставалі супраць новага закону аб свабодзе сумленьня



Два адстаўнікі году: сьпікера савету рэспублікі Вайтовіча, што меў пра ўсё сваю думку, зьмяніў мяккацелы прэм'ер Навіцкі





Менчукіоў абурыла перайменаваньне мэтро «Плошча Незалежнасьці» ў «Плошчу Леніна»: схемы станцый дагэтуль падпраўляюць хто як можа



Ліцэісты пратэстуюць



Год быў ураджайным: лета выдалася халодным, восень — доўгай і цёплай



Другая Няміга: пажар у шпіталі ў Рандзілаўшчыне забраў тры дзясяткі жыцьцяў



Васілю Быкаву — удзячныя суродзічы



Мікола Аўрамчык не пагадзіўся з прэтэнзіяй Ніла Гілевіча на аўтарства «Сказу пра Лысую гару»



Ня стала міністаркі Лінд, вялікай сяброўкі Беларусі



Першая посткамуністычная дынастыя ўтварылася ў Азэрбайджане: Ільгам зьмяніў Гейдара



Уладзімер Пуцін: самадзержац Расеі



Раландас Паксас: у адстаўку?

# Год слабога даляра

## Людзі прызвычаіліся працаваць у Нямеччыне і Маскве

**На гэты год урадам краіны быў заплянаваны высокі рост ВУП, экспарту і імпарту, рэальных даходаў людзей — усё на ўзроўні 6—6,5%. Ці былі дасягнутыя гэтыя паказьнікі? А калі так, як гэта паўплывала на дабрабыт беларусаў?**

### Рост ВУП

У 2003 працягваўся фэнамэнальны рост ВУП: калі ў 2002 рост склаў 4,7%, дык на лістапад 2003 — ужо 6,5%, як гэта і было заплянавана ўрадам. Галіновая структура ВУП амаль не зазнала зьменаў. Хіба зьменшылася доля сельскай гаспадаркі (гл. табліцу). Зрэшты, як робіцца эканамічны рост у Беларусі, мы расьпісалі ў «НН» №46.

**Структура ВУП Беларусі ў %, 2002—2003**

| Галіна | 2002 | 2003 |
|---|---|---|
| Прамысловасьць | 26 | 25,7 |
| Сельская гаспадарка | 9 | 7,7 |
| Будаўніцтва | 5,3 | 5,4 |
| Транспарт і сувязь | 11,3 | 11,1 |
| Гандаль і харчаваньне | 10,4 | 10,6 |

### Прамысловасьць

Выпуск прамысловых тавараў вырас у студзені—лістападзе 2003 на 6,9% у параўнаньні з аналягічным пэрыядам 2002. Хутчэй за іншых гналі «вал» вытворцы будматэрыялаў (111,2%), хімічная і нафтахімічная прамысловасьць (108,5%) ды машынабудаваньне і мэталаапрацоўка (108,1%). Вынік — запасы гатовай прадукцыі на складах у цэлым па прамысловасьці выраслі з пачатку году на 17,5%.

Прамысловыя прадпрыемствы павялічылі рэнтоўнасьць рэалізаванай прадукцыі. За студзень—кастрычнік 2003 яна склала 12% (за аналягічны пэрыяд мінулага году — 10,8%). Калі ж пералічыць паказчык рэнтоўнасьці згодна з міжнароднымі стандартамі, дык ён будзе ніжэйшы ў два разы. Высокай застаецца вага стратных прадпрыемстваў у прамысловасьці — 31,5%. Найбольш іх у лёгкай, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасьцях.

### Сельская гаспадарка

Халоднае лета 2003-га перасунула пэрыяд збору ўраджаю асноўных культураў на жнівень—верасень. Раньняя ж восень пахавала частку ўраджаю, якую не пасьпелі ўбраць да першых халадоў. Тым ня менш, быў зафіксаваны амаль 10-працэнтны прырост прадукцыі расьліннаводзтва на лістапад 2003 у параўнаньні з аналягічным пэрыядам 2002! Рост у жывёлагадоўлі склаў усяго 0,5%. Але ў цэлым заплянаваны паказьнік росту вытворчасьці сельгаспрадукцыі 106,5—107% быў дасягнуты. Адбылося гэта пераважна за кошт росту вытворчасьці ў прыватных гаспадарках, якія быў амаль у два разы вышэйшы за рост вытворчасьці аграпрадпрыемстваў.

Фінансавы стан апошніх пагаршаўся. У студзені—кастрычніку 2003 яны працавалі із стратамі ў 9,6 млрд руб., супраць 18,5 млрд прыбытку ў аналягічным пэрыядзе 2002. Рэнтоўнасьць рэалізаванай прадукцыі склала -0,3% (+0,9% у 2002), вага стратных прадпрыемстваў — 61,3%. Сельская гаспадарка — рэкардсмэн па крэдыторскай запазычанасьці (19% ад агульнага аб’ёму ў краіне). Нават улады зразумелі, што аграпрадпрыемствы маюць быць рэфармаваныя. Праўны статус большасьці калгасаў зьменены, «шэфская» дапамога ўводзіцца ў новыя інстытуцыйныя рамкі, вядуцца размовы пра перадачу стратных калгасаў прадпрымальнікам. Цяжка сказаць, ці пойдзе ўлада на гэта ў наступным годзе.

### Інфляцыя, абменны курс

Інфляцыя па індэксе спажывецкіх цэнаў з пачатку году склала 22,9%. Больш, чым у іншых эўрапейскіх краінах, але для Беларусі і гэта вялікі прагрэс. Нацбанк праводзіў узважаную палітыку, якая прывяла да паніжэньня ўзроўню інфляцыі. Базавая стаўка рэфінансаваньня была зьніжаная з 37% да 28%. З пачатку году даляр ЗША патаньнеў усяго на 12%, што адлюстроўвае хутчэй ня моц беларускага рубля, а кволасьць даляра, які зьняцэніўся ў адносінах да іншых валютаў. Той жа эўра падаражэў проці даляра амаль на траціну.

### Жыльлёвы сэктар

Крэдытаваньне жыльлёвага будаўніцтва дзяржавай у 2003 працягвалася за кошт эмісійных крэдытаў Нацбанку, выклікаючы інфляцыю. За студзень—лістапад 2003 у эксплюатацыю было здадзена 2,7 тыс. кв. м жытла, што на 8,7% больш, чым за адпаведны пэрыяд 2002. Інвэстыцыі ў будаўніцтва жытла маюць значную вагу ў агульным аб’ёме інвэстыцыяў у краіне — 19,3%.

Працягваецца старэньне жыльлёвага фонду краіны. Калі кардынальным чынам не зьмяніць мэханізму фінансаваньня рамонту жытла, праз 10—15 гадоў варта чакаць першых абвалаў шматпавярховак. Сёлета Рада Міністраў прымала пастановы, што мелі паскорыць працэс арганізацыі кандамініюмаў, правядзеньне цеплавой рэабілітацыі дамоў і г.д. Жыхары шматпавярховак аплачваюць усё большую частку сабекошту камунальных паслугаў. Адсотак пакрыцьця па некаторых паслугах нават перавысіў 100%. Гэты рост не кампенсуецца адпаведным ростам заробкаў людзей, як гэта плянавалася ўрадам.

### Замежны гандаль

Аб’ём замежнага гандлю ўзрос за студзень—кастрычнік на 23,4% у параўнаньні з аналягічным пэрыядам 2002, пры прагнозе 5,5—6,2%. Пры гэтым экспарт павялічыўся на 22,1%, а імпарт — на 24,5%. Склалася адмоўнае сальда замежнага гандлю таварамі і паслугамі ў памеры 685,5 млн даляраў. Адбылося гэта за кошт перавышэньня адмоўнага сальда па гандлі таварамі над станоўчым сальда па гандлі паслугамі. У параўнаньні з




PHOTO.BYMEDIA.NET

адпаведным пэрыядам 2002, адмоўнае сальда па гандлі таварамі павялічвалася хутчэй, чым станоўчае па гандлі паслугамі, — з 700,1 млн да 1079,5 млн і з 297 млн да 394 млн даляраў. Іншымі словамі, расьлі і экспарт, і імпарт, але імпарт рос хутчэй. Бо павялічваліся цэны на энэрганосьбіты.

Падвысіўся ўзровень манэтызацыі замежнагандлёвых апэрацыяў, што адлюстроўвае зрух у бок нармалізацыі эканамічных дачыненьняў паміж агентамі ў Беларусі і ў замежжы, асабліва Расеі. Вага бартэру ў замежнагандлёвых апэрацыях панізілася ў параўнаньні з 2002 на 43,3% і склала 4,2% ад агульнага аб’ёму экспарту і 3,2% ад агульнага аб’ёму імпарту (у 2002 — 9,1% і 7,1% адпаведна).

Нэгатыўнай тэндэнцыяй трэба лічыць павелічэньне гандлёвых абаротаў з Расеяй, якое сёлета працягвалася. Тым больш што Беларусь імпартуе з Расеі больш, чым экспартуе ў гэтую краіну. Адбываецца гэта за кошт пастаяннага падаражаньня энэрганосьбітаў, а таксама за кошт таго, што Расея пачала адцягваць для Беларусі ролю пасярэдніка ў гандлі імпартаванымі з трэціх краінаў таварамі.

### Рэальныя даходы насельніцтва

Нягледзячы на статыстычныя «посьпехі» ў рэальным сэктары, людзі ня сталі жыць лепей. З кастрычніка 2002 да кастрычніка 2003 рэальныя даходы насельніцтва павялічыліся на 1,9%. Такімі ж тэмпамі расьлі і рэальныя заробкі. Калі ўлічыць, што рост рэальных даходаў насельніцтва вылічваецца зыходзячы з індэксу спажывецкіх цэнаў, дык можна зрабіць высноўу, што большасьць беларусаў у 2003 годзе сталі ў рэальным выражэньні зарабляць менш, чым у 2002-м. Бо ў спажывецкім кошыку ляжаць пэўныя тавары, цэны на якія адміністрацыйна кантралююцца.

Сярэдні памер пэнсіі за апошні год значна не зьмяніўся і цяпер складае ўсяго толькі 71% ад мінімальнага спажывецкага бюджэту пэнсіянэра.

Цягам году ўзьнікалі сур’ёзныя запазычанасьці па выплаце заробкаў. Агулам банкі выдалі трыльён рублёў крэдытаў на пагашэньне гэтае запазычанасьці. Часта тыя крэдыты ўлада брала «сілай».

### Эканоміка дзеля палітыкі

У эканоміцы назіраецца сытуацыя, тыповая для аўтарытарнай сыстэмы: узровень жыцьця грамадзян застаецца на адным узроўні ці нават пагаршаецца на тле эфэктнага росту валавых паказьнікаў. Людзям кажуць, што іх заробак вырас да 140 даляраў, і маўчаць пра зьмену мэтодыкі падліку гэтага заробку і інфляцыю даляра. Рост ВУП дасягаецца за кошт прыраданьня асноўных фондаў, працы «на склад» ці, увогуле, статыстычных маніпуляцый. Значная колькасьць прадпрыемстваў неканкурэнтаздольныя і стратныя. Беларусь, замест таго каб рэструктурызаваць гэтыя прадпрыемствы пры дапамозе заходніх інвэстараў, што дазволіла б айчыннай вытворчасьці пераарыентавацца на заходнія рынкі, усё больш завязваецца на Расею. Такая палітыка мае сэнс толькі ў кароткатэрміновай пэрспэктыве — каб даць сёньняшняй уладзе пратрымацца яшчэ некаторы час.

Урад краіны не пайшоў на рашучыя крокі па рэфармаваньні эканомікі. Не было створана ўмоваў для прыватызацыі, прыходу замежнага капіталу. Амаль не рэфармаваліся стратныя сельская гаспадарка, жыльлёва-камунальная гаспадарка, грамадзкі транспарт... І самае дзіўнае — усё гэта, насуперак прагнозам шматлікіх незалежных экспэртаў, не прывяло да развалу эканомікі і сацыяльнага выбуху. Выглядае наадварот: людзі прызвычаіліся працаваць у Нямеччыне і Маскве, дасылаючы грошы сваякам дахаты, альбо займаюцца напаўлегальным прадпрымальніцтвам тут. У кожнай галіне зьявіліся сучасныя прадпрыемствы з большменш прагрэсіўнымі тэхналёгіямі ў вытворчасьці і маркетынгу. Зрэшты, хоць бы ў Расеі «беларускі» тавар — сынонім тавару якаснага і даступнага.

**Дамінік Міхайловіч**

# Тыдзень зь Дзедам Марозам

Нас чакае тыдзень калядных канікул! Перапынак арганізоўваюць на дзяржаўным узроўні. Страты ад нерытмічнай працы падаюцца ў афіцыйным паведамленьні ў якасьці галоўнага аргумэнту. Але адыграла ролю і жаданьне выцiснуць з грамадзянаў дадатковыя выдаткі на адпачынак. Пытаньне толькі, ці ёсьць у іх сродкі на забавы.

«Адпачывайце — і ўсё ў нас будзе!» — перакручаны гарбачоўскі лёзунг. Вырашэньнем макраэканамічных праблем абранае самідзённае сьвяткаваньне. Акцэнт ізноў робіцца не на арганізацыю вытворчасьці, а на кіраваньне выдаткамі. Шчыруюць на гарадзенскіх прыпынках кантралёры, пасты ДАІ ўжылі, мусіць, надзвычайны запас акумулятараў для радараў — зьбіраюцца штрафы. Напярэдадне — абавязковае страхаваньне ад няшчасных выпадкаў на вытворчасьці, што таксама створыць прадказальны фінансавы паток чыста фіскальнага паходжаньня.

Сумную неабходнасьць спыняць вытворчасьць дзеля зьмяншэньня стратаў ператварылі ў дасягненьне сацыяльнай палітыкі. Навагодняя забавы, пазбаўленыя дагэтуль ідэалягічнае прывязкі, робіцца «ў якасьці экспэрымэнту» часткай клопату ўлады пра народ, сымбалем яднаньня і кансалідацыі.

> Неабходнасьць спыняць вытворчасьць дзеля зьмяншэньня стратаў ператварылі ў дасягненьне сацыяльнай палітыкі.

Кансалідацыі дзеля чаго? Не дзеля ж добрай выпіўкі й закускі, катаньня з горак (калі яшчэ будзе на той момант сьнег).

Улады ня ў стане прапанаваць прывабныя мэты працоўнага высілку — нармальныя заробкі, ня ў стане забясьпечыць рэальны рост дабрабыту шараговага працаўніка, затое намагаюцца пакіраваць яго выдаткамі ды крыху палепшыць настрой відовішчамі. Першае адбілася ў бюджэце: заплянаваны рост непадатковых даходаў ад штрафаў, ліцэнзаваньня і да т.п., а студэнскія канікулы цудоўна кладуцца на расклад перадачаў расейскага тэлебачаньня.

Улада адмовілася падтрымаць нацыянальныя традыцыі сьвяткаваньня Вялікадня і Дзядоў, адпрэчыла Дзень Волі 25 сакавіка, перанесла Дзень Незалежнасьці: гэтыя традыцыі не дапасоўваліся да яе бачаньня «жыхара рэспублікі». Пошукі нацыянальнай ідэі, якая б не зьяўлялася нацыянальнай ідэяй, далі сьціплы вынік у выглядзе славянскага базару, саюзнай дзяржавы пры захаваньні незалежнасьці, «роўнага статусу» моваў і адсутнасьці ўцямнае візіі будучыні краіны. Новы год і Дзед Мароз не нагадваюць ні пра залаты век ВКЛ, ні пра БНР, ні нават пра дарэшты зазэксплюатаваную Перамогу. Адзінае, што пагражае, — доза праваслаўнай рыторыкі пры канцы бесклапотнага тыдня, на які, дарэчы, прыпадае перадкалядны праваслаўны пост. Дык будзем весяліцца?!

**Аляксандар Карольчык**

# Вацлаў Гавал: Кастра сказаў мне, што чэскае піва пагоршала

— **Чым займаюцца былыя прэзыдэнты?**

**Вацлаў Гавэл:** У Чэхіі прэзыдэнты або паміралі яшчэ ў часе сваёй кадэнцыі, або сыходзілі з ганьбаю па вялікіх зьменах у грамадзтве. Адзін толькі Масарык сам пакінуў пасаду, калі ўжо быў невылечна хворы. Прэзыдэнта, які б даслужыў і пасьля нармальна жыў, мы яшчэ ня мелі. Я першы. Спачатку я ўяўляў, што, як пэнсіянэр, буду мець шмат часу на літаратурную працу, чытаньне, разважаньні ды вандроўкі, але гэта было ілюзіяй. Цяпер у мяне меншая канцылярыя — тры супрацоўнікі (раней іх было сто). Я маю насычаны графік, шмат запрашэньняў. Пакуль я шчэ разладжаны, але веру, што да чэрвеня наступнага году мой стан стабілізуецца і нейкую традыцыю былых прэзыдэнтаў закладу.

— **Гэта як вярнуцца з турмы?**

**В.Г.:** Нейкае падабенства тут ёсьць. Бальшыня вязьняў пасьля муштры, якую перажылі за кратамі, уяўляюць, што маюць неабмежаваную свабоду, ня думаюць, што і жыцьцё звонку мае правілы. А таму праз кароткі час трапляюць зноў у вязьніцы. Так і мае ўяўленьні пра свабоду выявіліся вялікаю ілюзіяй. Я й надалей мушу выказвацца вельмі дыпляматычна, я больш зьвязаны, чым бальшыня маіх суграмадзянаў.

— **Што Вас найбольш цікавіць у палітыцы?**

**В.Г.:** Калі зьбяруся ў нешта грамадзкае ангажавацца — а я гэта, безумоўна, зраблю, — дык буду выказвацца адносна важных рэчаў. Не хачу камэнтаваць дробязі, асабліва на чэскай сцэне. Сфэра, якая мне падыходзіць, — гэта правы чалавека. Чэхія мае, як сябар NATO, гарантыі бясьпекі, уваходзіць у ЭЗ. Гэта незваротна. Сыстэмныя зьмены нам не пагражаюць. І таму я хутчэй бы арыентаваўся на іншыя месцы, дзе з гэтым горш. Я маю сувязь з Кубаю. Там выходзяць самвыдатам ці ўвозяцца ў перакладзе на гішпанскую мае кнігі, там пра мяне ведаюць, і я шмат разоў меў магчымасьць размаўляць з тамтэйшымі апазыцыйнымі дзеячамі.

— **Яны былі тут у Вас?**

**В.Г.:** Некаторыя былі, напрыклад Санчэз і Асвальда Пая. Зь некаторымі, хто цяпер на эміграцыі, сустракаўся ў Флорыдзе. Кубінскі рэжым найбліжэйшы да нашай былой рэчаіснасьці, дый яго крах, падобна, набліжаецца. Мы здольныя шмат у чым дапамагчы кубінцам, перадухіліць нейкія памылкі. Мы таксама ведаем, наколькі важная салідарнасьць з актыўнай апазыцыяй. Дысыдэнты заслужылі павагу да сябе, яны мужныя, шмат гадоў правялі за кратамі ды напісалі свае добрыя кнігі, але ў вачох практычных палітыкаў дэмакратычнага сьвету выглядаюць падазрона: бурчаць, увесь час скардзяцца, іранізуюць, дакалупваюцца. У нашым выпадку высьветлілася: як добра, што нейкая структурызаваная апазыцыя існуе, хай яе намаганьні і здаюцца донкіхотвам...

— **Чаму гэта добра?**

**В.Г.:** Калі ў нас валіўся камунізм, было каму ад імя грамадзкасьці весьці перамовы з уладай. Было каму выступаць на мітынгах і тыя мітынгі арганізоўваць. Дакумэнты ня мог пісаць выпадковы мінак, ня мог ён і ўзначаліць народны супраціў. «Аксамітная рэвалюцыя» пачыналася зь безнадзейнага супраціву тых буркуноў-дысыдэнтаў. Але трэба, каб прадстаўнікі апазыцыі рыхтаваліся ўзначаліць дзяржаву. Нельга, каб дэмакратычная апазыцыя ў момант, калі сыстэма пачне развальвацца, сказала: «Добра, мы свайго дасягнулі, а цяпер ідзём на піва». У Аўганістане ці ў Іраку хаатычнае становішча: ёсьць вызвалены народ, але няма кіраўніка.

— **Вернемся на Кубу. Шмат хто з заходніх інтэлектуалаў у свой час быў апантаны кубінскай рэвалюцыяй. Вы таксама захапляліся Чэ Геварам?**

**В.Г.:** Я таксама «дзіця шасьцідзясятых», у тыя часы я пачынаў адкрыта выступаць, тады пачалі ставіць мае п'есы, я наведваў вялікія маніфэстацыі на Захадзе. Але як толькі пачаў адчуваць найменшыя прыкметы фанатызму, асьляпленьня ды фундамэнталізму, ужо ведаў, што такія рухі йдуць няправільным шляхам. Чэ Гевара па-свойму фантастычны, варты павагі чалавек, але адначасова ён і няшчасьнік. Той яго славуты фатаздымак, які быў на ўсіх плякатах і майках, вельмі ўдалы, на ім фраер...

— **Вы былі калі-небудзь у Гаване?**

— Не. Але зь Фідэлем Кастра аднойчы сустракаўся — сядзеў зь ім за сталом на ўрачыстым абедзе ў гонар гадавіны заснаваньня ААН у 1995 г. Мы амаль не размаўлялі, хіба толькі ён сказаў, што ў нас цяпер не такое добрае піва, як было раней.

У Нікарагуа я размаўляў з правадырамі Сандыніцкай рэвалюцыі. Пытаўся: «Што вас у камунізьме так зачароўвае пасьля дзесяцігодзьдзяў рэпрэсіяў?» А яны казалі, што ў нешта чалавек усё ж верыць мусіць і што жорсткі амэрыканскі экспансіянізм і сацыяльныя падзелы, якія адмыслова ў Паўднёвай Амэрыцы множыліся, для іх непрымальныя. І яны абралі альтэрнатыву. Але яны забыліся, што альтэрнатыву мусіць кожны стварaць сам. Узяць аднекуль гатовую — гэта пачатак усіх фанатызмаў, дактрынёрстваў і фундамэнталізмаў.

— **У Маскву Вы таксама шмат ня езьдзілі...**

**В.Г.:** Быў там, здаецца, сем разоў з працоўнымі візытамі ды раз зь дзяржаўным. Быў я першым некамуністычным прэзыдэнтам з краіны савецкага блёку, а да таго ж і былым дысыдэнтам. Першая размова з Гарбачовым была такая халодная, што апаноўвала думка: ці ня скруцяць мяне, як Дубчака. Пасьля патроху пачало ўсё высьвятляцца, размаўлялі каля васьмі гадзін, а сёньня мы добрыя сябры. Але тады было нялёгка давесьці, што мы ня нейкія здраднікі, ворагі чалавецтва ці Савецкага Саюзу. І пасьля нялёгка было даводзіць Ельцыну, што пашырэньне NATO ня будзе пагрозаю для Расеі.

— **Але гэта ўжо далёкая мінуўшчына.**

**В.Г.:** З Пуціным шмат кантактаў ня меў, толькі аднойчы размаўлялі ў Рыме. Дый не было патрэбы. Дзяржаўныя візыты на найвышэйшым узроўні маюць свой рытм, і, калі пройдуць, хутка іх не паўторыш. Застаюцца працоўныя візыты, а яны маюць сэнс, толькі калі для гэтага ёсьць прычыны, тэма і двухбаковы інтарэс.

— **А Чачэнія ці не была б дастатковай прычынай для працоўнага візыту да Пуціна?**

**В.Г.:** Я ж кажу, што інтарэс мусяць выяўляць абодва бакі. Пуцін добра ведаў, што падчас майго візыту была б гутарка пра Чачню.

— **Пра амэрыканскі экспансіянізм кажуць ня толькі правадыры Сандыніцкай рэвалюцыі. Што пра замежную палітыку ЗША думаеце Вы?**

**В.Г.:** Я досыць вялікі крытык глябалізацыі, у якой істотную ролю граюць транснацыянальныя карпарацыі. Праз тое, што завуцца яны транснацыянальнымі, бальшыня людзей зводзіць усё гэта на Амэрыку. Але гэта ня чыста амэрыканская карпарацыі. Хто ведае, што там чыё? Можна ж дапусьціць, і гэта праўда, што падземка ў Лёндане належыць саудаўскай каралеўскай сям'і. Але вінаватая заўжды Амэрыка.

— **Чаму?**

**В.Г.:** Яна самая вялікая, самая разьвітая і нясе, адпаведна, найбольшую адказнасьць. Вечная дылема амэрыканскай палітыкі — дакуль пашыраецца адказнасьць за сьвет і дзе пачынаецца пыха моцы.

— **4 лістапада сэнатар Джон Маккейн, адзін зь пятнаццаці самых уплывовых амэрыканцаў, абвесьціў, што Буш не павінен запрашаць Пуціна на саміт «Вялікай васьмёркі», ды раскрытыкаваў працэс супраць Міхаіла Хадаркоўскага. Сказаў, што такія мэтады «могуць выклікаць новую эру халоднага міру». Як бачыце сёньняшнюю Расею Вы?**

**В.Г.:** Мы ад пачатку разумелі, што Расея ня стане з дня на дзень дэмакратычнай дзяржавай, падобнай да Канады, і што адносіны між Амэрыкай і Расеяй ня будуць такімі ж, як між Амэрыкай і Канадай. На гэта трэба некалькі пакаленьняў.

Расея — агромністая эўраазіяцкая імпэрыя зь іншай гісторыяй, іншай культурай, іншай рэлігіяй ды іншымі норавамі. Нельга ўзвышаць сябе над ёю. Яна проста іншая, і трэба з гэтым зьмірыцца. Расея стаіць перад прэзыдэнцкімі выбарамі, становішча вельмі напружанае. Пуцін адначасна малады і амбіцыйны, ён лічыць, што пуцінская эра пачынаецца, а ніяк не скончаецца.

— **Вы лічыце сваёю «постпрэзыдэнцкай» тэмай правы чалавека. Чаму тады болей не выказваецеся адносна падзеяў у постсавецкіх краінах, такіх, як Беларусь, Грузія ці Айзэрбайджан?**

**В.Г.:** У беларускія рэчы я ўцягнуты. Ня так даўна атрымаў ганаровую прэмію, якую, паводле ўмоваў, мусіў адразу перадаць некаму іншаму. Выходзяць адразу два ляўрэаты — сымбалічны й сапраўдны. Я перадаў яе галоўнаму рэдактару газэты «Наша Ніва», якая сёньня зьяўляецца ці не апошнім незалежным і свабодным беларускім выданьнем. Яшчэ ў часы прэзыдэнцтва я прымаў прадстаўнікоў беларускай апазыцыі ў Градзе. У лютым еду ва Ўкраіну, пасярэднічаць у дыялёгу між апазыцыяй і прэзыдэнтам Кучмам. Маю інтарэс да лёсу пані Аунг Сан Су Джы, якую намінаваў на Нобэлеўскую прэмію, сустракаюся зь бірманцамі, займаюся будучыняй Тыбэту... Але ж нельга ахапіць цэлы сьвет.

— **Сёньня мы згадваем чатырнаццатую гадавіну 17 лістапада. Чэская свабодная супольнасьць вырасла да юнацкіх гадоў. Якія зьмены Вы адчуваеце?**

**В.Г.:** З кожным наступным годам зьяўляюцца новыя генэрацыі маладых людзей, якія выраслі ўжо ў свабодзе. Яны не дэфармаваныя папярэднім ладам, як мы, старэйшыя. Як вырастуць ужо іх дзеці, якія ня возьмуць у спадчыну нават хатніх ды сямейных дэфармацыяў сваякоў, будзе яшчэ лепей.

**Пераклаў Ільля Глыбоўскі паводле «Lidove noviny»**



Я перадаў прэмію галоўнаму рэдактару газэты «Наша Ніва», якая сёньня зьяўляецца ці не апошнім незалежным і свабодным беларускім выданьнем.

**(Фота з цырымоніі перадачы Вацлавам Гаўлам прэміі імя Эленбоген нашай газэце)**

Наша Ніва

Нагадваем, што падпіску «Наша Ніва» таньнейшая. Падпісны індэкс **63125**. Цана падпіскі на месяц — **2150** рублёў. На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1500** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».

Дык падпісвайся!



# Дзесяць музычных прыкметаў 2003

## Беларуская музыка з моды вузкага кола ператвараецца ў масавую

### Дэбюты

На апошнім «Басовішчы» яскравых дэбютантаў было шмат. Берасьцейская «Сьцяна» прыемна зьдзівіла якаснымі аранжаваньнямі з выкарыстаньнем духавых інструмэнтаў. «IQ 48» выдалі пару ўдалых нумароў, але што ў пэрспэктыве? Асабліва калі музычная мода зьменіцца. Вельмі няблага выглядала сёлета група «Indigo». З блюзавых камандаў, якія набіраюць абароты, назаву «Mary Long», хоць найбольш яркім дэбютам я назваў бы блюзава-бугавую суполку «Big Val, Svet & Al»: тут і перамога ў міжнародным конкурсе, і сапраўдная актыўнасьць у клюбным жыцьці.

### Кабзон не прыехаў

Заблытаная гісторыя з адменай выступу Іосіфа Кабзона мае сама меней два тлумачэньні. Першая вэрсія — ліст вядомых дзеячоў беларускага мастацтва з просьбай адмяніць канцэрт, які выпадаў на Дзень Волі. Але больш рэальна выглядае іншая вэрсія: білеты папросту не «пайшлі». Як і на многія іншыя канцэрты раней запатрабаваных у Беларусі расейскіх зорак. Тэндэнцыя, аднак!..

### «Каза» ломіцца

А канцэрты беларускіх выканаўцаў зьбіраюць усё больш слухачоў. Аншлягі на некаторых канцэртах прымушаюць клапаціцца пра набыцьцё квіткоў загадзя. І ня толькі на такія добра рэклямаваныя паказы, як «Крамбамбуля» ці «Сьвяты Вечар», для якіх і «Казы» на 1300 месцаў замала. А аншляг на «Грыфаманіі-2003»? Беларуская музыка перастала быць модай у вузкіх колах апантаных, а пачала карыстацца куды больш шырокай папулярнасьцю. Канцэрты сталіся больш відовішчнымі. На выступе «Крамбамбулі» ў кастрычніку вакол рок-каралёў вальсавала пара, скакала балерына, ім падпявала салістка оперы Ніна Цішко. На «Сьвятым Вечары» ў сьнежні побач з рок-музыкамі выступаў хор «Арханёл».

### Слава Мінінфармацыі!

Мінінфармацыі, якое сёлета вызначылася нечуваным раней «наездам» на недзяржаўную прэсу, у галіне папулярнай музыкі зрабіла тое, чаго ня здолелі зрабіць за ўсе гады ні прыватныя асобы, ні дзяржаўныя структуры. Загад аб рэглямэнтацыі прысутнасьці беларускай музыкі ў этэры даў прыкметны плён: прымус адбіўся і на наведваньні канцэртаў, і на росьце накладаў дыскаў. Калі Мінінфармацыі пойдзе далей і зарэглямэнтуе абмежаваную прысутнасьць у этэры трэцясортнай расейскай папсы, прыбыткі беларускага шоў-бізнэсу (а такім чынам, і падатковыя адлічэньні ў бюджэт) яшчэ падрастуць. І выйграе ад гэтага, як кажа Аляксандар Рыгоравіч, беларускі народ. А музыкі — народ таксама.



18 сьнежня Вольскі і Паўлаў на «Сьвятым Вечары»

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Страты

Год 2003 быў багаты на страты. Аднаго сыходу Ўладзімера Мулявіна, знакавай постаці ня толькі ў маштабах Беларусі, зь лішкам хапіла б на тое, каб афарбаваць 2003-і ў самыя змрочныя фарбы. «Песьняры» страцілі яшчэ й барабаншчыка Ўладзімера Бяляева. А група «Сузор'е» канчаткова набыла статус неяртальнай легенды: амаль адначасова зь Бяляевым, у тым самым веку, у той жа Амэрыцы пайшоў з жыцьця Валянцін Пучынскі, аўтар большасьці гітоў «Сузор'я».

### «Песьняры» патроіліся

Наступствы адыходу Мулявіна даюцца ў знакі: цяпер мы маем тры калектывы, так ці інакш зьвязаныя з спадчынай «дзеда» беларускага року. Леанід Барткевіч зарэгістраваў у Расеі гандлёвую марку «Песьняры» і тым самым назаўсёды закрыў Беларусь для канцэртаў свайго брэнду: з гэтай назвай Леаніда тут наўрад хто пацерпіць. Ёсьць жа свая, дзяржаўная капэла. Дый «Беларускія песьняры» нарэшце пераканалі стратэгаў зь Мінкульту, што закрываць для іх Беларусь было памылкай... Падобна, граблі сталі прадметам інтэр'еру прыёмнай Міністэрства: тое, што рабілася год таму ў дачыненьні да «БП», цяпер паўтараецца ў дачыненьні да ВІА Л.Барткевіча.

### Кніга Барткевіча

Год пазначыўся ў гісторыі беларускай поп-музыкі першым грандыёзным скандалам, зьвязаным з прысабечваньнем чужой інтэлектуальнай уласнасьці. Барткевіч ушчаміў у кніжку нібыта ўласных успамінаў пра «Песьняроў» цэлыя блёкі тэкстаў, да аўтарства якіх ён, нібыта, ня мае дачыненьня. Працяг гісторыя плягіяту атрымае ў 2004 г. Пацярпелы былы «пясьняр» Уладзімер Мікалаеў свае выкарыстаныя Барткевічам успаміны зьбіраўся выдаваць сам. Леанід дамогся аднаго: у выніку скандалу кніжка разышлася вельмі хутка.

### Нашы на «Эўрабачаньні»

Мастацкі ўзровень конкурсу «Эўрабачаньне» саступае камэрцыйнаму. Вось чаму на ім варта проста «засьвяціцца». Дэбют у дзіцячым конкурсе 2003 г. для Беларусі быў надзвычай пасьпяховы: зь першага разу — і адразу на чацьвертую пазыцыю. Невядома, ці зробіць кар'еру прафэсійнай сьпявачкі Вольга Сацюк, але пэрапалаху яе ўдалы выступ нарабіў. Як пройдзе дэбют Беларусі ў «дарослай» катэгорыі — пабачым у 2004-м. Колькі той зімы!

### muzic.fromby.net

Найбольш дынамічны з усіх новых музычных праектаў у беларускім Сеціве. Робіцца апэратыўна, з выдумкай, інфармацыйна насычаны, нягледзячы на ўсе «хваробы росту». Адно, што пачынае турбаваць: як бы стваральнікі гэтага сайту не замкнуліся ў рокавай прасторы. Бо сваю аўдыторыю сайт ужо мае, а яна, як паказала практыка, агрэсіўна выступае супраць іншай (хоць бы папсовай) стылістыкі. Між тым задача гэтага рэсурсу — папулярызаваць усю палітру таго, што мы маем у музыцы. І, пажадана, бяз моўнай і стылёва-жанравай дыскрымінацыі.

### У вядомыя — бязь візы?

Год прынёс трэці ў гісторыі беларускай музыкі трыб'ют. Перапетай аказалася група «NRM». Можна спрачацца адносна мастацкай вартасьці зробленага і разважаць, ці надышоў час адліваць прыжыцьцёвы бронзавы бюст Вольскага і кампаніі ды закладаць ганаровую зорку каля «Казы», аднак кіраваца ўсё ж варта рынкам: калі трыб'ют набываюць, значыць, права на жыцьцё ён мае. Выданьне пацьвярджае, што абсягі «легендарнасьці» ў нашым музычным шоў-бізнэсе пашыраюцца. Вось толькі ня пэўны, што працяг гэтага праекту можа быць гэткі ж пасьпяховы: усе ведаюць, у што ператвараецца гісторыя, якая паўтараецца.

Увогуле суцяшальных і аптымістычных тэндэнцый было ў 2003 годзе як ніколі шмат. З чым вас усіх і віншую!

**Зьміцер Падбярэскі**

# Героі году

## Сёлета беларускія музыкі зьнялі чатыры дзясяткі кліпаў — удвая болей, чым летась

Слава Корань шліфаваў сваё «Люстэрка» два гады, і вось сёлета задаволіўся працай і выдаў плытку. Альбом атрымаўся вар'яцкім у добрым сэнсе гэтага слова. Што ні песьня — то шэдэўр. Толькі вось ня можа Корань зладзіць прэзэнтацыю праграмы.

Грымнуў «Паравінамі году» Зьміцер Вайцюшкевіч. Дзеля гэтага альбому ён нават адклаў працу над вершамі Маякоўскага. У «Паравінах» мы пачулі Тодара невядомага. Тодара-шансанье, Тодара-мэлядыста. Не жартаваў канфэрансье Віктар Шалкевіч на канцэрце «Сьвяты Вечар», калі назваў Тодара «вядомым беларускім кампазытарам».

Праект «Крамбамбуля 1 1/2» заангажаваў ня толькі рок-каралёў мінулых гадоў — Вольскага, Кулінковіча, Міхалка, але й беларускіх спартоўцаў. З «Крамбамбулі» беларускую музыку пачалі слухаць тыя, хто раней не зьвяртаў на яе ўвагі. Дыск «Каралі раёну» набылі больш за 5000 чалавек — гэта рэкорд для беларускага шоў-бізу.

У 2003 г. адусюль — з тэлевізара й радыё, з форткі суседа, з альтанкі ў двары — чулася: «Панаехала гасьцей з іншаземных абласьцей». Іншыя песьні не настолькі аваладалі грамадзкай сьвядомасьцю, але ў гітпарадах першыя месцы трымалі «Дзень без гарэлкі» Памідора, «Устану ранкам» Кораня, палацаўская «Ў лузе» з саўндтрэку «Настасьсі Слуцкай». Затое «Бэля» ў выкананьні Вольскага, Кулінковіча і Міхалка пакуль ня стала гітом.

Сёлета беларускія музыкі зьнялі пад 40 кліпаў — удвая болей, чым летась. Усе яны трапілі ў тэлератацыю. І гэта нягледзячы на тое, што кліпавае мастацтва — дарагая забава: якасна зьняты ролік каштуе пад 6 тыс. даляраў. Музыкі выкручваліся хто як. «Дай дарогу» нарэзала кадраў з хранікальных і аматарскіх відэаздымкаў аж на чатыры кліпы. «Безь білета» здымалі дажджысты праспэкт Скарыны з акна таксоўкі. Модныя цяпер анімацыйныя кліпы — як у «Крамбамбулі» ці «Ляпіса Трубяцкога». Зазвычай энтузіязму ў маладых гуртоў хапае толькі на дэбютны кліп. Потым прыходзіць усьведамленьне, што лепей раз самому зьявіцца ў этэры, чым 150 разоў пракруціць кліп.

**Сяргей Будкін**

**Альбомы, якімі запомніцца год**

- Зьміцер Вайцюшкевіч «Паравіны году»
- Крамбамбуля «Каралі раёну»
- N.R.M. «Дом культуры»
- «Viza NRM»
- Уліс «Люстэрка»

**Песьні, якімі запомніцца год**

- Крамбамбуля – Госьці
- N.R.M. – Лёгкія-лёгкія
- Памідораў – Дзень без гарэлкі
- Вайцюшкевіч – Я ішоў да цябе
- Уліс – Устану ранкам

**Кліпы, якімі запомніцца год**

- Крамбамбуля – Госьці
- Ляпіс Трубяцкой – Ластаўкі
- Стары Ольса – У карчме
- ZET – Калгас
- J-Морс – Вэб-дызайн

# Найлепшыя кнігі 2003

**Каб вызначыць найлепшыя кнігі году, мы зьвярнуліся да адзінаццаці аўтарытэтных экспэртаў — крытыкаў, выдаўцоў і кнігагандляроў. Фаварытамі сталі густоўна выдадзеныя фаліянты ў цьвёрдых вокладках на добрай паперы. І кніга Быкава.**

Зь вялікім адрывам найлепшай кнігай 2003 году прызнаная «Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя» Ўладзімера Арлова й Зьмітра Герасімовіча: яе згадвалі амаль усе экспэрты «НН», а Даніла Жукоўскі назваў «самай рэклямаванай кнігай году». «Яна далучыла да айчыннай гісторыі цэлы пласт нашага грамадзтва, а для чужаземцаў стала своеасаблівай візытоўкай краіны», — прызнае Зьміцер Санько.

На другое месца заканамерна выйшла апошняя прыжыцьцёвая кніга Васіля Быкава «Доўгая дарога дадому». Прыемна, што перамаглі камэрцыйна пасьпяховыя выданьні. Чаго ня скажаш пра тамы, якія занялі наступныя пазыцыі ў сьпісе.

Экспэрты высока ацанілі яшчэ адно падарункавае выданьне — анталёгію беларускай паэзіі XX ст. «Краса і сіла». Кур'ёзна, што яна выйшла дзякуючы гранту ад фонду, які ўзначальвае сьпікер расейскае Думы Генадзь Селязьнёў.

Разам з прызнанымі майстрамі Янкам Брылём, Уладзімерам Някляевым і Леанідам Драньком-Майсюком у «дзясятцы» — Альгерд Бахарэвіч. Гэта высокая ацэнка творчасьці маладога празаіка.

Сымптаматычна, што толькі адзін з экспэртаў (Зьміцер Серабракоў) адзначыў тыя кнігі, якія сёлета сапраўды «перадавалі прачытаць другому» і якія прачыталa, напэўна, найбольшая колькасьць чытачоў. Маюцца на ўвазе «Нашэсьце» і «Выпадковы прэзыдэнт». Такія кнігі не ўспрымаюцца экспэртамі як «сур'ёзныя». Між тым, ужо сам факт, што ў дзясятку трапілі лічаныя арыгінальныя творы (якіх і выйшла лічаная колькасьць пры сымбалічных тыражах), тады як дамінуюць анталёгіі, энцыкляпэдыі і зборы выбранага, сьведчыць пра глыбокі крызыс і аўтараў, і выдаўцоў, і ўвогуле «тэрыторыі слова» ў нашай краіне. Гэты крызыс палітычна матываваны і грамадзтва, мякка кажучы, цікавіцца яго прычынамі. Таму выбар З.Серабракова падаецца, прынамсі, шчырым і адпаведным «чытацкім сымпатыям».

Кніжны год быў адзначаны завяршэньнем адных фундамэнтальных праектаў («Энцыклапэдыя гісторыі Беларусі», «Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.») і пачаткам ня менш грандыёзных: выдаецца «Слоўнік мовы «Нашай Нівы», падрыхтаваны Інстытутам мовазнаўства, энцыкляпэдыя «Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы 1794—1991» Леаніда Маракова. Д.Жукоўскі апошнюю кнігу, выдадзеную накладам 50 асобнікаў, ацаніў найвышэйшай ацэнкай: «Калі праца будзе завершаная ў бліжэйшыя гады, мае шанцы зрабіцца кнігай дзесяцігодзьдзя».

У сьпіс найлепшых кніг патрапіла некалькі выданьняў, датаваных 2002-м годам, якія фактычна зьявіліся сёлета: «Аўтаманаграфія» Алеся Мары (Марачкіна) ды «Становление тоталитарной системы в БССР» Тацяны Процькі.

У рэйтынгу-2003 перамаглі кнігі невялікіх выдавецтваў або выдадзеныя прыватна па-за выдавецтвамі. Гэта нагода задумацца і «Мастацкай літаратуры», і буйным прыватным друкарам.

Падчас вызначэньня месца кнігі ў рэйтынгу ўлічвалася яе пазыцыя ў дзясятцы: першае месца — 10 балаў, другое — 9 і г.д. Выніковы сьпіс складаўся па суме балаў.




## Выніковы рэйтынг

**1. Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.** — Менск: Салвія; **75 балаў.**

**2. Васіль Быкаў. Доўгая дарога дадому.** — Менск: Таварыства «Кніга»; **33 балы.**

**3. Краса і сіла: Анталёгія беларускай паэзіі / Укладальнік Міхась Скобла.** — Менск: Лімарыюс; **32 балы.**

**4. Зора і Вітаўт Кіпелі. Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе.** — Менск—Нью-Ёрк: БІНіМ; **Уладзімер Арлоў. Ордэн Белай Мышы.** — Менск: Мастацкая літаратура; **24 балы.**

**5. Леанід Маракоў. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы 1794—1991. Т.1—2.** — Менск; **21 бал.**

**6. Янка Брыль. Зь людзьмі й сам-насам.** — Менск: Мастацкая літаратура; **18 балаў.**

**7. Слоўнік мовы «Нашай Нівы». Т.1 / Пад. рэд. Валянціны Лемцюговай.** — Менск: Тэхналёгія; **Антон Луцкевіч. Да гісторыі беларускага руху / Укладаньне, прадмова й камэнтары А.Сідарэвіча.** — Менск: Беларускі кнігазбор; **Юры Бохан. Зброя Вялікага княства Літоўскага.** — Менск: Беларусь**; 17 балаў.**

**8. Францішка Ўршуля Радзівіл. Выбраныя творы.** — Менск: Беларускі кнігазбор; **Адам Міцкевіч. Выбраныя творы.** — Менск: Беларускі кнігазбор; **15 балаў.**

**9. Альгерд Бахарэвіч. Натуральная афарбоўка.** — Менск: Логвінаў; **13 балаў.**

**10. Леанід Дранько-Майсюк. Вершы. Каханьне. Проза.** — Менск: Харвест; **Фадзей Булгарын. Выбранае.** — Менск: Беларускі кнігазбор; **Алесь Гарун. Выбраныя творы.** — Менск: Беларускі кнігазбор; **Уладзімер Някляеў. Лабух.** — Менск; **12 балаў.**

**Генадзь Вінярскі,** выканаўчы дырэктар выдавецтва «Беларускі кнігазбор»
1. Краса і сіла. Анталёгія беларускай паэзіі.
2. Францішка Ўршуля Радзівіл. Выбраныя творы.
3. Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.
4. Адам Міцкевіч. Выбраныя творы.
5. Васіль Быкаў. Доўгая дарога дадому.
6. Антон Луцкевіч. Да гісторыі беларускага руху.
7. Зора і Вітаўт Кіпелі. Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе.
8. Ян Станкевіч. Гістарычныя творы.
9. Алесь Белакоз. Каб жыла Беларусь.
10. Франсуа Жакмэн. Поры году; Янка Брыль. Зь людзьмі і сам-насам.

**Міхась Скобла,** намесьнік старшыні Саюзу пісьменьнікаў Беларусі
1. Янка Брыль. Зь людзьмі і сам-насам.
2. Караль Вайтыла (Ян Павал II). Рымскі трыпціх.
3. Віктар Жыбуль. Дыяфрагма.
4. Ніна Мацяш. Перабіраю самацьветы.
5. Антон Луцкевіч. Да гісторыі беларускага руху.
6. Мікола Шкялёнак. Беларусь і суседзі.
7. Вацлаў Ластоўскі. Кароткая энцыкляпэдыя старасьвеччыны.
8. Леанід Дранько-Майсюк. Вершы. Каханьне. Проза.
9. Юрась Гарбінскі, Юры Туронак. Беларускі хрысьціянскі рух XX ст.
10. Сяргей Рублеўскі. Азярод.

**Даніла Жукоўскі,** крытык
1. Леанід Маракоў. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы 1794—1991. Т.1—2.
2. Юры Бохан. Зброя Вялікага княства Літоўскага.
3. Фадзей Булгарын. Выбранае.
4. Мэтрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 43.
5. Попіс войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 году.
6. Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.
7. Нацыянальны атляс Беларусі.

**Віталь Скалабан,** літаратуразнаўца і архівіст
1. Энцыклапэдыя гісторыі Беларусі. Т.6, кн.2.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. Т.4, кн.2.
3. Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.
4. Краса і сіла. Анталёгія беларускай паэзіі.
5. Митрофан Довнар-Запольский. История Белоруссии.
6. Татьяна Протько. Становление тоталитарной системы в БССР.
7. Попіс войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 году.
8. Райнэр Лінднэр. Гісторыкі і ўлада.

9. Леанід Маракоў. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы 1794—1991. Т.1—2.
10. Фадзей Булгарын. Выбранае.

**Зьміцер Санько,** галоўны рэдактар выдавецтва «Тэхналёгія»
1. Зора і Вітаўт Кіпелі. Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе.
2. Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.
3. Слоўнік мовы «Нашай Нівы». Т.1.
4. Алесь Мара. Аўтаманаграфія.
5. Вацлаў Ластоўскі. Кароткая энцыкляпэдыя старасьветчыны.
6. Уладзімер Арлоў. Ордэн Белай Мышы.
7. Міхась Чарняўскі. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі.
8. Лявон Баршчэўскі. Літаратура ад старажытнасьці да пачатку эпохі рамантызму. Папулярныя нарысы.

**Людміла Рублеўская,** літаратурная аглядальніца газэты «Беларусь сегодня»
1. Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.
2. Леанід Маракоў. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы 1794—1991. Т.1—2.
3. Сучасная беларуская проза. Традыцыі і наватарства.
4. Алесь Гарун. Выбраныя творы.
5. Лявон Баршчэўскі. Літаратура ад старажытнасьці да пачатку эпохі рамантызму. Папулярныя нарысы.
6. Ганна Кісьліцына. >blond attak<
7. Адам Глёбус. Сшыткі.
8. Леанід Дранько-Майсюк. Вершы. Каханьне. Проза.
9. Літаратурны квартал. Паэтычны зборнік.
10. Аксана Бязьлепкіна. Разам і паасобку. Таварыства «Тутэйшыя».

**Тацяна Вабішчэвіч,** кніжная аглядальніца «НН»
1. Зора і Вітаўт Кіпелі. Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе.
2. Слоўнік мовы «Нашай Нівы». Т.1.
3. Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.
4. Краса і сіла. Анталёгія беларускай паэзіі.
5. Нацыянальны атляс Беларусі.
6. Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня.
7. Альгерд Бахарэвіч. Натуральная афарбоўка.
8. Адам Міцкевіч. Выбраныя творы.
9. Уладзімер Някляеў. Лабух.
10. Андрэй Хадановіч. Старыя вершы.

**Зьміцер Серабракоў,** літаратурны аглядальнік газэтаў «Згода» і «Навінкі»
1. Уладзімер Някляеў. Лабух.
2. Альгерд Бахарэвіч. Натуральная афарбоўка.
3. Владимир Матикевич. Нашествие.
4. Андрей Климов. Тот самый Климов.
5. Светлана Калинкина, Павел Шеремет. Случайный президент.
6. Изяслав Адливанкин. Нашествие.
7. Ганна Кісьліцына. >blond attak<.
8. Адам Глёбус. Сшыткі.
9. Андрэй Хадановіч. Старыя вершы.
10. Джэці (Вера Бурлак). За здаровы лад жыцьця.

**Анатоль Бутэвіч,** экс-міністар інфармацыі й культуры
1—2. Васіль Быкаў. Доўгая дарога дадому; Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.
3. Краса і сіла. Анталёгія беларускай паэзіі.
4. Янка Брыль. Зь людзьмі й сам-насам.
5. Леанід Дранько-Майсюк. Вершы. Каханьне. Проза.
6. Алесь Гарун. Выбраныя творы.
7. Людміла Рублеўская. Сэрца мармуровага анёла.
8. Фадзей Булгарын. Выбранае.
9. Васіль Якавенка. Надлом.
10. Юры Бохан. Зброя Вялікага Княства Літоўскага.

**Алесь Яўдаха,** незалежны кнігараспаўсюднік (паводле вынікаў продажаў)
1. Уладзімер Арлоў. Ордэн Белай Мышы.
2. Васіль Быкаў. Доўгая дарога дадому.
3. Ян Станкевіч. Гістарычныя творы.
4. Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.
5. Антон Луцкевіч. Да гісторыі беларускага руху.
6. Сяргей Астравец. Лісты да Хома Саветыкуса.
7. Мікола Шкялёнак. Беларусь і суседзі.
8. Уладзімер Арлоў. Адкусі галаву вароне.
9. Адам Глёбус. Сшыткі.

**Ірына Крэсік,** таваразнаўца «Кнігарні пісьменьніка» (паводле вынікаў продажаў):
1. Уладзімер Арлоў, Зьміцер Герасімовіч. Краіна Беларусь.
2. Уладзімер Арлоў. Ордэн Белай мышы.
3. Васіль Быкаў. Доўгая дарога дадому.
4. Юры Бохан. Зброя Вялікага Княства Літоўскага.
5. Францішка Ўршуля Радзівіл. Выбраныя творы (сэрыя «Беларускі кнігазбор»).
6. Адам Міцкевіч (сэрыя «Беларускі кнігазбор»).
7. Уладзімер Дубоўка. О Беларусь, мая шыпшына!
8. Вольга Іпатава. Альгердава дзіда.
9. Статут Вялікага Княства Літоўскага.
10. Там, дзе вежы Сафіі. Укл. Навум Гальпяровіч.

**Падрыхтаваў Адам Воршыч**

# Спартовыя перамогі 2003

## Моладзь у фінале

Сёлета наша моладзевая футбольная зборная трапіла ў фінал Чэмпіянату Эўропы. Увайсьці ў восемку самых моцных камандаў, апярэдзіўшы такія футбольныя супэрдзяржавы, як Галяндыя, Чэхія, Гішпанія, Ангельшчына ды Францыя, — для нас вялікі гонар і вялікія пэрспэктывы адначасова. Ёсьць з каго браць прыклад «дарослай» нацыянальнай зборнай. Моладзевае Эўрапершынство — гэта найперш вялізны кірмаш, дзе кожны гулец, які добра паказаў сябе, можа быць заўважаны грандамі сусьветнага футболу. Гэта не актуальна для Аляксандра Глеба, якога і так добра ведаюць па «Штутгарце», але ж у нас ёсьць такія файныя хлопцы, як Юрась Жаўноў, Цімох Калачоў ці Алег Шкабара, якія могуць яшчэ падвучыцца ў якіх італьянскіх ці нямецкіх клюбах. Да таго ж турнір будзе адборам на Алімпіяду'2004 у Атэнах. У нашых хлопцаў някепскія шанцы. Супернікі цалкам прахадныя: Швайцарыя, Харватыя, Швэцыя, Сэрбія і Чарнагорыя. Будзем чакаць лютага, калі стане вядома, з кім сустрэнемся на першай стадыі, ды самога першынства, якое пройдзе ў траўні—чэрвені.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Тамара Салей ганарыцца сваім сынам, самым папулярным і высокааплатным хакеістам краіны.**

## Першыя ракеткі Эўропы

Нашая мужчынская зборная па настольным тэнісе была найлепшай на камандным чэмпіянаце Эўропы. Ды яшчэ індывідуальныя залатыя мэдалі ў асабістым і парным заліку спартоўцы ўзялі (Уладзімер Самсонаў і Яўген Шчацінін адпаведна). А вось на чэмпіянатах сьвету і Алімпійскіх гульнях справы ў Самсонава ідуць ня так гладка. Сёлета ў Парыжы на Чэмпіянаце сьвету наш лідэр вылецеў ужо ў 1/8 фіналу. Да таго ж праз занятасьць Самсонава нашая каманда цяпер завальвае адбор на наступнае першынство Эўропы. Таму алімпійскія пэрспэктывы ацаніць складана.

## Трыюмф кідальнікаў

Тры залатыя мэдалі на Чэмпіянаце сьвету ў Парыжы — відавочны посьпех айчыннай школы «каралевы спорту». Тым больш прыемна, калі гэта адбываецца за год да Алімпійскіх гульняў, а перамогі такія перакаnaўчыя. Як заўсёды, перамогі прынесьлі нам прадстаўнікі кідальнага сэктару (вось яно спрадвечнае беларускае жаданьне адправіць усё як мага далей!): Андрусь Міхневіч (штурханьне ядра), Іван Ціхан (кіданьне молата) і Ірына Ятчанка (дыск). Але спачываць на лаўрах рана. Згадайма 1995 год, калі нашыя лёгкаатлеты занялі другое месца ў агульнакамандным заліку на Чэмпіянаце сьвету ў Гётэбарзе (Швэцыя), але на гульнях у Атлянце праз год колькасьць мэдалёў рэзка скарацілася. Дый залатых сярод іх не было.

## Біятлённая эстафэта

Перамога нашых мужчынаў-біятляністаў у эстафэце на Кубку сьвету — істотнае дасягненьне. Апошнім часам беларуская каманда выступае пасьпяхова, вось толькі посьпехі гэтыя завязаныя на асобах людзей, якія перабеглі да нас ад суседзяў. Дамарослых пэрспэктыўных спартоўцаў пакуль ня бачна.

## Качар Салей і пінгвін Кальцоў

Год адзначыўся выступам нашых хакеістаў у камандах НХЛ. Руслан Салей — першы беларус, які браў удзел у фінальных гульнях Кубку Стэнлі і закінуў там шайбу. А малады Канстанцін Кальцоў замацаваўся ў складзе клюбу «Pittsburgh Penguins». У «пінгвінах» раней гуляў легендарны Марыё Лем'е, цяпер ён адзін з уладальнікаў клюбу. Кальцову ж пакуль застаецца толькі расьці ды набірацца досьведу, каб прадэманстраваць свае здольнасьці ў нацыянальнай зборнай.

**Зьміцер Казлоўскі**

# Найлепшыя фільмы 2003

## «Догвіль» і сыквэлы

«НН» зьвярнулася да сямі экспэртаў з просьбай ацаніць фільмы, паказаныя ў менскіх кінатэатрах за мінулы год. Ацэнкі фільмам даваліся па 10-бальнай сыстэме — зьверху ўніз ад 10 да 1 балу.

Пераможцам кінаагляду стаў «Догвіль» Ларса фон Трыера. Фільм зьняты ў мінімалісцкіх дэкарацыях: намаляваныя на падлозе студыі контуры дамоў, надпісаныя паміж дамамі назвы вуліцаў — тэлеспэктакль, а ня звыклае нам кіно з вулічнымі ды пэйзажнымі здымкамі. Трылер фон Трыера распавядае пра часы амэрыканскай Вялікай дэпрэсіі: Грэйс (Ніколь Кідман) уцякае ад мафіі й хаваецца ў забытым Богам і людзьмі гарадку Догвілі. У аплату за прытулак яна пачынае дапамагаць яго жыхарам: прыбірае у дамах, мыць падлогу й г.д. Тут яны і сядаюць ёй на карак. Праўда, догвільцы не падазравалі, якую халеру яны выклікалі на сваю галаву...

За фільм «Догвіль» Эўрапейская кінаакадэмія назвала фон Трыера найлепшым рэжысэрам 2003 г.

Асабліваcьцю кінагоду было мноства сыквэлаў — фільмаў-працягаў: «Матрыцы», «Тэрмінатара-3», «Уладара пярсьцёнкаў».

Другое і трэцяе месца занялі дзьве «Матрыцы», але вывеў іх туды толькі камэрцыйны посьпех у пракаце. Кінакрытыкі былі нашмат больш скептычнымі наконт іх. А вось «Догвіль» можна было паглядзець толькі ў «Кінафармацэ 4х4» ды пазьней у адзіным кінатэатры «Перамога»... Густы крытыкаў і шырокага гледача моцна разыходзяцца ў Беларусі.

«Матрыцы» і «Тэрмінатар» адсунулі назад безумоўныя шэдэўры «аўтарскага кіно» — фільм «Лялькі», зьняты ў стылістыцы японскага лялечнага тэатру бунраку, які стаўся леташняй сэнсацыяй конкурснай праграмы Вэнэцыянскага кінафэстывалю, і расейскую кінапрыпавесьць «Вяртаньне», якая атрымала галоўны прыз у Вэнэцыі і прыз Фасьбіндэра Эўрапейскай кінаакадэміі.

Беларускі «блякбастэр» «Настасься Слуцкая» нават не патрапіў у сьпіс. Экспэрты «НН» назвалі яго фільмам-«аднадзёнкай», што не вылучаецца асаблівымі мастацкімі якасьцямі. Сышліся на думцы, што фільм зьняты па-аматарску і забудзецца ў вельмі хуткім часе. Нягледзячы на хараство Сьвятланы Зелянкоўскай, не пашанцавала з рэйтынгам Настасьсі Алелькаўне. Не ацанілі і разрэклямаванай галівудзкай стужкі «Гары Потэр і патаемны пакой».

**1. «Догвіль», рэж. Ларс фон Трыер; 31 бал.**
**2. «Матрыца-3: Рэвалюцыя», рэж. браты Вачоўскі; 21 бал.**
**3. «Матрыца-2: Перазагрузка», рэж. браты Вачоўскі; 17 балаў.**
**4. «Лялькі», рэж. Такешы Кітана; «Тэрмінатар-3: Паўстаньне машын», рэж. Джанатан Мастоў; 16 балаў.**
**5. «Вяртаньне», рэж. Андрэй Зьвягінцаў; 15 балаў.**
**6. «Піраты Карыбскага мора», рэж. Гор Вярбінскі; 14 балаў.**
**7. «Зьнесеныя прывідамі», рэж. Хаяо Міядзакі (анімацыйны); «К-19», рэж. Кетрын Бігелоў; «Код невядомы», рэж. Міхаэль Ханэке; «Неба. Самалёт. Дзяўчына», рэж. Вера Сторажава; 10 балаў.**

**Павал Сьвярдлоў,** аглядальнік інтэрнэт-праекту «Дазорац»
1. «Догвіль»
2. «Вяртаньне»
3. «Мэтропаліс»
4. «Лялькі»
5. «Піяніст»
6. «Касабланка»
7. «Банды Нью-Ёрку»
8. «Шык»
9. «Матрыца-2: Перазагрузка»
10. «Мора»

**Людміла Саянкова,** кінакрытык, выкладчыца журфаку БДУ
1. «Догвіль»
2. «Герой»
3. «Часы»
4. «Адаптацыя»
5. «Вяртаньне»
6. «Шпацыр»
7. «Шык»
8. «Ішоў трамвай дзявяты нумар»
9. «Зьнесеныя прывідамі»
10. «Старыя»

**Ягор Конеў,** сцэнарыст, выкладчык журфаку БДУ
1. «Догвіль»
2. «Сакратарка»
3. «Званок»
4. «Бальная сукенка»
5. «Матрыца-3: Рэвалюцыя»
6. «Матрыца-2: Перазагрузка»
7. «Уладар пярсьцёнкаў: Дзьве цьвярдыні»
8. «Піраты Карыбскага мора»
9. «Тэрмінатар-3: Паўстаньне машын»
10. «Як пазбыцца хлопца за 10 дзён»

**Іван Пятроў,** кінааглядальнік «НН»
1. «К-19»
2. «Чыкага»
3. «Зладзі мяне, калі зможаш»
4. «Салярыс»
5. «Тэрмінатар-3: Паўстаньне машын»
6. «Матрыца» (2-я і 3-я часткі)
7. «Ліла і Стыч»
8. «Агент Кодзі Бэнкс»
9. «К чорту каханьне!»
10. «Цыпачка»

**Андрэй Расінскі,** кінакрытык
1. «Код невядомы»
2. «Дэман-палюбоўнік»

**Максім Жбанкоў,** кінакрытык, аглядальнік «Белорусской газеты»
1. «Неба. Самалёт. Дзяўчына»
2. «Лялькі»
3. «Зьнесеныя прывідамі»
4. «Басэйн»
5. «Фрыда»
6. «Банды Нью-Ёрку»
7. «Піраты Карыбскага мора»
8. «Трыё з Бэльвілю»
9. «Бумэр»
10 «Догвіль»

**Васіль Коктыш,** генэральны дырэктар УП «Белвідэапракат» (паводле касавых збораў у Менску)
1. «Матрыца-3: Рэвалюцыя»
2. «Таксі-3»
3. «Тэрмінатар-3: Паўстаньне машынаў»
4. «Піраты Карыбскага мора»
5. «Брус Усёмагутны»
6. «Матрыца-2: Перазагрузка»
7. «Ліга выдатных джэнтэльмэнаў»
8. «Гары Потэр і таемны пакой»
9. «Уладар пярсьцёнкаў»
10. «Памры, але не цяпер»

**Падрыхтаваў Зьміцер Дзядзенка**


**«Вяртаньне»**


**«Лялькі»**


**«Догвіль»**



Кіраўнік Нацыянальнага банку Беларусі Пятро Пракаповіч здымае шапку, рыхтуючыся вітаць віцэ-прэм'ера Расеі Аляксея Кудрына ды кіраўніка Цэнтрабанку Расеі Сяргея Ігнацьева. Аэрапорт «Менск-2», 23 сьнежня. Размовы пра адзіную валюту дзьвюх краінаў былі галоўнай мыльнай бурбалкай году. «Канструктыўны дыялёг» працягваецца.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Бессэнсацыі

## Дзясятка грандыёзных мыльных бурбалак году

### Зброя масавага зьнішчэньня

Найбольшую «бурбалку» году пусьцілі Джордж Буш і Тоні Блэр. Гэта інфармацыя пра наяўнасьць зброі масавага зьнішчэньня ў Іраку. Вайну распачалі, тысячы людзей палажылі, а зброі Садамавай не знайшлі. Урэшце амэрыканцы абвясьцілі, што зброя ўсё ж ёсьць, але ведае пра месца, дзе яна схаваная, толькі сам Садам. Садама злавілі — і паабяцалі, што ён будзе мець «ільготы» ў судзе, калі пакажа месца захаваньня той зброі. Ну, апраўдацца можна тым, што адным дыктатарам стала меней.

### Без самавара і «Пагоні»

Шуму вакол «першага беларускага гістарычнага блякбастэру» было шмат. Аднак хутка выявілася, што ў фільме ня так і многа гістарычнага, а яшчэ менш беларускага. З ужо зьнятага фільму выкінулі згадкі пра захоплены расейцамі Смаленск і прамову Настасьсі да войска: «Мы — ліцьвіны і павінны абараняць сваю зямлю». Міністар культуры Гуляка, пабачыўшы ў кадры герб Слуцку — «Пагоню», загадаў: «Прыбраць!» Казалі, што дырэктар «Беларусьфільму» сам выразаў «крамольныя» кадры з кінастужкі.

Навуковыя кансультанты фільму кажуць, што магло быць горш. Кандыдат гістарычных навук Лявон Калядзінскі пераканаў кіношнікаў ня ставіць на стол літоўскіх князёў расейскі самавар XIX ст., пашыць вайсковую вопратку, адпаведную эпосе, зьняць фільм ня ў Мірскім замку, а ў драўляных дэкарацыях.

### Слухай, а гэта сваё?

На пачатку году зьявілася рашэньне Саўміну пра тое, што з 1 чэрвеня ў радыёэтэры (у прыватнасьці, на цалкам расейскамоўных FM-станцыях) частка вяшчаньня павінна аддавацца беларускай музыцы і навінам альбо праграмам уласнае вытворчасьці. Сьпярша вялася гаворка пра 30—40%, потым — пра 50% беларускай музыкі. Загад выйшаў, але беларускай музыкі пабольшала ненашмат. Ня маючы дастаткова кампактаў, каб запоўніць імі палову этэрнага часу, радыёстанцыі сталі круціць запісы расейскіх сьпевакоў, зьвязаных зь Беларусяй: Юр'я Антонава (вучыўся ў Маладачанскай вучэльні), Барыса Маісеева (нарадзіўся ў Магілёўскай турме) і іншых.

### Мухі, катлеты, рублі...

Расея патрабавала ад нашай краіны пераходу на расейскі рубель з 1 студзеня 2005 г. Лукашэнка падумаў — і даў згоду. Праўда, пераход на расійскі рубель у нашым Нацбанку бачылі ня так, як у расейскім Цэнтрабанку. «Толькі два эмісійныя цэнтры», — такая пазыцыя Нацбанку. Банкіры сварыліся доўга і выдалі ўрэшце грандыёзны пшык: увосень расейскі віцэ-прэм'ер Кудрын патлумачыў, што абмяркоўваць умовы пераходу на адну валюту з 2005 г. — позна.

### «Падлужніца»

Гуманітарнікі першыя два месяцы году абмяркоўвалі новы варыянт правапісу, які распрацаваў Інстытут мовазнаўства пад кіраўніцтвам дырэктара Аляксандра Падлужнага. Новы варыянт меўся стаць прамежкавым паміж «тарашкевіцай» і «наркамаўкай». І слова «прэзыдэнт», паводле новага правапісу, мелася пісацца зь вялікай літары. Найбольшае абурэньне выклікала тое, што праект правапісу распрацоўваўся келейна, без шырокага абмеркаваньня. Саюз пісьменьнікаў нават прыняў адмысловы зварот: маўляў, чаму нават майстры слова адхіленыя ад магчымасьці абмеркаваньня? Да пісьменьнікаў прыслухаліся, праект ім пачыталі далі. А пасьля ён шчасьліва згубіўся недзе ў нетрах Адміністрацыі прэзыдэнта.

### Бескаралеўе

Грамадзкі камітэт па сьвяткаваньні 750-годзьдзя каранацыі Міндоўга меў грандыёзныя пляны: прасіць аб афіцыйным перайменаваньні старажытнай сталіцы ў «Навагрудак», паставіць помнік каралю, правесьці канцэрты й навуковыя канфэрэнцыі, выпусьціць адмысловую манэту й марку, аднавіць пастаноўку опэры «Князь Навагрудзкі»… Рэальна грамадзкі камітэт адужаў правесьці толькі мастацкую выставу й невялікі канцэрт. Мінкульт ад удзелу ў сьвяткаваньні практычна ўхіліўся: афіцыйныя ўлады правялі толькі навуковую канфэрэнцыю ў Навагрудку.

### Бунт машынаў

24 лістапада мелася адбыцца першая відэатрансьляцыя прэсавай канфэрэнцыі Лукашэнкі ў Інтэрнэце. Прадэманстраваць «прасунутасьць» не ўдалося: прэзыдэнцкі сайт ляснуўся ў першыя ж хвіліны трансьляцыі ад жахлівай перагрузкі. Доступ да віртуальнага «цела» быў вельмі абмежаваны і здаваўся запісаным загадзя.

### Унівэрсытэцкае золата

Пры канцы году ў галоўнай ВНУ краіны — Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце — выявіліся зладзеі. Кіраўнікоў прыўнівэрсытэцкага прадпрыемства «Унікаштмэт» праз тэлевізію абвінавацілі ў крадзяжы 35 кіляў золата. Пад падазрэньне ў суўдзельніцтве патрапіў нават рэктар Аляксандар Казулін. Пагатоў улады, здаецца, даўно шукалі, за што б яго зьняць. На ягонае месца перасеў экс-міністар адукацыі Васіль Стражаў. Праўда, хутка выявілася, што золата ніхто ня краў, хіба што мытныя дакумэнты афармлялі не зусім правільна. Дый з Казуліна абвінавачаньне зьнялі. Але на рэктарскае крэсла ўжо не вярнулі.

### Дзяржаўная ідэалёгія

Яна ёсьць. Але яе няма.

### Хто сказаў «рэфэрэндум»?

Чуткі пра рэфэрэндум аб трэцім прэзыдэнцкім тэрміне хадзілі ўвесь год. Незалежныя аналітыкі прагназавалі наступствы, з дакладнасьцю да гадзіны вылічвалі час яго правядзеньня, партыі прымалі пагрозьлівыя заявы. Лукашэнкавы фразы пра тое, што «я яшчэ і паловы другога тэрміну не адбыў», усправаліся як дакладны знак. А рэфэрэндуму ўсё няма. І невядома, ці будзе.

**Аркадзь Шанскі**

## Падпіска пасьля падпіскі

Што рабіць, калі Вы не пасьпелі падпісацца на «НН»? У прыватным агенцтве «Эй Бі Прэс-Сэрвіс» падпісацца на «НН» можна да канца месяца. Цана на паўгоду складае: для ведамасных падпісчыкаў 17885 руб. з ПДВ, для індывідуальных падпісчыкаў 15426 руб. Газэта дастаўляецца кур'ерам з рук у рукі. Падпіска прымаецца на любы пэрыяд па т.: 223-44-52, 226-87-99, 222-27-20. Ніколі ня позна падпісацца і праз «Белпошту» ці шапікі «Белсаюздруку» — але ўжо толькі на люты і далей.

# Твары году


Сьвятлана Зелянкоўская

**Сьвятлана Зелянкоўская** — актрыса году і сэкс-сымбаль беларускага кіно. У «Настасьсі Слуцкай» яна, ніводнага разу не агаліўшыся, увасобіла цалкам аголеную дзяржаўную ідэалёгію, а ў «Акупацыі»


Аляксандра Герасіменя

сыграла партызанскую Марыю Магдалену. Цяпер былая акторка Купалаўскага тэатру, Чорная панна Нясьвіжу, сьпявачка «Госьціцы» задумала з сваёй суперніцай па «Настасьсі» Веранікай Кругловай супольны музычны праект «Суперніцы». Настасься — адгалосак постсавецкай настальгічнай моды на ўсё славянскае. Славянскае ў нас усё — ад каўбасаў да шакаляду. Але то Настасься. Сьвятлана ж — густоўная артыстка і сапраўдны эталён беларускай прыгажосьці-2003.

Калега па цэху **Ніколь Кідман** у фільме Ларса фон Трыера «Догвіль» дэманструе, як кволая ахвяра чалавечай жорсткасьці можа ператварыцца ў бязьлітаснага забойцу, не пазбаўленага, аднак, прыцягальнасьці. Кар'е-

Ніколь Кідман



Дэвід Бэкхем

ра акторкі заўважна пайшла ўгару пасьля разводу з Томам Крузам.

Плыўчыха **Аляксандра Герасіменя** стала беларускай Каралевай спорту'2003, нягледзячы на дыскваліфікацыю за ўжываньне допінгу. Яшчэ Аляксандра сёлета паспрабавала сябе ў кіно. Праўда, у анімацыйным: была заўважаная сярод «гасьцей з іншаземных абласьцей» у кліпе «Крамбамбулі».


Ян Лівэй

Кітаянка **Кі Гуан** стала толькі трэцяй міс сьвету, хоць чэмпіянат праводзіўся акурат у яе на радзіме. Аўтарытэт Крыса дэ Бурга, бацькі галоўнай прызэркі, пераважыў упадабаньні кітайцаў, якія з усяе моцы любілі сваё. Пераможца — абсалютна стандартная бляндынка з банальнымі рысамі твару. Ці ня час углядзецца ў твар кітайскай прыгажуні, за якой — мільярды яе суайчыньнікаў і больш як тысячагадовая культура? Сёлета ж паляцеў у космас першы кітаец **Ян Лівэй** — і безь ніякіх качагараў.

Яшчэ адзін прыгажун-авіятар **Раландас Паксас** увайшоў у крутое піке: праз паўгоду пасьля абраньня прэзыдэнтам Літвы апынуўся на мяжы імпічмэнту праз карупцыю. Парлямэнт бушуе, а простым літоўцам Паксас даспадобы: мала таго што лётчык, яшчэ і сьпявае прыгожа.

На грузінскую сьпікерку **Ніно Бурджанадзэ** заглядаўся ў дні «шэварднадзэгейту» ўвесь сьвет.


Ёшка Фішэр

Нават плэйбой Саакашвілі да прэзыдэнцкіх выбараў 4 студзеня прызнаў яе царыцай.

Калі мяняе прычоску **Дэвід Бэкхем,** капітан ангельскай нацыянальнай зборнай па футболе, гэта робяць усьлед усе ягоныя фаны. Марадона кажа — Бэкхем занадта прыгожы для футбольнага поля; Ранальда кажа — Бэкхем пацее адэкалёнам, а ангельскія сацыёлягі падвялі пад яго папулярнасьць навуковую базу: маўляў, футбольная зорка ўдала спалучае рысы мужчынскасьці і хлапечасьці, ён працавіты спарт-


Ніно Бурджанадзэ

смэн і гаспадарлівы муж, ён зьмяніў стаўленьне ангельцаў да сям'і і прывіў ім талерантнасьць да гомасэксуалістаў.

На зьмену галівудзкаму шарагоўцу Раяну прыйшла цалкам рэальная амэрыканская ваярка **Джэсыка Лінч**. Яна трапіла ў палон у Іраку, і яе вызваленьне падавалася мэдыямі як сымбаль перамогі ў непадзявана зацягнутым бліцкрыгу. 19-гадовая Джэсыка прызнавала-

ся, што ў пустэльні ёй не хапала дрэваў: дзяўчына ўсё жыцьцё правяла сярод лясоў. Вось вам алюзія на Тарзана.


Кі Гуан

**Ёшка Фішэр**, 55-гадовы міністар замежных справаў Нямеччыны, сёлета разьвёўся з сваёй чацьвёртай (!) жонкаю. І ажэніцца ў пяты раз. З кожным разам ягоныя абраньніцы робяцца ўсё маладзейшыя. Адзін з слоганаў выбарчай кампаніі'2002 быў: «Зялёныя — сэксі». Пераканаўчасьці ў вачах выбаршчыц яму надало паказальнае пахуданьне на дзясяткі кілаграмаў.

**Садама Хусэйна** непазнавальна зьмянілі месяцы, праведзеныя ў схованках. Фатаздымкі раптоўна састарэлага на некалькі дзесяцігодзьдзяў Садама з павуціньнем у барадзе — страшылка для ўсіх дыктатараў.

**ВД, СМ**


Джэсыка Лінч

# Эўропа — маўчыць

Бэрлінскі палітоляг Аляксандар Рар уключыў Беларусь у пералік «уласных праблемаў Расеі» і заўважыў, што яна «раней альбо пазьней аб'яднаецца з Расеяй».

Увосень 1991 году мне давялося паспрачацца з тагачасным старшынём Вярхоўнага Савету Станіслававам Шушкевічам наконт публікацыі ў парыскай «Фігаро». Палітоляг Элен Карэр д'Анкос напісала, што Беларусь — гэта штучнае ўтварэньне савецкай эпохі (Сталіну патрэбны быў голас у ААН) і што нават беларуская мова была створаная штучна. Сьпікер не лічыў за патрэбнае рэагаваць на нейкую публікацыю хай сабе і ў «Фігаро». І параіў мне як дэпутату парлямэнту не апускацца да спрэчкі з палітолягам.

Потым Элен Карэр д'Анкос зрабілася дэпутатам Эўрапарлямэнту. А сёньня яна — пажыцьцёвы сакратар Француская акадэміі.

Нядаўна ў «Московских новостях» бэрлінскі палітоляг Аляксандар Рар уключыў Беларусь у пералік «уласных праблемаў Расеі» разам з Чачэніяй ды Калінінградам і заўважыў, што яна «раней альбо пазьней аб'яднаецца з Расеяй».

Аляксандар Рар ня проста палітоляг у «вольным палёце». Ён — адзін з кіраўнікоў Рады ў справах замежнай палітыкі Нямеччыны — арганізацыі, якая істотна ўплывае на фармаваньне замежнай палітыкі Бэрліна.

Некалькі гадоў таму Пазьняк казаў пра стварэньне восі Парыж—Бэрлін—Масква, дзе няма месца незалежнай Беларусі, і тады на гэтыя словы не зьвярнулі асаблівай увагі. Выглядае, што цяпер яны пацьвярджаюцца.

Надрукаваныя нядаўна ў «НН» разважаньні Ўладзімера Букоўскага пра Эўразьвяз як клон колішняга СССР, дзе сувэрэннасьць мела ўмоўны характар, а ўсё вырашала цэнтральная бюракратыя, таксама гучаць як прарочая перасьцярога. Ужо на этапе прыняцьця канстытуцыі ЭЗ мы назіраем амбіцыі Нямеччыны і Францыі. Дадайце сюды флірт Бэрліна і Парыжу з Масквой на полі супрацьстаяньня з ЗША. Дарэчы, у асяродках беларускай інтэлектуальнай эліты і асабліва моладзі лічыцца ледзь не абавязковым ганьбіць Вашынгтон і нахвальваць Эўропу. Між тым менавіта ЗША найбольш пасьлядоўна (хаця і недастаткова пакуль) падтрымліваюць беларускую незалежнасьць.

Эўразьвяз жа беларуская сувэрэннасьць займае ў самай нязначнай ступені, гэта калі казаць палітыкарэктна. Калі казаць праўду — не займае зусім.

Скажу болей: калі заўтра адбудзецца інкарпарацыя Беларусі ў склад РФ, эўрапейскія сталіцы прамаўчаць.

Мне могуць запярэчыць, што і д'Анкор, і Рар — толькі палітолягі, хаця і ўплывовыя. Але вось тэндэнцыі рэальнай палітыкі.

Аналіз міжнародных рэзалюцыяў у справе Беларусі сьведчыць пра адсутнасьць у іх нават канстатацыі праблемы страты незалежнасьці. Ледзь не перад кожнай сустрэчай сусьветных лідэраў з расейскім прэзыдэнтам беларуская апазыцыя выказвае спадзяваньне (часам — са шматзначнай спасылкай на «крыніцы»), што будуць «выстаўленыя ўмовы Маскве». Але беларуская тэма ў тым варыянце, як жадалі б прыхільнікі незалежнасьці, не гучыць. І наадварот — падобна, што Эўропа ўспрыняла беларускую тэму выключна толькі як праблему недэмакратычнасьці рэжыму і перадала яе «для вырашэньня» Маскве. Вынікам сапраўды можа быць адстаўка Лукашэнкі — але і поўная страта беларускай незалежнасьці.

«Патрэбны нейкі канкрэтны сыгнал з боку ЭЗ, каб выразна прагучала: дзьверы ў Эўразьвяз для Беларусі ў прынцыпе адчыненыя», — заўважае палітоляг Валеры Карбалевіч.

Дазволю сабе прагноз: такога сыгналу, ці, як цяпер модна казаць, «мэсыджу», — ня будзе. А зрэшты, ніхто ніякі народ цягнуць у Эўропу і не абавязаны, калі ад самога народу не відаць выразных памкненьняў у гэтую Эўропу ўвайсьці.

**Сяргей Навумчык, Прага**



**Сяргей Навумчык, намесьнік старшыні БНР**

## «Пагоня» і «трактирЪ»

**Тым гамяльчанам, якім абрыдлі чырвоныя транспаранты ўпоперак вуліц ды шыльды кшталту «Ремонт часовЪ», варта завітаць у сквэрык насупраць мэдінстытуту.** Адзін з будынкаў, што ля сквэру, дагэтуль упрыгожаны вялізнай «Пагоняй». Яна завяршае пано на сьцяне дому №5а па вуліцы Ланге. Глухі мур пяціпавярховага будынку быў размаляваны ў 1992 г. да юбілею Гомелю. Пано адлюстроўвае гісторыю гораду. Бадай, зашмат месца займаюць відарысы польскага ды расейскага арлоў, аднак з кампазыцыі зразумела, што гэта — пройдзены этап. «Пагоня» добра відаць з суседніх вуліц: Савецкай, Білецкага, Камунараў. За некалькі крокаў — раённая адміністрацыя, але ў гэтым выпадку ўлады ня блытаюць мастацтва з палітыкай. Наадварот, апошнім часам у сквэры пабольшала нацыянальнага каларыту: усталяваны слуп з бусьлянкай, а ў ёй — умела зробленая пара птахаў варушыць крыламі ад павеваў ветру.

Да «Пагоні» папрывыкалі нават пэнсіянэры — асноўныя насельнікі гэтага кутка гораду. Велічыня кватэрнай платы турбуе іх больш за пано. А адвячоркам, калі канчаюцца заняткі ў мэдінстытуце і моладзь запаўняе сквэрык, над якім высіцца «Пагоня», узьнікае адчуваньне, быццам ты апынуўся ў пачатку дзевяностых. Але таму, хто захоча наведаць гэтае месца, ня раю надта расчульвацца, бо за паваротам, на вул.Білецкага, як халодны душ, яго чакае шыльда «Русский трактирЪ».

**Сяргей Баранаў, Гомель**

# Рэлігія падзелу

Падзел і варожасьць паміж Цэрквамі падрываюць іх аўтарытэт. У Беларусі можа паўтарыцца сытуацыя Чэхіі, дзе толькі 33,6% грамадзян належаць да якой-небудзь Царквы.



Рэлігія ў Беларусі працягвае дзяліць народ. Між тым гэта рэлігія, якая ў сваёй сутнасьці зьяўляецца рэлігіяй паяднаньня, прымірэньня і згоды, — хрысьціянства.

Канфэсійны падзел не зьяўляецца нейкай выключнай рысай Беларусі. Але калі ў Нямеччыне ёсьць пратэстанцкая поўнач і каталіцкі поўдзень, дык гэта значыць толькі тое, што на поўначы колькасна пераважаюць немцы-лютэране, а на поўдні — немцы-каталікі. Але нідзе мяжа канфэсійнага падзелу не праходзіць так глыбока, як у Беларусі, — па людзкіх сэрцах. Канфэсіі пазбаўляюць народ уласнай душы: мовы, культуры, гісторыі — уласнай тоеснасьці, робячы яго толькі прыладдзьдзем у адвечнай барацьбе нашых суседзяў: расейцаў і палякаў. У апошнія стагодзьдзі беларусы мелі вельмі нязначныя магчымасьці супрацьстаяць гэтаму засільлю. Унікальны шанец прынёс найноўшы час, але наш народ выявіўся пазбаўленым унутранай сілы і еднасьці — адзінай волі да жыцьця. Значная віна за гэта ляжыць на Цэрквах, якія мэтаскіравана працягваюць сваю справу падзелу беларускага народу.

Польскі народ дзякуючы каталіцтву захаваў еднасьць, духоўную моц у часы падзелаў, каб з надыходам вясны народаў адрадзіць дзяржаву. Праваслаўныя Цэрквы дапамаглі грэкам, баўгарам і сэрбам захавацца як народам у часе турэцкай няволі. Славенцы толькі дзякуючы высілкам і энтузіязму каталіцкіх сьвятароў падчас татальнай германізацыі маюць цяпер сваю мову. Тое ж можна сказаць пра Заходнюю Ўкраіну, дзе грэка-каталіцкая Царква адыграла немалаважную ролю ў захаваньні ўкраінцаў як этнасу, не ў параўнаньне моцна зрусіфікаванаму ўсходу Ўкраіны. Яшчэ й цяпер можна пачуць: Кіеў — сталіца Ўкраіны, а Львоў — сталіца ўкраінцаў.

У Беларусі ўсё было інакш. Хоць адразу трэба аддаць належную пашану тым сьвятарам, якія ўсе свае высілкі, служэньне і жыцьцё паклалі на алтар Бацькаўшчыны. Яны гінулі ў савецкіх лягерах і ў турмах гестапа, але аднячасова зазналі нямала прыкрасьці і перасьледаў з боку нібыта сваіх. Рыма-каталіцкіх сьвятароў за іх беларускія казані і працу на ніве Адраджэньня (а для тагачасных польскіх уладаў — антыпольскую дзейнасьць) пераводзілі на парафіі ўглыб Польшчы. Грэка-каталіцкіх сьвятароў пасылалі на місію ў кітайскі Харбін для працы сярод расейскай эміграцыі, у той час як на радзіме лічаныя сьвятары мусілі абслугоўваць аднячасова некалькі парафіяў. Праваслаўныя ярархі і сьвятары пасьля кожнай спробы стварэньня аўтакефаліі мусілі пакідаць родны край, гнаныя расейскай Царквой і яе атэістычнымі апекунамі.

У сучаснай Беларусі існую нават тры царкоўныя беларускія мовы. Некалькі прыкладаў: праваслаўны *сьвяшчэньнік* (рас. *священник*), рыма-каталіцкі *ксёндз* (пол. *ksiądz*), грэка-каталіцкі *сьвятар*; *Гасподзь* (рас. *Господь*) — *Пан* (пол. *Pan*) — *Госпад*; або такія панятцы, як праваслаўнае *благаслаўленьне* (ад *благі*?) ці рыма-каталіцкі *Маці-Касьцёл* (?). У культавай архітэктуры і мастацтве часам ідуць на ўсё, абы ня выявіўся шматвекавы набытак беларускай культуры. Альбо прыежджыя духоўнікі па-барбарску абыходзяцца з помнікамі той культуры. Прыклады можна множыць а множыць. Уражвае іх тэндэнцыйнасьць! Жывём у XXI ст., а народ працягваюць дзяліць на рускіх і палякаў, рабіць з нас каго заўгодна, толькі не беларусаў. Бо беларус — гэта ў першую чаргу гаспадар на сваёй зямлі, а такім нялёгка маніпуляваць.

Пастаўлены перад такім выбарам, чалавек сапраўды можа прыйсьці ў роспач. Праваслаўе ў Беларусі зьяўляецца прыладай русіфікацыі. Рыма-каталіцкі Касьцёл ад веку быў правадніком польскасьці і дагэтуль ня можа пазбавіцца гэтага духу, часта ўцелясьняючы ідэі, якія нават у Польшчы страцілі актуальнасьць. Грэка-каталіцкая Царква — пераемніца ўніяцкай Царквы, зьліквідаванай у 1839 г. расейскім урадам, — надта маленькая, да таго ж у экзезіяльным (царкоўным) сэнсе яна не пазбаўлена поўнай штучнасьці, таму мае цяжкасьці з акрэсьленьнем уласнай тоеснасьці. Пратэстанцкія Цэрквы, пры ўсёй сваёй актыўнасьці, маюць нязначны ўплыў на агульную сытуацыю. Да таго ж часта яны кіруюцца абсалютна прагматычнымі прынцыпамі, што прыносіць карысьць ім, але мала служыць усяму народу Беларусі.

У сучасным сьвеце падзел паміж Цэрквамі і іх пастаянная варожасьць робяць іх нявартымі даверу ў вачах новых пакаленьняў, выхаваных часта ў адрыве ад усялякай традыцыі. У Беларусі можа паўтарыцца сытуацыя Чэхіі, дзе толькі 33,6% грамадзян належаць да якой-небудзь Царквы. Астатнія свае духовыя патрэбы задавальняюць з дапамогай філязофіі, літаратуры альбо сямейных традыцыяў.

Пакуль ярархі будуць фліртаваць з уладай і змагацца за вынікі сацыялягічных апытаньняў, а сьвятары — праваедаваць чужыя, а часта і далёкія ад хрысьціянства ідэі, ідэалёгію мінулага, народ пойдзе далей, будуючы сваю будучыню без рэлігіі. Цэрквы ж застануцца на ўзбочыне жыцьця, перасваранія і падзеленыя. А шкада, бо наш народ пасьля перажытых у гісторыі досьведаў і экспэрымэнтаў патрабуе як ніколі хрысьціянскіх каштоўнасьцяў і досьведу веры. Інакш у сучасным сьвеце нас чакае разьяднаная грамадзтва эгаістычных спажыўцоў. Мы ж ня маем нават тых каштоўнасьцяў, якія мае дэхрысьціянізаваная Эўропа.

**Алесь Несьцярэнка**

HAUTE CULTURE

# Краіна з паўсюднымі межамі

З кожным днём дзяржава робіцца занадта вялікай для мясцовых праблемаў і занадта малой для транснацыянальных карпарацый. Межы краінаў праточваюцца міграцыямі, расьцярушваюцца інфармацыйнымі плынямі, дзяржавы злучаюцца павуціньнем сусьветнага гандлю.

Вялікія карпарацыі хоць і зьвязаныя шчэ зь месцамі свайго паходжаньня, але дэманструюць ананімна-ветлівую адстутнасьць твару.

У такіх умовах чым можа стацца маленькая й слабая краіна?

Краіна ў будучыні — гэта прылада для экспансіі культурных формаў, прыдатная прастора для вырошчваньня напрамкаў і стыляў, інкубатар своеасаблівых і адзінкавых мясцовых традыцый. (Запрашаем турыстаў у Полацак, Нясьвіж і Горадню!)

Гандлёвыя брэнды — таксама культурныя формы й пэўныя стылі, нат калі стыль часова й абезасоблены. Краіна можа выступаць матрыцай, закваскай і захавальніцай гандлёвых формаў і стыляў.

Культурныя формы спалучаюць аднячасова манапалізм і множнасьць. Множнасьць — таму што творчасьць людзкая разнастайная й рознамясцовая. Манапалізм — таму што вялікія стылі ўсёахопныя: барока, клясыцызм, рамантызм былі напрамкамі сусьветнымі, хаця й мелі нацыянальныя асаблівасьці.

Але стыль эпохі заўжды меў паходжаньне й месца свайго гадаваньня: клясыцызм гадаваўся ў Францыі, рамантызм — у Нямеччыне. І нат невялічкая краіна можа стацца заканадаўцаю сусьветных формаў (і мець ад гэтага неблагі эканамічны прыбытак!).

Старыя муры на межах сточваюцца, але краіны набываюць новыя межы — гэта хісткія межы вобразаў. І гэтыя межы паўсюдныя.

Сувэрэнітэт заўтра — гэта здольнасьць забясьпечыць экспансію сваіх культурных формаў у любым пункце зямной кулі.

Для гэтага *дастаткова* быць Беларусяй.

**Андрэй Расінскі**

# Менскі дызайн для маскоўскай Пятроўкі

**Дызайнэры — самая «прасунутая» частка грамадзтва. Іх творчы саюз наймаладзейшы ў Беларусі. Завяршыў працу чарговы зьезд Саюзу дызайнэраў. Трэці раз запар старшынём абраны Зьміцер Сурскі. Рэдкая трываласьць на пасадзе, калі параўнаць зь іншымі творчымі саюзамі. У чым сакрэт? І хто такія дызайнэры? Распавесьці нам пра гэта згадзіліся З.Сурскі і мастак Міхал Анемпадыстаў.**

**«НН»: Чаму мы ня ведаем імёнаў айчынных дызайнэраў?**

**Зьміцер Сурскі:** Дызайн выкінуты зь беларускага заканадаўства, ён не ахоўваецца законам пра аўтарскія правы. У пераліку відаў эканамічнае дзейнасьці таксама ня быў нават названы дызайн. Праз адсутнасьць крытыкі спажывец незнаёмы з працэсамі, што адбываюцца ў беларускім дызайне.

Тут ня варта зьневажаць людзей паспалітых. У параўнаньні з Эўропаю нашыя людзі апранаюцца, абстаўляюць свае кватэры, выбіраюць тэхніку ня горш. Да слова: паводле дадзеных салёну «Domus», Менск на другім месцы ў сьвеце па набыцьці кухань вядомых «Al Cuccino»!

**«НН»: Ці працуюць нашыя дызайнэры за мяжою і якія ў іх посьпехі?**

**М.А.:** Алена Кітаева з Андрэем Шалютам рабілі дызайн тэлекампаніяў НТВ, РТР, атрымлівалі ўзнагароды. Аляксандар Вугляніца дызайн тэлевізараў «Рубін» тамсама стварае.

**З.С.:** У Расеі можна зарабляць добрыя грошы, але й шмат грошай трэба аддаць. Падаткі плаціць, за студыю. Пётра Новікаў з Горадні ня першы год працуе ў Маскве. Пасьпяхова. Леў Агібалаў робіць вялікі праект па рэканструкцыі маскоўскай вуліцы Пятроўкі. Валеры Шагавік. Васіль Андрэеў туды ж падаўся. Аляксей Труфанаў. У Расеі просяць беларускіх дызайнэраў. А на Захадзе куды цяжэй прабіцца, там жорсткая карпаратыўная сыстэма, што не дапускае чужаніцаў.

> Дызайн галяндзкай фірме «Well» робяць тут, у Беларусі. Гэта замовы для «Gefesta», для лядовак «Stinol».




**«НН»: Што было зроблена за гады Вашага прэзыдэнцтва ў Саюзе дызайнэраў?**

**З.С.:** У мяне была такая канцэпцыя: калі нас не запрашаюць у прамысловасьць, то трэба пераканаць грамадзкасьць, што нашая прафэсія знаходзіцца ў кантэксьце культуры.

Першай акцыяй стаў збор калекцыі беларускага плякату й выпуск буклету. Дзякуючы Яроменку мы выдалі даведнік Беларускага саюзу дызайнэраў. Прыдбаўшы выдавецкі досьвед, мы прыйшлі да таго, што выдаём уласны часопіс «Pro Design». Наклад — 1200 асобнікаў. Ён распаўсюджваецца па Беларусі й у Маскве.

Нашым дызайнам цікавяцца швэды, немцы, ангельцы. Галяндзкая дызайн-фірма «Well», якая выконвае замовы для «Gefesta» і лядовак «Stinol», разьмяшчае ў Беларусі вытворчасьць прататыпаў, бо тут таньнейшая працоўная сіла. З кіраўніком прадстаўніцтва «Ikea» была размова на тую ж тэму. Яны вельмі зацікаўленыя ў прыцягненьні мясцовых вытворцаў. Гэта іх ідэалёгія.

**Гутарыў Сяргей Харэўскі**



**Сурскі Зьміцер**

**Нарадзіўся ў 1959 г. у Менску. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут у 1982 г. Ад 1995 г. прэзыдэнт Саюзу дызайнэраў. Працуе ў прамысловым дызайне, кніжнай графіцы, у плякаце. Мае 12 патэнтаў на вынаходкі й прамысловыя ўзоры. Сярод асноўных твораў: дзейная мадэль «Гарадзкі аўтамабіль», фірмовы стыль спартовага цэнтру «Волат», плякаты «Хлеб – усяму галава», «Эканомія ў быце», «Кадры решают всё».**

V зьезд Беларускага саюзу дызайнэраў выказаў занепакоенасьць станам аховы, кансэрвацыі і рэканструкцыі гістарычнага цэнтру Менску ў звароце да Нацыянальнага сходу. Дызайнэры лічаць неабходным спыніць знос старых будынкаў, а таксама будаўніцтва новых у гістарычным цэнтры, паколькі гэта супярэчыць міжнародным пагадненьням па ахове архітэктурнае спадчыны, падпісаным Беларусяй.

ТЭАТАР

# Налу пасярод дарогі

**Малая сцэна Купалаўскага тэатру пакарала прэм’еру «Налу».**

Спэктакль пастаўлены Ўладзімерам Шчэрбанем паводле п’есы Яны Русакевіч і Віталя Любецкага. Яна Русакевіч выконвае і галоўную жаночую ролю.

Любоў, шалёныя грошы, наркотыкі, забойства — 60 хвілінаў дзея разгортваецца проста пасярод дарогі з разьдзяляльнай паласой. Але цэласных жыцьцёвых пэрсанажаў ня выйшла. Гэта кампэнсуецца парай моцных выразаў і адной добрай мэтафарай: «Тваё сэрца пакрылася тэфлёнам — нішто не прыстае, нішто не прыгарае…».

Ратуюць спэктакль рэжысура і сцэнаграфія. Уладзімер Шчэрбань выціснуў з п’есы ўсё, што можна. Файныя «кінэматаграфічныя» ўстаўкі ствараюць у гледача ўражаньне кінапрагляду, а героям даюць магчымасьць «перакруціць», перайграць пэўныя моманты свайго жыцьця ва ўяўленьні. Рэжысэр і акторы адчыняюць перад гледачом сьвет хворай сьвядомасьці гераіні. Сьвядомасьці, якая поўніцца нібыта сьветлымі памкненьнямі, што праз апантанасьць і духоўную інфантыльнасьць прыводзяць да разбурэньня.

**Жанр:** скаўцкая мэлядрама.

**Каму глядзець:** студэнтам Акадэміі мастацтва з мэтай вывучэньня рэжысуры, а таксама школьнікам сярэдніх клясаў з выхаваўчымі мэтамі.

**Марыя Салаўёва**

# ОВТА прыйшла ў Беларусь

**У Менску прайшла Міжнародная школа-сэмінар «Беларуская гісторыя, мова і культура: паміж традыцыяй і ўнівэрсалізмам». У ліку навучэнцаў былі выкладчыкі беларускай мовы ў замежных унівэрсытэтах.**

**Факультатыў па беларускай мове маецца ў Карлавым унівэрсытэце ў Празе. Заняткі вядуць Яраслава Лоўдава** і **Ладзіслаў Янавец**. У Маскоўскім дзяржунівэрсытэце такім факультатывам кіруе **Кацярына Якушкіна**. **Зарана Гук** чытае беларускі спэцкурс у Львоўскім унівэрсытэце. Там штогод гэты спэцкурс выбіраюць 30—40 чалавек.

У школе-сэмінары займаліся 28 гісторыкаў і філёлягаў з рэгіёнаў, а таксама ЗША, Літвы, Польшчы, Расеі, Чэхіі, Украіны. Школа беларусістыкі працавала на грунце філфаку БДУ. Лекцыі чыталі дэкан Іван Роўда, прафэсаркі Ніна Мячкоўская і Алена Рудэнка; паэт Андрэй Хадановіч зладзіў творчую вечарыну. Навучэнцы зьезьдзілі на экскурсію па Менску, наведалі Мірскі замак, Строчыцы.

Працавалі ў школе беларусістыкі і польскія выкладчыкі на чале з прафэсарамі **Эльжбетай Смулковай** і **Ежы Аксарам** — дырэктарам Цэнтру дасьледаваньняў антычных традыцыяў (ОВТА) пры Варшаўскім унівэрсытэце. Менавіта ОВТА сталася арганізатарам школы з польскага боку.

**Вадзім Казначэеў**



Міндоўг
Ільля Галота
Мітрафан Доўнар-Запольскі
Аляксандар Цьвікевіч

**у новай «СПАДЧЫНЕ»**




**пытайцеся ў шапіках «Белсаюздруку» або замаўляйце праз «Кнігі — поштай»: (029) 643-57-33, exlibris@tut.by, п/с 333 220050 Менск**

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Анталёгія даўняй беларускай літаратуры XI — першай паловы XVIII ст.** / Ін-т літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі; Навук. рэд. В.Чамярыцкі. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 1015 с.

Самае поўнае навуковае выданьне. Напісаныя на царкоўнаславянскай, старажытнарускай і старабеларускай мовах творы падаюцца ў арыгінале, лацінамоўныя й польскамоўныя перакладзеныя па-беларуску.

**Арашонкава Г. Тлумачальны слоўнік адметнай лексыкі ў творах Якуба Коласа**. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 287 с. 1000 ас.

«Разводзіць балясы», «ісьці на ачосы», «вогеры», «блюма» і яшчэ каля 1800 выразаў і словаў сабрана і вытлумачана ў выданьні. У «Акадэмкнізе» слоўнік каштуе 4350 руб.

**Будзька І. Рэлігійны слоўнік старабеларускай мовы.** — Баранавічы, 2003. 260 с. 300 ас.

У слоўніку каля 4000 артыкулаў. На кожнае слова падаюцца этымалягічныя зьвесткі, сучасныя адпаведнікі, цытаты-ілюстрацыі зь пісьмовых крыніцаў XIV—XVIII ст.

**Весялкоўскі Ю. Рабы ў старажытным і сучасным сьвеце.** — Беласток—Лёндан, 2003. — 270 с.: іл. 200 ас.

Калі назвы разьдзелаў кшталту «Рабы ў Грэцыі» ды нават «Рабы ў Расеі» не зьдзіўляюць, дык ад «Рабоў у ВКЛ і Рэчы Паспалітай» робіцца трохі не па сабе. У кнізе мала ўвагі нададзена савецкай дзяржаве.

**Лёсік Я. 1921—1930 г.:** Збор твораў. — Менск: Логвінаў, 2003. — 396 с.: іл. 300 ас.

У гэты добра аформлены том увайшоў Лёсікаў праект правапісу ды яго публіцыстычныя й навуковыя артыкулы. У кнігу ня трапілі Лёсікавы падручнікі беларускай мовы, але складальнікі прапануюць электронныя вэрсіі гэтых выданьняў. Зьвяртайцеся ў ТБМ.

**Мы — беларусы** / Уклад. Т.Бондар**.** — Менск: Літаратура і мастацтва, 2003. — 232 с. 10000 ас.

Пад агульную вокладку заціснутыя М.Багдановіч і Э.Скобелеў, У.Караткевіч і П.Машэраў ды іншыя героі Беларусі савецкай і Беларусі беларускай. Цана 10 тыс. руб.

**Паміж: Крок ад мысьленьня, літаратуры, спакусы.** — Менск: Беларускі калегіюм, 2003. — № 3. 299 ас.

Апроч творчасьці калегіюмцаў у часопісе месьціцца гутарка з У.Абушэнкам пра інтэлектуальнае поле беларускай культуры ды ролю інтэлектуала ў культурнай самаідэнтыфікацыі. Пераклады вылучаныя ў асобны разьдзел — «Кішэнная Эўропа». Сюды ўвайшлі тэксты Д.Кіша, С.Бараньчака, Т.Бэрнхарда, Ю.Іздрыка, Т.Прахаські, Л.Калакоўскага. Пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў.

**Сродкі масавай інфармацыі і прэс-службы: Беларусь-2003** / ГА «БАЖ»; Уклад. І.Урбановіч-Саўка. — Менск: Медысонт, 2003. — 127 с. 4000 ас.

**Аграрные преобразования в Молодечненской области 1944—1953 г.: Документы** / Нац. Архив Респ. Беларусь; Сост. Н.Бондаренко и др. — Минск, 2003. — 438 с. 100 ас.

Пастановы СНК і райкамаў, выступы сакратароў розных рангаў дазваляюць прасачыць, як ішла калектывізацыя ў асобна ўзятай вобласьці.

**Быков В. Болото. Волчья яма. Стужа** / Пер. с бел. автора; Предисл. Р.Барадулина. — Минск: Книга, 2003. — 384 с. 5000 ас.

**Тацяна Вабішчэвіч**

Уладзімер Арлоў

# Крыжы



**Уладзімер Арлоў — пісьменьнік, гісторык. Ягоныя апошнія кнігі — «Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя» і зборнік эсэ «Адкусі галаву вароне».**

## Вужград

Здаецца, Поль Мішэль Фуко заўважыў, што падарожжа старыць стаўленьне да сябе, але маладзіць рэчы.

Ты зусім ня ўпэўнены наконт першага. А рэчы ў гэтай сэнтэнцыі замяніў бы на ўспаміны, якія любая твая вандроўка вызваляе сваімі вятрамі ад попелу забыцьця, каб зацягнуць цябе ў вір, дзе вастрэюць адчуваньні, бліскаюць новыя сюжэты й мроіцца, што паваротка дарогі можа стаць пераменаю самога лёсу...

Не пасьпявае аўтобус спыніцца на першым вужградзкім сьвятлафоры, як ты апынаешся ў зацішнай кавярні зь відам на сярэднявечны замак. Яго амаль затуляюць крутыя плечы таксіста, зь якім цябе, маладога беларускага літаратара, знаёміць з захаваньнем, відаць, усіх правілаў шпіёнскай канспірацыі. Бо насамрэч гэта не таксіст, а біскуп забароненай і загнанай у падпольле Ўкраінскай грэка-каталіцкай царквы.

«Таксіст» настолькі таленавіта ўжыўся ў сваю афіцыйную ролю, што табе не адразу ўдаецца настроіцца на ўспрыманьне яго праўдзівае іпастасі. Дапамагае маладое віно, што ўладыка п'е зь ня меншай за цябе асалодай і ў працэсе пачосткі пачынае ўсё больш нагадваць рэдактара твайго першай, яшчэ нявыдадзенай кніжкі Міхася Стральцова, які ўжо ня п'е нічога мацнейшага за мінэралку, але зь якім гэтаксама цікава маўчаць, адчуваючы ўдзячнасьць за чамусьці даверанаю мэтрам менавіта табе сваю мужчынскую таямніцу, магчыма, апошнюю ў ягоным жыцьці, дзе лік ідзе ўжо на месяцы...

## Берагава

На скрыжаваньні вока схоплівае паказальнік на Берагава. Ты заплюшчваешся і праз хвілю ідзеш старадаўнімі вулачкамі закарпацкага гарадка, што насамрэч завецца, калі не памыляешся, Бэрэгсаш, бо ён не ўкраінскі, а спрэс вугорскі — абліччам і моваю жыхароў, архітэктурай, шыльдамі, утульным — на чалавечы рост — помнікам Шандару Пэцёфі на маленькім пляцы.

Гадоў дваццаць таму цябе зноў і зноў прыводзілі сюды твае авантурныя шляхі — найперш дзеля выразнай несавецкасьці гэтае багаслаўёнай мясьціны, што заўсёды надавала фізычнай й душэўнай трывушчасьці да наступнага прыезду.

Паблізу пляцу з помнікам Пэцёфі ў добрыя старыя часы Габсбургаў і пазьней знаходзілася вельмі прыстойная, паводле водгукаў яшчэ жывых наведнікаў, установа з густоўным чырвоным ліхтаром на ўваходзе, якую язык не паварочваўся назваць ні выляжальняй, ні бардэлем, ні нават публічным домам. У часы твайго юнацтва там, на жаль, месьціўся ўжо райаддзел міліцыі, дзе працаваў твой гаспадар Шандар, або Шоні бачы — дзядзька Шоні, прыгарадны дом якога быў канцавым пунктам тваіх закарпацкіх экспэдыцыяў.

Тады яшчэ жыў Шандараў бацька, Шоні-старэйшы, які сустрэў цябе варожа, а потым палюбіў за тое, што ты, як і ён, не гаварыў па-расейску, але пры тым неяк разумеў ягоную ўкраінска-вугорскую трасянку. Ён загадаў сыну нічога для цябе не шкадаваць і нават дазволіў табе самому спускацца ў вінніцу.

Шоні-бацька таксама нагадваў Міхася Стральцова, бо любіў шматслойна й шматзначна маўчаць, выцадзіўшы перад гэтым шклянку віна, празь якую спачатку абавязкова трэба было зірнуць на сонца, што радасна купалася ў рубінавым хмелі. Віно рабіла Шоневы вочы яснымі й празрыстымі, і ён углядаўся ў мінулае, калі пад пароклай шыпшыннай і ажынамі гарой сустракаўся з сваёй Ёланкай, калі, рыхтуючыся да вясельля, употай ад бацькоў і каханай Ёланкі з мэтаю набыцьця неабходнага досьведу наведваў дом з чырвоным ліхтаром, а потым быў прызваны ў вугорскую армію й геройна ваяваў кулямётчыкам пад Сталінградам, за што атрымаў два мэдалі.

Ты пазіраў на ласкавае восеньскае сонца праз сваю шклянку і ўспамінаў свайго бацьку, які таксама атрымаў за Сталінград два баявыя мэдалі, і думаў, што каб ён дажыў да гэтых дзён, дык не адмовіўся б выпіць з Шоні за тое, што яны не застрэлілі адзін аднаго там, на чужых для абодвух берагах Волгі, а тады са смакам закусіў бы вэнджаным вугорскім салам з папрыкай.

## Трансыльванія

Прахапіўшыся, ты ня кінеш позірку ў акно, каб паводле надзейнай бабулінай парады сьцерці з памяці нісянеціцу сьненьня, бо хочаш, каб сёньняшні сон праявіўся ва ўсёй сваёй выразнасьці й шматфарбнасьці.

Ты стаяў перад дзіўным дрэвам: адны ягоныя галіны шамацелі густой лістотаю, на другіх сьпелі слуцкія бэры, на трэціх красавалі кветкі-«завушніцы», або, як іх яшчэ называюць, «разьбітае сэрца», вунь на той галіне сьпявалі птушкі, на гэтай уладкаваўся цэлы партызанскі атрад і пара рыцараў у поўным рыштунку, а на тую выйшлі шчыльнымі радамі й расьселіся, зьвесіўшы ногі ды хвасты, збольшага знаёмыя істоты, напэўна — дамавікі, лесавікі й хохлікі... Некаторыя галіны толькі пачыналі распускацца ці запаўняцца нейкімі дзівоснымі стварэньнямі, а некаторыя — былі непрыкаяна голыя й самотна зыбаліся пад ветрам. Ты стаяў перад дрэвам, нейкі голас падказваў табе, што гэта — дрэва беларускага прыгожага пісьменства, і ўжо там, у сьне, ты прасякаўся глыбокай асабістай адказнасьцю за росквіт роднае літаратуры, за яе непрытульна голае вецьце, за неасвоеныя жанры, формы й тэмы...

«Пракруціўшы» сон, ты нарэшце дазваляеш сабе вызірнуць у акно і высьвятляеш, што твой аўтобус коціцца па Трансыльваніі, або, па-нашаму, Залесьсі, дзе калісьці княжыў Іштван Батары, а па-нашаму — Сьцяпан Батура, што калісьці адначасна быў і вялікім князем тваіх продкаў-ліцьвінаў.

Недзе тут, сярод зялёных спадзістых пагоркаў, прыйшоў на сьвет Батураў супернік, а затым сябар і хаўрусьнік Каспар Бэкеш, што праславіўся як ваявода, адбіваючы ў Інфлянцкую вайну ў маскоўцаў Полацак, а яшчэ болей — як мысьляр, што не вызнаваў аніякай рэлігіі, у выніку чаго пасьля ягонае сьмерці ў Гордні ні касьцёл, ні царква не далі дазволу хаваць велікакняскага паплечніка на сваіх могілках. Прадбачачы гэткую нявыкрутку, Бэкеш загадзя паклапаціўся пра сваю эпітафію («...не баюся пекла, не турбуюся пра Божы суд...»), зь якой яго й пахавалі на стромым беразе Вільні ў вашай тагачаснай сталіцы.

Яшчэ больш складаныя дачыненьні з Богам меў народжаны ў Трансыльваніі твой вясёлы румынскі аднаймяньнік Улад Дракула, згадка пра якога адразу робіць больш акрэсьленым твой намер азеляніць якую-небудзь голую галіну айчыннай літаратуры.

> Леваруч — сьцяна вышынёю на паўкілямэтра, справа — такой самай глыбіні кювэт, дно якога разнастаяць цацачныя парэшткі аўтобусаў.

Ты напішаш мастацкі твор пра беларускіх вампіраў. Менавіта пра беларускіх — нацыянальна-арыентаваных, сьвядомых прыхільнікаў дзяржаўнага сувэрэнітэту Бацькаўшчыны, якія, у прыватнасьці, адназначна супраць увядзеньня ў якасьці валюты расейскага рубля. Гэта ўжо другое пакаленьне незалежнікаў. Яны вырасьлі ў беларускіх сем'ях і таму маюць адметныя імёны — Рагнеда, Усяслаў, Францішак, магчыма, Караліна... Героі знаходзяць адзін аднаго яшчэ ў студэнцкія гады. Ствараюць і рэгіструюць суполку ТБМ, а затым, па меры сталеньня, і БНФ. Акуратна сплачваюць складкі, падтрымліваюць беларускую прэсу, бяруць удзел у акцыях. Адна з гераіняў працуе на станцыі пераліваньня крыві, яе сябар — у навукова-дасьледчым інстытуце гематалёгіі. Якраз яму шчасьціць зрабіць адкрыцьцё: іхні ўкус, аказваецца, перадае ня толькі своеасаблівую бацылу вампірызму (якую, зрэшты, нескладана заблякаваць, каб папуляцыя не набыла пагрозьлівых памераў, што замінала б задавальненьню элемэнтарных вампірскіх патрэбаў). Адначасова ўкус прышчапляе, так бы мовіць, паддосьледным беларускую нацыянальную сьвядомасьць. Адкрыцьцё пераварочвае аднастайнае існаваньне суполкі, што разумее, які неацэнны дарожак яна можа ўнесьці ў сьвятую справу вяртаньня роднае да болю краіны ў Эўропу. Пасьля чарговае акцыі апазыцыі грацыёзная супрацоўніца станцыі пераліваньня крыві выбірае першы аб'ект — бамбізупалкоўніка, што кіраваў жорсткім разгонам дэманстрантаў, і завабліве яго ў ціхі менскі дворык, дзе ў альтанцы чакае ўся дружная суполка. Астатняе — справа тэхнікі...

## Вужыцы

На трэці дзень дарогі ты прачынаешся ў сэрбскім горадзе Вужыцы. Выбіраючыся з гатэльнага нумару, падобнага да бункеру, уражана прыкідваеш, наколькі шырока разьлёгся славянскі сьвет. Ты сумняешся, радавацца з гэтае прычыны ці засмучацца, бо тут, як і дзе-небудзь у братнім Тамбове, карміць гасьцей сьняданкам у гатэлях яшчэ не заазвычаена. Але кава ў знойдзенай кавярні сапраўдная, а пададзеная да яе «палачынкі» — гэта ня што іншае, як апетыя некалі Ўладзіславам Сыракомлем родныя налісьнікі. Ты разьнявольваешся, цікавішся тутэйшым чырвоненькім і ані не прадчуваеш, што чакае цябе на апошнім кавалку шляху па гэтай неабдымнай Славяншчыне, пакуль не неўтаймоўнага поступу ня спыніць Адрыятычнае мора.

Ужо праз гадзіну ты адчуваеш пэрыядычныя прылівы адрэналіну, разам зь якімі з глыбіняў страўніка пагрозьлівай хваляй падымаецца кава з налісьнікамі. Аўтобус нават не паўзе, а караскаецца па сэрпантыне. Леваруч — стромая сьцяна вышынёю на паўкілямэтра, справа — такой самай глыбіні кювэт, дно якога сям-там разнастаяць цацачныя парэшткі прыкладна такіх, як твой, аўтобусаў. Суцэльныя скалы, да якіх лепіцца вузенькая шаша, час ад часу ажыўляюць гранітныя й мармуровыя пліты — помнікі тым, хто ўжо прыехаў. Цалкам адпавядаюць мэмарыяльным знакам і знакі дарожныя — тлустая кропка ў трохкутніку.

Чамусьці менавіта гэты знак, які ты ўспрымаеш найперш як бясконца знаёмы й блізкі табе знак прыпынку, утаймоўвае шторм у страўніку і настройвае цябе на філязофскі лад. Ты думаеш, што ўсе вы, ня толькі пасажыры аўтобуса, а наагул усе, яшчэ жывыя, — разам з сваімі перамогамі й паразамі, каханьнямі й здрадамі, марамі пра іншую Беларусь і марамі зваліць куды-небудзь ад яе далей — усе вы навечна, як мушкі ў бурштыне, закутыя ў гэтым стагодзьдзі. Пэўнасьць надае бадзёрасьці й аптымізму. Іншая рэч, што табе ані ня хочацца раптоўнае сьмерці — ні за пісьмовым сталом, ні пад коўдраю ва ўласнай спальні. Цябе зусім ня вабіць і фінал, што напаткаў правадыра гунаў Атылу, цела якога разлучылася з душою ў абдымках жанчыны.

Ты згодны з тым, хто вынайшаў панятак «ars mariendi» — мастацтва паміраць. Ты лічыш, што шчасьлівы той творца, які мае магчымасьць дарэшты выканаць свой прафэсійны абавязак, стварыўшы сюжэт уласнага сыходу, гэтае неардынарнае падзеі, што здараецца толькі раз у жыцьці і таму мае падставы лічыцца ў нейкім сэнсе сьвятам. Гэта не азначае да канца трываць пакуты. Можна, напрыклад, памерці ў дзень свайго нараджэньня, як зрабіў Валенці Ваньковіч, або ўчыніць нешта яшчэ больш арыгінальнае, такое, каб па табе ня толькі заплакалі, але й засьмяяліся, усьвядоміўшы, што і да сьмерці, як да ўсяго на сьвеце, трэба ставіцца з гумарам і што найлепей ушанаваць памяць нябожчыкаў можна адно паўнатою свайго ўласнага жыцьця.

## Адамчык

На вышыні тысячы мэтраў над роўнем мора ты амаль з асалодаю чытаеш дзёньнік Вячаслава Адамчыка. Табе робіцца нечакана ўтульна з гэтай, такой беларускай, душой, зь яе ўзьлётамі й незьнішчальнымі комплексамі, з замілаванасьцю дрэвамі й птушкамі й успышкамі інфэрнальнае нялюбасьці да людзей, з вусьцішным прадчуваньнем хуткага скону, зь фізычным болем і непараўнальна страшнейшым болем душы, якой перакрываюць неабходнае для жыцьця беларускае паветра...

Ты гатовы падпісацца пад Адамчыкавым партрэтам аднаго зь сяброў Рады Саюзу пісьменьнікаў, самазадаволенага вепрука, зь якім лёс зьвёў цябе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Ты, яшчэ ня звольнены «за выпуск исторической и другой сомнительной литературы», рэдагаваў том паэзіі, а вяпрук быў укладальнікам. І ты злаві яго на тым, што ён ня толькі не адчуе паэзіі, але й панапісваў пад капірку біяграфічныя даведкі, якія ты прымусіў яго перарабіць, дадаўшы хоць каліва творчасьці, за што ён, парохкваючы ў сваім дзяржаўным катуху, ціха помсьціўся табе ўсё наступнае дзесяцігодзьдзе.

Апошнія два гады ты жыў, па сутнасьці, у адным з Адамчыкам двары і штомесяц ставіў свой подпіс побач зь ягоным, атрымліваючы да запатрабаваньня ў аддзяленьні сувязі «Иностранную литературу», якую невядомыя інтэлектуалы заўзята выцягвалі з вашых паштовых скрынак. Але ў вас зь Вячаславам Уладзімеравічам былі розныя сьцежкі, і ты толькі адзін раз пагаварыў зь ім, падзякаваўшы за апавяданьне «Леанарда».

Нехта з пакрыўджаных чытачоў дзёньнікавых запісаў Адамчыка назваў яго мізантропам, аднак ты, ужо бачачы на далягладзе й далёка ўнізе мора, ведаеш, што адораны магутным талентам мізантроп для цябе пераважыць безьліч чалавекалюбных пасрэднасьцяў.

## Авечкі й козы

Шукаць гістарычныя аналёгіі Чарнагоры (вядомай неславянскаму сьвету як Мантэнэгра) з тваёй краінай — рэч рызыкоўная. Хіба што ў вас не было татарскага прыгнёту, а чарнагорцы калі й былі нейкі час пад туркамі, усё адно захоўвалі аўтаномію.

У найноўшыя ж часы Чарнагорыя ня плішчылася ў яшчэ шчыльнейшы саюз з «старэйшай сястрой» Сэрбіяй, а наадварот — усяляк адпаўзала ад яе, і ўрэшце ўвяла замест дынара нямецкую марку, а затым эўра.

Чарнагорскія гарады выглядаюць сьветлымі й вясёлымі, асабліва ў параўнаньні з сэрбскімі (найбольш панурым і пригнобленым табе падасца Бялград). Рэч ня столькі ў разбураных натаўскімі бомбамі будынках, якіх даволі няшмат, колькі ў агульным настроі людзей, бо бомбы сыпаліся на галовы ўсім сэрбам, незалежна ад стаўленьня да рэжыму Мілошавіча.

Чарнагорыі не бамбілі, і гэта надае яе жыхарам упэўненасьці й самапавагі. Нават авечкі ды козы, гледзячы на гаспадароў, трымаюцца тут з большай годнасьцю, чым у Сэрбіі.

## Сябар Мілошавіча

Маладая экскурсаводка паведамляе, што адзіным, хто адкрыта падтрымліваў палітыку Слабадана Мілошавіча, быў прэзыдэнт тваёй краіны. Твар у дзяўчыны абсалютна непранікліва, і ты ня можаш здагадацца пра яе асабістае стаўленьне да згаданага факту.

Пасьля кароткай пяпэрвы экскурсаводка дадае: «Сейчас деятельность Милошевича на посту главы государства является предметом рассмотрения Гаагского международного трибунала».

## Мора

Простае чалавечае шчасьце — прыйсьці ў сьпёку на марскі бераг. Але хвалі сёньня вышэйшыя за твой рост. Калі хочаш паплаваць, галоўная праблема — увайсьці ў гэтую пенлівую стыхію, а потым выбавіцца зь яе, бо хвалі сьпярша не пускаюць у мора, а пасьля, адчуўшы сваю ўладу, не выпускаюць на бераг. Найлепей нырцануць у хвалю, адплысьці ад паласы прыбою і, супакоіўшы дыханьне, гайдацца на аквамарынавых валах, гледзячы

# Мантэнэгра

на крануты лазуркавай смугою горны хрыбет і разважаючы пра тое, што твайму народу не стае ня толькі выйсьця да мора, але і выйсьця да неба — гораў.

Аднак усё гэта — тэорыя. Пакуль што ты сядзіш на гарачых чорных камянях і назіраеш, як у мора заходзіць юнак зь дзяўчынай. Стоячы тварам да пляжу, яны дурэюць, пырскаюцца, сьмяюцца, ня бачачы, як да іх ціха падкрадаецца неверагодна прыгожая смарагдавая хваля. Яна ўміг вока закіпае, зь невераемнай лёгкасьцю валіць шчасьлівую парачку з ног, валачэ яе на бераг і таксама імкліва адкочваецца. Хлопец ускоквае на ногі, а дзяўчына застаецца бездапаможна ляжаць. Ён адцягвае сяброўку далей, перагінае танклявае загарэлае цела, і з роту ў дзяўчыны б'е фантан вады. Купальніца зь цяжкасьцю выпростваецца, зьняможана сядае на пляскатыя камяні...

Зараз ты можаш уявіць, як гэтае, самае цёплае й ласкавае, самае чыстае ў тваім вандроўным жыцьці мора на такой вось, да калена, глыбіні забрала жыцьцё твайго колішняга суседа па Серабранцы Міколы Селешчука, мастака з заўсёдна затоенай ў нібыта вясёлых вачах тугою. Зачаравана гледзячы на хвалі, ты ўяўляеш, як Мікола гушкаўся на іх, адно ня тут, а на італійскім беразе, і гульня фантазіі не палохае цябе, а толькі мацней вабіць да небясьпекі. Ты разганяешся па ўтрамбаваным прыбоем жвіры, даеш нырца ў высачэзную хвалю, усплываеш на глыбіні, павялічваеш адлегласьць ад берагу мэтраў да ста і гушкаешся хвіліну, пяць, дзесяць. Узьлятаеш, падаеш, апынаешся паміж двума рухомымі зялёнымі мурамі, з радасным замiраньнем сэрца зноў узьлятаеш... І тады зьнячэўку цябе апаноўвае дзікі страх: а раптам схібіш, не затоіш, калі трэба, дыханьня, не ўпільнуеш моманту, дасі хвалі пракаціцца церазь цябе, забіць вадой лёгкія... Ты ліхаманкава плывеш да берагу, ды страх — дрэнны хаўрусьнік, і хваля ўсё ж накрывае цябе. Глытаеш салёную ваду, задыхаешся, аднак бераг ужо пад нагамі, і прязь дзесяць крокаў ты расьцягваешся на цёплым ручніку, яшчэ лепш разумеючы, як адляцела ў вырай таленавітая Міколава душа.

Ёсьць меркаваньне, што літаратуру ад бэлетрыстыкі адрозьнівае наяўнасьць мэтафізыкі. Магчыма, такі крытэр вызначэньня «сапраўднасьці» можа прэтэндаваць на ўнівэрсальнасьць. У творах Міколы Селешчука мэтафізыка заўсёды прысутнічала. Не абышлося безь яе і ў ягонай сьмерці: кажуць, гэта здарылася назаўтра пасьля паездкі ў Рым, дзе Міколя марыў пабыць ад самага дзяцінства.

## Брук

Чарнагорскі Котар, вядомы ўжо дваццаць тры стагодзьдзі, найбольш уразіць цябе не затокай, самым паўднёвым у Эўропе ф'ёрдам, які Бэрнард Шоў назваў найпрыгажэйшым кутком сьвету; не тысячагадовым саборам Трыфана з адсечанай галавой сьвятога ў срэбнай рацы; не тэатрам, дзе колькі вечароў бавіў Напалеон Банапарт.

Наймацней цябе ўразіць тутэйшы гарадзкі брук — то крэмавы, то вясёлкавы, то бельчырвона-белы. Высьлізганы да амаль люстранога бляску (па ім, напэўна, можна катацца, нібы па лядовых дарожках-коўзанках), ён грэе, робіць стамлёныя ногі сьвежымі і пругкімі, запрашае зьняць красоўкі і пахадзіць па ім басанож. Сваю жыцьцядайную энэргію ён перадае нават табе, чужынцу, — каб ты, няхай на гадзіну, пачуўся тут сваім, адказным за неверагодную чысьціню й спакой, за рэнэсансавыя, гатычныя й барокавыя фасады, за старасьвецкія аканіцы, за якімі хаваюцца сучасныя плястыкавыя вокны, за мову, якой гавораць цёмнавалосыя смуглявыя дзеці...

Пабыўшы ў Котары, ты разумееш, чаму ў тваім дзяцінстве й юнацтве ў Менску, Полацку, Віцебску ішло зацятае змаганьне з бруквам, які зразалі бульдозэрамі або закатвалі пад асфальт. Табе цікава, якую энэргію будзе выпраменьваць той штучны брук, што цяпер похапкам кладуць паўсюль ад тваёй сталіцы да Пружанаў.

## Ціхае кананьне кірыліцы

У котарскай кнігарні зьвяртаеш увагу на падручнікі «Вучым лацінку». Ты зьдзіўляешся, бо ніводнага надпісу на кірыліцы — ні ў рэкляме, ні ў мэню кавярні, ні ў графіці — ты так і не сустрэў. Абсалютная большасьць кніжак — таксама на лацінцы. Кірыліца ціха канае ўва ўсёй Чарнагорыі. Лацінка ўжо дамінуе і ў Сэрбіі. Пасьлядоўна трымаюцца за кірыліцу, гэтаксама як і за юліянскі каляндар, адно праваслаўныя манастыры й храмы.



Ты ня хочаш шпурляць камяні ў кірыліцу, на якой сам пішаш і чытаеш пакуль што ўдвая хутчэй, але ўся лёгіка развіцьця эўрапейскай цывілізацыі падводзіць да думкі, што чарнагорская сытуацыя некалі паўторыцца на тваёй радзіме, дзе зьявяцца цалкам афіцыйныя падручнікі ды кнігі ў той графіцы, якой пісалі й друкаваліся вашы першыя клясыкі.

## Крыжы

Крыжы на чарнагорскіх цэрквах вельмі часта — не вэртыкальныя, а гарызантальныя, раўналежныя зямлі. Магчыма, проста таму, што вэртыкальныя лініі ў горнай краіне і без таго маюць яўную перавагу і воку хочацца ад іх адпачыць. А магчыма, чарнагорцы прыдумалі гарызантальныя крыжы, каб душам з вышыні іх палёту лацьвей было пазнаваць свае храмы.

## Выспа сьвятога Стэфана

Гэтая шырока разрэкламаваная адзіная ў сьвеце выспа-гатэль запомніцца табе не нумарамі, дзе раскашавалі Сафі Ларэн і Сыльвэстар Сталонэ, а кветкамі магноліі, што нечакана запахлі цынамонам і цёплымі мамінымі булачкамі-птушкамі. Ты, малы, прагна зьядаў булачку або дзьве, а ў астатніх употай выкалупваў самае смачнае — вочкі-разынкі, пасьля чаго абліваўся горкімі сьлязьмі, шкадуючы гаротных птушачак, якія праз тваю прагавітасьць зрабіліся невідушчымі.

## Тата і мама

Чарнагорская малеча, лётаючы па пляжы, гукае: «Тата! Тата!» Тату, як выглядае, тут клічуць значна часьцей за маму, і ў гэтым таксама выяўляецца нацыянальны характар.

Ты згадваеш, як у вас дзе-небудзь на Нарачы зарумзанае, чырвонае ад няспыннага крыку дзіця разьдзіраецца: «Мама! Ма-ма!» Праўда, у гэтай апэляцыі да жанчыны можна ўбачыць і неўсьвядомленую даніну ўдзячнасьці беларусаў сваім прапра...бабулям, пачынаючы ад Рагнеды. Дапусьцім, што ў тую ўвекавечаную летапісцамі ноч Рагвалодавай дачцэ не хапіла б сьмеласьці ўзьняць руку зь мечам над заснулым Уладзімерам. Рагнеду з князевічам Ізяславам ня выслалі б з Кіева на радзіму. Ізяслаў не вярнуўся б на дзедаў полацкі пасад. Полацак не аднавіў бы незалежнасьці... Ці была б сёньня на палітычнай мапе сьвету краіна з назваю Беларусь?..

## Стойкавічы, Чмутовічы, Прайдзісьветавічы

Чарнагорцы, як і твае суайчыньнікі, — розьныя, што, безумоўна, упрыгожвае іхнюю краіну.

Сямідзесяцігадовы Пэтар Стойкавіч, уладальнік маёнтку на беразе Каторскай затокі, за сваім гасьцінным сталом прызнаецца табе, што больш за ўсё на сьвеце любіць віно і жанчын. Віна ён спажывае ў сярэднім чатыры літры за дзень. Колькасьць жанчын не ўдакладняецца.

Міра Куч, гаспадар твайго прыморскага гатэлю, — чалавек іншага складу й мае свае прыярытэты.

Падобны да ката Базыліё зь фільму пра Бураціна, Міра цэлы дзень сядзіць на мармуровай тэрасе трэцяга паверху з кубачкам кавы й калькулятарам. Цябе ён ведае лепей за ўсіх пастаяльцаў, бо ты вычытаў у рэклямным праспэкціку пра басэйн на гатэльным даху і наважыў купацца там перад сьняданкам і пасьля вячэры, калі ў моры ня вельмі ўтульна.

> Ты напішаш пра беларускіх вампіраў. Менавіта беларускіх — нацыянальна-арыентаваных, сьвядомых прыхільнікаў дзяржаўнага сувэрэнітэту Бацькаўшчыны, якія, у прыватнасьці, адназначна супраць увядзеньня ў якасьці валюты расейскага рубля.

У першы дзень басэйн выдае на вясковую калюжыну, дзе купаюцца гусі. Міра ўсьміхаецца ад вуха да вуха: заўтра ваду памяняюць і ўсё будзе «добра». Назаўтра ты бачыш відавочны прагрэс: басэйн сухі, як выпітая ўчора пляшка. Гаспадар дорыць табе ўсьмешку й цікавіцца, навошта табе басэйн, калі перад табой мора, у якое ты, маючы спрыт, можаш скочыць проста з тэрасы. Эфэкт дасягнуты: плаваючы ў чыстым і спакойным сёньня моры, пачынаеш думаць, што, ня выключана, ты напраўду вычварэнец. Але ўначы ўсходжваецца шторм, мора жаўцее, быццам нехта велізарны нястомна месіць на дне гліну, і ты, абгарнуўшыся ручніком, зноў кіруешся на дах.

На дне басэйну чайкі дзяўбуць укамянелы кавалак піцы. Апярэджваючы тваё пытаньне, Міра як добраму сябру ціісьне руку і тлумачыць, што ваду наліюць, як толькі мора стане празрыстым.

Ужо тым самым адвячоркам хвалі пазбаўляюцца брыдкага жаўтлявага колеру, афарбоўваючыся ў размаітыя адценьні сіняга й зялёнага, але ты дзеля пэўнасьці дачакаўся наступнага вечара. Замест звыклай кавы перад Мірам стаяць два кілішкі ракіі. Гаспадар праводзіць цябе адкрытым прыязным позіркам чалавека з чыстым сумленьнем і праз хвіліну такім самым позіркам сустракае. Ён працягвае табе кілішак: «Дарагой, басэна для бальных, а для тэбя — морэ».

Галоўны ж сюрпрыз Міра Куч рыхтуе на разьвітаньне. У дзень ад'езду ты чамусьці ня можаш забраць у адміністратаркі свой пашпарт. Ты не самотны: каля стойкі раз-пораз закіпаюць жарсьці. Гаспадара на тэрасе няма, ён заслужыў адпачынак пасьля начных клопатаў. Уначы Міра высачыў дзьвюх дзяўчатак, якія натхнёна маркітаваліся ў сваім нумары з гарачымі чарнагорскімі хлапцамі і, расслабіўшыся перад ад'ездам, забыліся замкнуць дзьверы. Славіўшы юравабную кампанію на гарачым, Міра Куч запатрабаваў ад кожнае парачкі па 30 эўра. Чарнагорцы надзелі штаны і, пакруціўшы пальцам каля скроні, падаліся дахаты. Дзяўчаты палічылі гаспадарова патрабаваньне дрэнным жартам і, дапіўшы віно, пакладіся спаць.

Ды Міра Куч ня любіць жартаваць. Выспаўшыся й сабраўшы пастаяльцаў, ён абвяшчае, што ніхто з тых, хто зараз ад'яжджае, ня ўбачыць сваіх пашпартоў, пакуль ён, Міра, не атрымае сваіх законных 60 эўра. Перамоўны працэс завяршаецца тым, што табе і іншым пашпарты вяртаюць за так, а юныя віноўніцы ўсяго вэрхалу пагаджаюцца па чарзе «сур'ёзна пагаварыць» зь Мірам тэт-а-тэт. Мэханічна засякаеш час: кожная «размова» доўжыцца па 30 хвілінаў.

## Мурын

І ў Гішпаніі, і ў Тунісе, і ў Парыжы, і тут, у Мантэнэгра, ты почасту ўспамінаеш маміну сястру, а тваю цётку Вольгу, якая за ўвесь свой васьмідзесяцігадовы век не была нідзе далей за добра вядомыя ў тваіх шыротах Копысь ды Шклоў. Ці не адзіным сьведчаньнем таго, што сьвет нязьмерна велічэзнейшы й шматстайнейшы, для цёткі Вольгі стаў студэнт Горацкай сельгасакадэміі, мурын, што заявіўся ўлетку да аднакурсьніцы ў вёску, ледзь не на сьмерць улякнуўшы маці сваёй каханай.

## Шклоў

Шклоўская тэма неспадзявана атрымлівае працяг, калі на праходцы ты заўважаеш на нейкіх дзьвярах шыльдачку з прозьвішчам гаспадара — Неранчыч. Вельмі верагодна, што тут жыве далёкі сваяк таго сэрба Неранчыча, што пакінуў яскравы след у гісторыі тваёй краіны, дзе вядомы як Сямён Зорыч — адстаўны кацярынінскі фаварыт, якому шчадралюбная царыца падаравала «прырэзаны» да імпэрыі Шклоў.

Ты выбіраеш у кавярні столік з выглядам на мора, замаўляеш келіх «Вранцу» і думаеш, што ёсьць на сьвеце гарады, якія ўзгадоўваюць асьветнікаў, рыцараў, мастакоў, а ёсьць іншыя — якім цягам стагодзьдзяў наканавана нараджаць або акумуляваць зладзеяў, самазванцаў ды авантурыстаў.

Ты зусім ня ўзгадваеш усім вядомай асобы. На адсутнасьць славы з сумнеўным адценьнем Шклоў ня мог паскардзіцца з часоў ВКЛ. Непрыкметным шклоўскім настаўнікам быў (пакуль ня ўспомніў, што ён — недарэзаны сынуля Івана Жахлівага) знакаміты Лжэдзьміты II. У сярэдзіне наступнага стагодзьдзя Шкловам валодаў князь Адам Чартарыйскі, які праславіўся там такімі маштабнымі фінансавымі махінацыямі, што ад рыштту яго ўратавала толькі магутная рука ў расейскай сталіцы.

Нарэшце надышоў час да графа Зорыча...

Неяк праз графскія ўладаньні ехаў даўні зласьлівец Зорыча князь Пацёмкін. Адзін з найсумленнейшых шклоўскіх жыхароў, імя якога — Давід Мойшавіч — захавалі гістарычныя крыніцы, папрасіўся да яго міласьці на аўдыенцыю і зь сьлязьмі ад чыненай вакол несправядлівасьці прадэманстраваў пецярбурскаму госьцю атрыманыя ў шклоўскага ўладара фальшывыя сто рублёў. Пацёмкін задаволена пацёр рукі й прызначыў сьледчую камісію. На допытах шклоўская намэнклятура пачала «калоцца». Выявілася, што нядаўна да Зорыча прыбылі з гістарычнай радзімы дарагія госьці з багажом у выглядзе набытага ў Брусэлі друкарскага варштату. Канчаткова здаў усіх прыдворны карлік лёкай Лукашка — прызнаўся, што ня раз бачыў у графскіх пакоях скрыні, дзе пад калодамі картаў схаваныя пачкі навюткіх асыгнацыяў...

На ўсялякі выпадак ты вырашаеш запіць свой гістарычны экскурс яшчэ адным келіхам густога як кроў «Вранцу».

## Знайсьці чалавека

На мяжы Сэрбіі й Румыніі памежніца-сэрбка старанна й трохі зьдзіўлена чытае ўголас імёны ды прозьвішчы тваіх спадарожнікаў: «А-ле-на! Я-у-хэн! У-ла-дзі-мер!»

«Почему не Владимир?» — цікавіцца памежніца. «Это по-белорусски», — прабачліва тлумачыць супрацоўніца турфірмы.

«Напридумывали! — гучна абураецца жанчына-псыхатэрапэўтка зь Менску. — Имена изменили без спроса, фамилии изуродовали! В начале одна буква не та, и уже человека по спискам не найдешь!».

Ты кідаеш разьвітальны позірк на Балканскія горы й ціха радуешся, што ў цябе «няных» літараў цэлых дзьве — і ў імені, і ў прозьвішчы — а значыць, знайсьці цябе «па сьпісках» будзе няпроста.

**(Друкуецца ў газэтным варыянце.)**

Джэці

# Язьмінчыны Калядкі

Аднойчы Язьмінцы, якая адна жыла ў лесе, на Каляды не было чаго рабіць, то й пайшла яна калядаваць. А за ёй пайшла Схаваная Дзеўка[1] з двума малаткамі, толькі Язьмінка пра гэта ня ведала.

Падышла Язьмінка да дому Кірыка, ганчара, які гарлачы рабіў, і сьпявае нейкую бязглуздзіцу — ну ня ўмела яна калядаваць.

Вызірнуў Кірык з-за дзьвярэй, а Схаваная Дзеўка лясь яго малатком па галаве! Зазьвінела ў Кірыка ўвушшу, і кажа ён Язьмінцы:

— Чараўніца мая, прыгажуня, скрозь за табой пайду — не магу безь цябе жыць! Прагоніш — памру!

Язьмінка яго пашкадавала й кажа:

— Пачакай паміраць. Лепш прыходзь да мяне заўтра, як сьцямнее, тады й пагутарым.

Пайшла далей Язьмінка, а Схаваная Дзеўка падзьмула ёй на галаву, яна й забылася, што Кірыку сказала.

Прыйшла Язьмінка да бачара Бембеля, засьпявала ў яго пад вокнамі (ат, гэткае ж глупства, як і ў Кірыка, — ня ўмела яна сьпяваць). Бембелю жонка кажа: хадзі цікні, што за людзі на вуліцы. Той выйшаў, а Схаваная Дзеўка яго малатком па галаве трэсь! Бембель траха не самлеў, але ўтрываў і адразу ж Язьмінцы кажа:

— Надта ж вабная ты, ясачка. Заходзь да мяне, пагуляемся ў ладачкі.

— Не, зараз я не магу, — адказала Язьмінка. — А заўтра, здаецца, у мяне вечар вольны. Прыходзь да мяне, тады й пагуляем.

І зноў падзьмула Схаваная Дзеўка на галаву Язьмінцы, і тая пайшла да наступнай хаты.

А там судзьдзя Павіргон й фэльчар Нязіпер у дурня рэзаліся, ажно чуюць — нехта ў іх пад вокнамі пяе срэбным голасам нейкую лухту. Судзьдзя з вэранды выйшаў паглядзець, а Схаваная Дзеўка размахнулася і трэснула яго па галаве, ажно малатком шыбу ў акне за ім высадзіла. Ён пабачыў Язьмінку і ўвогуле зьнепрытомнеў. Але й Язьмінка напалохалася й давай яго сьнегам адціраць. Судзьдзя Павіргон вочы расплюшчыў і прастагнаў:

— Ты сьнішся мне, дзівоснае стварэньне?

— Не, — сказала Язьмінка. — Ты што, зусім мяне ня памятаеш?

— Сьнішся, — расчулена паўтарыў Павіргон.

— Язьмінка я! Вось прыходзь да мяне заўтра ў госьці ў лес, як сьцямнее, то й пабачыш, што ня сьнюся.

— Заўтра ўвечары, — паўтарыў судзьдзя летуценна, зноў ніякавеючы, — заўтра ўвечары!

Тут да іх фэльчар падышоў (зразумела, Схаваная Дзеўка й яго малатком дзеўбанула, а Язьмінцы хутчэй дзьме на галаву) і нечакана для сябе сказаў:

— Навошта табе гэты маркотнік? Давай я да цябе заўтра ўвечары прыйду.

— Прыходзь, — пагадзілася Язьмінка — яна ж пра судзьдзю ўжо ня памятала. Дый на Нязіпера-фэльчара з дапамогай Схаванай Дзеўкі хутка забылася.

Пайшла яна па вёсцы, пагойдваючыся ўжо, бо ня памятала нават, навошта з дому выйшла. Памятала толькі, што хацела да ўсіх завітаць. Пайшла да наступнага дому, а насустрач ёй жабрак Парошка. У яго было адно вока так сьляпое, а другое яму нехта калісьці выбраў, таму Парошка запхаў туды анучку й так хадзіў. Схаваная Дзеўка й тут часу дарма не губляе — б'е яго па галаве. А той небарака нават ня ведае, да каго яго раптам такой прыхільнасьцю прасякнула. Падумаў, можа, чараўніца якая перад ім, гіпнацізёрка — то яна, мусіць, і пра замоўленыя скарбы ведае.

— Ці не чараўніца ты часам? — так і кажа жабрак Язьмінцы. — Ці ня ведаеш пра якія скарбы? Я б на іх сабе новыя вочы набыў.

— Не, я не чараўніца, — адказала Язьмінка жаласьлівая. — Пра скарбы ня ведаю і нават грошай у мяне з сабой цяпер няма. Ты прыходзь да мяне заўтра ўвечары, тады я табе дам штосьці й пачастую.

— Прыйду, — Парошка кажа й адчувае, што не пачастункі яго цікавяць.

А Язьмінка ўжо далей пабегла. Выплыла да яе з паўцемры прыгожая хатка, на даху зь пеўнічкам, а па аканіцах кветачкі ды сэрцайкі, а на сьценах — шкада, у цемры не відаць — розныя ўзоры бульбінай выціснутыя. Жыў тут мастак на ўсю ваколіцу вядомы, Аверка. Язьмінка пагрукала да яго ў дзьверы, ён адчыніў. Зусім адзін ён жыў і даўно хацеў прывесьці жонку, але не мастацкія ўсё яму натуры трапляліся. А тут Дзеўка Схаваная са сваім малатком дасьпела — дык адразу Язьмінка Аверку вельмі мастацкай натурай падалася. І ён ёй гэта адразу й выказаў:

— Мілая дзеўчына, памятаю я цябе — ты ж у лесе жывеш. Чаму я цябе раней не заўважаў? Ты ж за барвачку чэрвеньскую ярчэйшая, вочы ў цябе кобальтавыя, ніколі такіх ня бачыў. Заходзь да мяне, я твой партрэт намалюю.

Язьмінка ўсьміхнулася — ёй прыемна было, што так яе хваляць. Але яна памятала, што ёй няма калі.

— Прабач, ня сёньня, — адказала яна. — Разумееш, я вельмі сьпяшаюся. Але калі заўтра ўвечары ты прыйдзеш да мяне са сваімі фарбамі, то малюй мяне колькі хочаш. Добра?

Засумаваў Аверка, але пагадзіўся. А Язьмінка пайшла далей. Наблізілася яна да цёмнай хаты, пра якую зь дзяцінства нешта страшнае чула, але незразумелае, бо ня ўсё ж чалавеку ў сьвеце разумець. Думала Язьмінка абмінуць тую хату, але зь яе выйшаў юнак Дабад — прыгожы, як сонца, — і паклікаў дзеўчыну. Ён яе насамрэч напалохаць хацеў, але тут Схаваная Дзеўка да яго нябачна ззаду падскочыла й шарганула сваім малатком. Дабад вачыма залыпаў і адразу ж перахацеў Язьмінку палохаць.

— Значыцца, вось яно — каханьне зь першага погляду! — усклікнуў ён. — Значыцца, вось тая, якую я чакаў усё жыцьцё! Падыдзі да мяне, ня бойся. Скажы мне, як імя тваё, хто ты?

— Я Язьмінка, жыву ў лесе, — адказала Язьмінка. — А ты хто?

— А я тут жыву, толькі выходжу рэдка, — сказаў Дабад. — Разумееш, у мяне такая праца, якую выдумалі, каб ёю лаяцца, адылі ж яна й насамрэч ёсьць.

— Што ж гэта за праца?

— Разумееш, я... ракар.

— Хто? Хакер?

— Не. Я здабываю скуру вядзьмаркам на чаравічкі. Урэшце, калі ты ня ведаеш, то лепш і ня ведай. Можа, гэта для ўсіх, апрача мяне, проста слова, дык няхай і для цябе гэта будзе проста слова... Ты ня будзеш мяне баяцца?

— Ня буду. Ты мне падабаешся, хаця дзіўнае нешта кажаш. Хочаш, заўтра пабачымся? Я ўвечары адна буду.

А Схаваная Дзеўка рагоча — ажно ня можа. Уяўляе сабе, што будзе заўтра ў лесе! Аднак жа й на гэты раз не забыла Язьмінцы на макаўку падзьмуць.

А Язьмінка, выходзіць, кола наўкруг усёй вёскі зрабіла і цяпер дадому вярталася. Але вырашыла яшчэ зайсьці да палясоўшчыка Шуляна. Ён спаў, а дзьверы ў хаце былі адчыненыя. Язьмінка туды толькі зазірнула, а Схаваная Дзеўка са сваім малатком у сярэдзіну заскочыла — і прысьніўся Шуляну сон, быццам закахаўся ён у Язьмінку, якая жыве побач адна, і што сказала яму Язьмінка, каб ён да яе ўвечары заўтра завітаў. А Язьмінкі там даўно ўжо й блізка не было.

Прыйшла яна дадому і таксама спаць легла. І нічога ня памятала, што нядаўна было. А ў суседняй вёсцы быў у яе знаёмы хлопчык, падпасак Цюнік. Ён і бязь Дзеўкі Схаванай (ды не, зь Дзеўкай, вядома ж, але гэта ўсё нашмат раней адбылося) быў у Язьмінку закаханы і якраз зьбіраўся да яе ў госьці зайсьці — у той жа вечар, што й усе госьці астатнія. Але Язьмінка пра гэта ня ведала.

На другі дзень, як ён ужо да вечару схіліўся, пайшла яна па ваду на рэчку. А там на беразе сядзеў незвычайны чалавек Сёмачка. Ён там заўсёды сядзеў, і заўсёды яму пятнаццаць гадоў было. У вёсцы казалі, што гэта яго калісьці Схаваная Дзеўка зачаравала за тое, што ён неяк яе пакрыўдзіў[2]. З тых часоў Сёмачка на беразе рэчкі сядзеў нерухома, быццам і не чалавек. Язьмінка абышла яго, каб да вады выйсьці, а тут зноў Схаваная Дзеўка аднекуль выскачыла і Язьмінцы малатком па галаве лясь! Так яна пажартаваць вырашыла. Язьмінка ж нават не зразумела, што здарылася, толькі вельмі захацелася ёй зачараванаму Сёмачку свой дом паказаць.

А дом у Язьмінкі быў незвычайны. Ня дом нават гэта быў, а высачэзная каменная заля. Пабудаваў яе нехта калісьці паміж елак, а хто й навошта — ліха яго ведае. Тут бацькі Язьмінчыны жылі, пакуль ня зьніклі, і іхнія бацькі, і тых бацькоў бацькі таксама. Ад іх у доме засталіся сякія-такія рэчы. Засталася дзяжа вялізная, у якой можна было пірагоў на тры вёскі расчыніць. Яшчэ засталася печка, якую Язьмінчын дзед склаў, — невялічкая і ад сьцяны адсунутая, каб вуліцу ня грэць. Каля печкі быў ложак, побач зь ім — куфар вялікі ў кветачкі, а за куфрам кросны стаялі, на якіх маці Язьмінчына цуды рабіла. А Язьмінка, калі маці зьнікла, накрыла іх апошнім ейным цудам і з тых часоў да кроснаў не дакраналася. А яшчэ, па другі бок ад дзяжышчы, былі там прыступкі, якія вялі наверх, але куды — невядома. Побач зь імі, бліжэй да ўваходу, стаяла каменная баба вялізная. Язьмінка бабу тую ў дзяцінстве вельмі баялася. А больш у Язьмінчыным незвычайным доме нічога й не было. Нямнога зусім, здаецца, але ж усё такое цікавае!

І ўбілася Язьмінцы ў галаву думка Сёмачку да сябе прывесьці. Узяла яна яго за руку і павяла. Пакуль яны йшлі, ужо сутоньне спусьцілася, а пакуль правяла Язьмінка Сёмачку ад бабы да лесьвічкі, ад лесьвічкі да дзяжыны, ад дзяжыны да печкі, ад печкі да ложка, а ад ложка да кроснаў, зусім вечар настаў, і пачула Язьмінка грукат у дзьверы. Пакінула яна Сёмачку ў куце цёмным і пайшла госьця сустракаць.

Гэта быў Аверка-мастак, і прыйшоў ён ня так, а з агромністай дошкай, каб маляваць на ёй Язьмінчын партрэт. Паставіў сваю дошку за кроснамі дый зразумеў, што не маляваць Язьмінку хоча, а абдымаць і цалаваць. Але ледзь ён падышоў да яе з абдымкамі, як зноў грукат у дзьверы — новы госьць:

— Адчыні, — крычыць, — гаспадынька!

Напалохаўся й Аверка, і Язьмінка. Хутчэй схавала Язьмінка Аверку за дзяжу. Адчыняе дзьверы, а там — бачар Бембель з бочкай. Закаціў бочку ў кут, за мастакову дошку, абняў Язьмінку й кажа:

— Ну што, пагуляемся ў ладачкі?

Язьмінка разгубілася, а за дзьвярыма зноў шоргат нейкі. Язьмінка бачара ўпрасіла стаць за каменную бабу. Але Бембель падумаў, што гэта ненадзейна, і перабег за таемную лесьвічку. Язьмінка толькі дзьверы адчыніла, бачыць — за імі судзьдзя Павіргон стаіць, ukленчыўшы, і ледзь ня плача:

— Мілая паненачка! Не магу чакаць болей! Будзь маёй жонкай!

Вось так адразу й жонкай!

— Пачакай, — сказала Язьмінка, правяла яго ў дом. Але за дзьвярыма зноў, чуе, хтосьці — а дзьверы ж не замкнёныя!

Язьмінка запхала свайго навасьпечанага жаніха за печку. Толькі судзьдзю за печкай падалося няўтульна, і ён перапоўз пад ложак. А ў хату якраз жабрак Парошка ўвайшоў. І з парога прызнаўся:

— Ня трэба мне грошай, прыгажуня. Падары мне адну ноч гэтую, і я навек шчасьлівым буду!

Працяг на старонцы 30.

[1] Схаваную дзеўку ўсе знаюць: яна паўсюль з двума малаткамі ходзіць і як пабачыць дзяўчыну й хлопца разам — аж ня толькі дзяўчыну й хлопца, але й жанчыну з мужчынам і нават дзеда з бабкай, — то можа абаіх па галовах малаткамі цюкнуць — яны й закахаюцца. А можа аднаго цюкнуць, а другога ня цюкнуць, а можа наагул міма прайсьці. Яна на ўсё здатная.

[2] Пра яго ёсьць гісторыя асобная. Калі яму было 15 год, закахаўся ён у дзяўчыну, сваю равесьніцу. Наважыўся ёй сказаць пра гэта, а яна адказвае: «Малы ты яшчэ. Скажы мне тое ж праз год, тады паглядзім». Ён прыйшоў праз год, але аказалася, што яму зноў пятнаццаць. І яшчэ, і яшчэ праз год тое ж паўтарылася. Бо Схаваная Дзеўка, шалапутка вядомая, чамусьці яго не ўпадабала. Тады ён разззлаваўся, пайшоў у лес, пабачыў там камень, да якога штодня ўся вёска дарункі прыносіла, і схадзіў на тыя дарункі па-маленькаму. А Гаспадар каменя яго за гэта жорстка пакараў: зрабіў самым разумным. І думкі ў хлопца сталі такія доўгія, што ён ані есьці, ані спаць ня мог, ані нават зь месца сысьці, а ўсё сядзеў іх дадумваў. Адну дадумае — другая прыйдзе, і так да бясконцасьці. А з выгляду — быццам звычайны хлопчык сядзіць.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Уільям Трэвар

# Каляды ў Лёндане



**Уільям Трэвар — ірляндзка-ангельскі празаік, найбуйнейшы з ангельскамоўных аўтараў, што працуюць сёньня ў жанры апавяданьня, сябра Ірляндзкай акадэміі літаратуры. Нарадзіўся ў 1928 у Мічэлстоўне, графства Корк. Скончыў Трыніці-каледж (Дублін). Ад 1954 жыве ў Ангельшчыне. У сваёй мастацкай мане-ры спалучыў выбуховую эмацыйнасьць, уласьцівую ірляндзкай мастацкай традыцыі, з інтэлектуальнай пранікліваськю ангельскай прозы.**

«Чамусьці заўсёды, — падумала яна, — заўсёды прыгадваюцца папярэднія гады, старыя калядныя паштоўкі, яшчэ непадрослыя дзеці». Быў год, калі Патрык моцна расплакаўся, бо не ўпадабаў астралісту, які яна ўпрыгожвала гасьцёўню. А неяк на Куцьцю Брыджыт у вока трапіла драбінка коксу, і малечу сярод ночы павезьлі ў Гамэрсьміфскую больніцу. Першы год шлюбу яны з Дэрматам яшчэ жылі ва Ўотэрфордзе. А калі перабраліся ў Лёндан, дык сьвяткавалі Каляды разам зь містэрам Джойсам, у якога здымалі дом. У іх на вачох старасьць усё болей і болей адольвала гэтага чалавека.

Сама Нора — цяпер жанчына сярэдняга веку, крыху распаўнелая, з паскамі сівізны ў густых чорных валасах, была лагоднаю ды жыцьцярадаснаю. Муж — супрацьлегласьць: хударлявы, аскетычны з выгляду, ён нагадваў сьвятара і ўвасабляў саму добрапрыстойнасьць. «Давай пажэнімся, Нора», — прапанаваў ён увечары 6 лістапада 1949 году ў танцзалі «Тара» ва Ўотэрфордзе. Просьба зьдзівіла яе. Чакалася, што ягоны брат Нэд, нехлямяжы, здаравенны — ня роўня Дэрмату, — папросіць ейнае рукі.

Дэрмат цярпліва прытрымліваў крэсла, на якім Нора стаяла, нацягваючы праз пакой папяровыя гірлянды — ад аднае карціннае рамкі да іншае. Ён не адпускаў крэсла, пакуль жонка аздабляла карціны галінкамі астралісту. Надзвычай абачлівы ад прыроды, Дэрмат хваляваўся дзеля дробязяў і асабліва непакоіўся, што Нора можа зваліцца. Сам ён аніколі не ўзьбіраўся на крэслы ды не разьвешваў упрыгожаньні ці што-колькех яшчэ. Паводле яго меркаваньня, ён не падыходзіў для гэткае справы. Увогуле, ён аніколі нічога ня ўмеў рабіць па гаспадарцы, але тое й неістотна, бо калі падрасьлі хлопцы, яны самі маглі паклапаціцца пра ўсё, чаму яна не давала рады. І чаго цяпер на тое зважаць. Ён быў такім, якім быў: стрыманым, разважлівым, нясхільным да выпіўкі, кемлівым, моцна прывязаным да сям'і й да самой Норы.

— Дзіўна, Нора, як хутка бягуць дні, — заўважыў Дэрмат, па-ранейшаму моцна сьціскаючы абедзьвюма рукамі сьпінку крэсла. — Быццам толькі ўчора былі Каляды.

Быццам учора.

Але ж за гэты час так шмат адбылося.

Надзвычай шмат.

Дзьве з карцінаў, што аздабляла Нора, былі краявідамі Ўотэрфорду. Іх калісьці падаравала ёй маці, зьняўшы са сьцяны ў гасьцёўні фэрмэрскага дому. На першай — марскае ўзьбярэжжа, на другой — будынак Ірляндзкага банку, узоўж якога пастух гоніць авечы статак. У пазалочанай раме вісела выява Маці Божай зь Дзіцем; былі й іншыя, меншыя карціны. Апошнюю галінку астралісту — зь ягадамі — Нора прымацавала над німбам Марыі.

— Я згатую гарбаты, — з усьмешкаю прапанавала яна, калі зьлезла з крэсла.

— Гэта было б проста цудоўна, Нора.

У гасьцёўні стаялі сэрвант з тэлевізарам, тры карычневыя фатэлі, чырвонага дрэва стол ды некалькі крэслаў з высокімі сьпінкамі. І без таго загрувашчаны мэбляю, невялікі пакой зрабіўся яшчэ меншым, калі дадаліся ўпрыгожаньні. На газавым каміне былі роўненька расстаўленыя калядныя паштоўкі, а ў цэнтры — зялёны гадзіньнік у стылі трыццатых гадоў.

Іхны дамок стаяў ушчыльную з гэткімі ж стандартнымі хаткамі на адной з вуліцаў Фулгема. Вялікай сям'і ў ім заўсёды было цеснавата, але цяпер, калі Патрык і Брэндан не жылі тут, зрабілася вальней. Паўгоду таму, якраз скончыўшы падрыхтоўку ў Мідлэнд-Банку, Патрык ажаніўся зь дзяўчынаю на імя Пэрл. Брэндан практыкаваўся ў Ліверпулі, у фірме па вытворчасьці кампутараў. Астатнія трое дзяцей яшчэ вучыліся ў школе: Брыджыт — пры кляштары, што месьціўся недалёка, Кейтал ды Том — у пачатковцы пры царкве Сэрца Хрыстовага. Калі Патрык і Брэндан зьехалі, іх пакой аддалі Брыджыт, якая да таго спала ў бацькоўскім. На Каляды яна зноў перабярэцца назад, бо Брэндан на тры дні прыедзе дахаты. Патрык і Пэрл наведаюцца толькі на самое Раство. Яны будуць сьпяшацца ў Кройдан, да сваякоў Пэрл, каб адзначыць там Дзень дарункаў, або, як заўсёды па ірляндзкай завядзёнцы казалі Нора і Дэрмат, — дзень Сьвятога Стафана.

— Як добра будзе сабрацца разам, Нора, — зазначыў Дэрмат. — Зноў усёю сям'ёю.

— І Пэрл.

— Але, Нора. Яна цяпер частачка нас.

— Падаць табе печыва да гарбаты? У мяне ёсьць пачак «Найс».

Ён з удзячнасьцю пагадзіўся. Мінула ўжо дваццаць пяць гадоў, як яны пераехалі, і ўвесь гэты час ён працаваў інспэктарам у «Норт-Тэмз Газ» — здымаў паказаньні лічыльнікаў. Ва Ўотэрфордзе ён быў клеркам на мытні, зарабляў ня надта дый не любіў задушлівага, поўнага цыгарэтнага дыму пакою, дзе акрамя яго сядзела яшчэ з паўтузіна такіх самых клеркаў. Ён пераехаў у Ангельшчыну, бо так заманулася Норы: ёй заўсёды хацелася працаваць у лёнданскай краме. Яна атрымала месца ва ўнівэрмагу «Дыкенс-энд-Джонс», у аддзеле тканінаў, а ён зрабіўся інспэктарам па газе: дзень пры дні езьдзіў ад дзьвярэй да дзьвярэй, ведаў на памяць, дзе ў кожным з дамоў вісіць газавы лічыльнік, дый не даваў гаспадарам нагоды наракаць на сябе. Праца адразу прыйшлася яму даспадобы. Час, які адымала дарога, ён мог прысьвячаць сваім развагам, асабліва развагам пра веру.

У невялічкай кухні Нора зрабіла гарбаты й на падносе прынесла кубкі ў гасьцёўню. У гэтым годзе яна запазьнілася з аздабленьнем хаты. Звычайна ўпрыгожаньні разьвешваліся за тыдзень да сьвята, бо тады адчуваўся нейкі душэўны ўздым і ўсе сустракалі Каляды з адпаведным настроем. Яна была занятая зборам рэчаў для каляднага распродажу, на які запрасіў яе прыехаць айцец Мэйлі. Ён казаў пра шапік моднага адзеньня, але, дакладна ня ведаючы, што мелася на ўвазе, яна прасіла ў людзей старыя апранахі — выйшла звычайная мешаніна. Часу спатрэбілася шмат, і хвілінка, каб прыбраць хату, знайшлася толькі сёньня, за два дні да Сьвятога Вечару. Але, відаць, гэтак яно й да лепшага. Брыджыт, Кейтал ды Том выправіліся ў Гамэрсьміф — паглядзець кіно. У панядзелак Дэрмат пасьля абеду не працуе, і якраз зручна будзе, пакуль яны удваіх, паразмаўляць пра містэра Джойса. Ня тое каб яна хацела ўздымаць гэтую тэму, але й адкладаць ніяк не выпадала.

— Кубачак гарбаты падбадзёрвае,* — сказаў ён, разломваючы печыва напалам. Яна наўмысна адцягвала непрыемную размову й назірала, як ён надкусіў печыва, пасьля насыпаў сабе ў кубак тры паўнюткія лыжкі цукру ды разьмяшаў. Ён любіў гарбату. Першы раз, калі ён запрасіў яе ў «Савой» ва Ўотэрфордзе, яны пілі гарбату ў кавярні кінатэатру, абмяркоўваючы прагледжаны фільм ды ўзгадваючы супольных знаёмых. Ён прыехаў ва Ўотэрфорд зь вёскі, з фэрмы, якая досталася ў спадчыну ягонаму брату й месьцілася недалёка ад фэрмы яе бацькі. Тым вечарам ён казаў ёй, што ўжо атайбаваўся і ўсё вырашана: Уотэрфорд, вядома, ня самае выдатнае месца, але шмат у чым яму падыходзіць. Калі б яны не пажаніліся, ён і цяпер жыў бы там, працуючы на восем гадзінаў на мытні і зусім ня маючы да яе цікавасьці. Вытрымаць гэткае становішча яму дапамагла б вера.

— Паштоўка ад айца Джэка ўжо прыйшла? — запытаўся ён, маючы на ўвазе іх далёкага сваяка, сьвятара з Чыкага.

— Пакуль што не. Але ж ты ведаеш, яна заўсёды спазьняецца. Летась віншаваньні прыйшлі толькі ў лютым.

Нора сядзела ў фатэлі з другога боку ад агню й дробнымі глыткамі піла гарбату. Так прыемна было застацца зь ім удваіх у гэтым сьвяточным пакоі: на каміне стаялі калядныя паштоўкі, цікаў зялёны гадзіньнік, за вокнамі зьбіраўся змрок. Пакуль Дэрмат запальваў цыгарэту, яна, пасьміхаючыся, узяла сабе яшчэ адно печыва й запыталася:

— Цудоўна, праўда? Ты і я, і такі спакой... Ён урачыста кіўнуў.

— Спакой прыходзіць нясьпешным крокам, — сказаў ён, і яна ведала, што гэта цытата зь нейкае кнігі. Досыць часта ягоныя словы заставаліся незразумелымі для яе. — Спакой і ласка Божая, — працягнуў ён, і яна зразумела.

Ён зьбіў з цыгарэты попел: адмыслова для гэтага побач з камінам стаяла попельніца. Усе ягоныя рухі былі павольныя. Ён быў разумным чалавекам, але думаў марудна. Рашэньне прымаў толькі пасьля доўгіх і грунтоўных развагаў, калі ўсё было прадумана да дробязяў. «Мне трэба паразважаць пра гэта, Нора», — адказаў ён дваццаць пяць гадоў таму, пачуўшы яе прапанову пераехаць у Ангельшчыну. Праз тыдзень ён сказаў, што згодны, калі яна сапраўды таго жадае.

Яны паразмаўлялі пра Брыджыт, Кейтала й Тома. Вярнуўшыся з кіно, дзеці хуценька перапрануцца ды адразу ж выправяцца на калядную вечарыну ў кляштарную школу, дзе вучыцца Брыджыт.

— Для іх гэта значны дзень, Нора. Дазволь ім заўтра даўжэй паспаць.

— Ды ім абы спаць, — сказала яна сьмеючыся, каб згладзіць магчымую рэзкаватасьць сваіх словаў. — Калі столькі перадсьвяточнай беганіны, чым меней малыя нагадваюць пра сябе, тым лепш, — дадала яна гэтаксама вясёла.

— Ты набыла для Кейтала прылады, якія ён прасіў?

— Так, набор хімічных рэчываў у каробцы.

— Як выдатна ты ўсё пасьпяваеш, Нора.

Яна не пагадзілася. Зноў наліла сабе й яму гарбаты. Пасьля, як мага няўзнак, заўважыла:

— Містэр Джойс ня прыйдзе. Я ня буду пакідаць для яго месца за калядным сталом.

— Быць ня можа, каб ён забыўся пра нас, Нора.

— У гэтым годзе ён ня прыйдзе, — горка пасьміхнулася яна. — Мне здаецца, лепш папярэдзіць дзяцей.

— Куды ж ён пойдзе, як не да нас? Дзе ён папалудне?

— «Лаянз» звычайна адчынены.

— Не, ён ніколі ня пойдзе туды.

— У кавярні «Балруш» прапануюць на абед індыка. Сёньня шмат хто карыстаецца такімі паслугамі. Калі, напрыклад, маці ў цябе працуе ды ня мае часу гатаваць, можна пайсьці ў гатэль або кавярню — выходзіць тры-чатыры фунты на чалавека...

— Містэр Джойс ня пойдзе ў кавярню. На Раство аніхто ня можа пайсьці ў кавярню адзін.

— Але й сюды ён ня прыйдзе, мілы.

Прагучала тое, што павінна было прагучаць: няма болей ніякага сэнсу й нявыгадна падставаў падманваць па пакідаць для старога месца за сталом. Містэр Джойс ня прыйдзе. У жніўні ён перастаў да іх наведвацца. Раней прыходзіў штопятніцы — пагутарыць, папіць гарбаты, паглядзець а дзявятай навіны. Штогод на Каляды ён рупліва выбіраў для дзяцей цацкі, прыносіў шакаляд, арэхі, цыгарэты, на вясельле падараваў Патрыку й Пэрл радыёпрыймач.

— Я думаю, Нора, нягледзячы ні на што, ён прыйдзе. Магчыма, проста крыху занядужаў: хай памагае яму Бог — ён у такіх паважных гадах.

— Не, Дэрмат, ён не хварэў.

Штопятніцы містэр Джойс — з акуратнымі сівымі вусамі, высакаваты, цяпер, праўда, згорблены, лядашчы ды кашчавы, — сядзеў тут, у трэцім карычневым фатэлі, і, гледзячы тэлевізар, нахіляў лысую галаву так, каб здаровае вуха было бліжэй да экрану. У свой час ён працаваў будаўніком, што й дазволіла яму прыдбаць маёмасьць у Фулгеме. Ён усяго дасягнуў сам, але так і не ажаніўся. Той жнівеньскі вечар праходзіў як звычайна. Выпраўляючыся спаць, Брыджыт пацалавала старога: колькі дзяўчынка сябе памятала, яна заўсёды рабіла гэта, калі містэр Джойс быў у іх. Ён распытаўся ў Кейтала, як той даў рады сёньняшняй пісьмовай працы.

Ніякіх спрэчак адносна хаты ніколі не ўзьнікала. Дэрмат і Нора лічылі, што містэр Джойс ставіцца да іх справядліва, і былі для яго ня толькі кватэранаймальнікамі, але й сябрамі. Калі ў Бірмінгеме й Гілдфордзе ў выніку тэрактаў IPA загінулі ангельцы, ён усё роўна наведваўся да іх у пятніцы ды на Раство. Пасьля навінаў яны абмяркоўвалі тэракты: выбух у Таўэры, выбух у аўтобусе й усе іншыя. «Вар'яты», — зазначыў містэр Джойс, і ніхто яму не запярэчыў.

— Быць ня можа, каб ён забыўся пра дзяцей, Нора. Цяпер жа Каляды.

Дэрматаў голас зьвяртаўся да яе зь ценю. Яна адчувала на твары цеплыню каміннага агню й ведала, што калі зараз зірне ў люстэрка, дык пабачыць, як разружавелася. Дэрмат не чырванеў ніколі. Нават нэрвуючыся, ён не выдаваў сваіх эмоцыяў. У любой сытуацыі ягоны твар заставаўся бледным і ў вачах не было ані знаку хваляваньня. Пра такога мужа можна было толькі марыць. Але ў выпадку зь містэрам Джойсам ён настолькі памыляўся, што проста пужаў яе.

— Мне зайсьці заўтра па індыка? — запытаўся ён.

Яна кіўнула, спадзеючыся, што ён удакладніць, у чым справа, бо звычайна яна ніколі не адказвала на пытаньне толькі кіўком. Аднак Дэрмат маўчаў. Ён згасіў сваю цыгарэту. Пасьля запытаўся, ці ёсьць кіпень, каб выпіць яшчэ па кубачку гарбаты.

— Дэрмат, ці не перадаў бы ты сёе-тое містэру Джойсу?

— Нейкую цыдулку, так?

— Не, я падрыхтавала для яго шалік у краткі.

— Дык хіба нельга, Нора, падараваць яго акурат на Раство, як ты заўсёды рабіла? — ён казаў мякка, але настойліва. Яна пахітала галавою.

Усё гэта было яе віною. Калі б не яе прапанова перабрацца ў Ангельшчыну, калі б ня ейнае жаданьне працаваць у лёнданскай краме, яны б ня трапілі ў пастку, якую самі ж сабе й падрыхтавалі. У іхных дзяцей лёнданскае вымаўленьне. Патрык і Брэндан працуюць у ангельскіх фірмах і жыць будуць у Ангельшчыне. Патрык ажаніўся з ангелькаю. Яны вызнаюць каталіцтва і носяць ірляндзкія імёны, але дом для іх — ужо ня Ўотэрфорд.

Працяг на старонцы 28.

# Рубэн Давід Ганзалес Гальега*

# Я —

## Герой

Я — герой. Быць героем лёгка. Калі ў цябе няма рук ці ног — ты герой ці нябожчык. Калі ў цябе няма бацькоў — спадзявайся на свае рукі і ногі. І будзь героем. Калі ў цябе няма ні рук, ні ног, а ты да таго ж спружыўся зьявіцца на сьвет сіратою, — усё. Табе наканавана быць героем да канца сваіх дзён. Ці здохнуць. Я герой. У мяне проста няма іншага выйсьця.

* * *

Я — маленькі хлопчык. Ноч. Зіма. Мне трэба ў прыбіральню. Клікаць нянечку няма сэнсу. Выйсьце адно — паўзьці ў прыбіральню.

Для пачатку трэба зьлезьці з ложка. Спосаб ёсьць, я яго сам прыдумаў. Проста падпаўзаю да краю ложка і перакульваюся на сьпіну, кідаючы сваё цела на падлогу. Удар. Боль.

Падпаўзаю да дзьвярэй на калідор, піхаю іх галавой і выпаўзаю з адносна цёплага пакою ў холад і цемру.

Уначы ўсе вокны ў калідоры расчыненыя. Халодна, вельмі халодна. Я — голы.

Паўзьці далёка. Калі паўзу каля пакою, дзе сьпяць нянечкі, спрабую паклікаць на дапамогу, стукаю галавой у іх дзьверы. Ніхто не адгукаецца. Крычу. Нікога. Можа, я ціха крычу.

Пакуль дабіраюся да прыбіральні, замярзаю канчаткова. У прыбіральні вокны адчыненыя, на падваконьні сьнег. Дабіраюся да гаршка. Адпачываю. Мне абавязкова трэба адпачыць, перш чым паўзьці назад. Пакуль адпачываю, мача ў гаршку бярэцца ледзяной кромкай.

Паўзу назад. Сьцягваю зубамі коўдру з свайго ложка, неяк захутваюся ў яе і спрабую заснуць.

* * *

Зранку мяне апрануць, адвязуць у школу. На ўроку гісторыі я бадзёра распавяду пра жахі фашысцкіх канцлягераў. Атрымаў пяцёрку. У мяне заўсёды пяцёркі па гісторыі. У мяне пяцёркі па ўсіх прадметах. Я — герой.




**Маці разлучылі з сынам, сказалі, памёр. Праз трыццаць гадоў ён раптам зь мёртвых устаў. Двума дзейнымі пальцамі ён натуе цяпер сваю біяграфію ў «чорную кнігу» міжнароднага камунізму.**

**Чарнейшы за Сэліна, раньняга Сэла (які звонку пісаў сваіх правінцыйных выродкаў і дурняў), Карвэра. Чарнейшы нават за Шаламава і іншых, якія вярнуліся й спавясьцілі ісьціну пра тое, што для пісьменьніка чым горай — тым лепей. Гэты нон-фікшн узьнікае па-за межамі «нармальнага» жаху — таго, што жудасна для нармальных, так бы мовіць, людзей.**

**Тэлефануеш яму ў Мадрыд: «Што чуваць?» Адказ заўсёды адзін і той самы, як пароль, як сымбаль веры: «Жывы!» Газэта «Мунда» напісала: «Ягоныя 45 кіляграмаў — гэта 45 кіляграмаў аптымізму». У «Аргументах и фактах» артыкул пра яго шалёны, вядома, але назьве ў дакладнасьці не адмовіш: «Мача ў інвалідным вазку». Што ёсьць, тое ёсьць.**

**...У шматдзетнай сям'і аднаго зь лідэраў гішпанскай кампартыі, кіраўніцтва якой вяло барацьбу супраць франкізму з Парыжу, «брыдкім качанём» была старэйшая дачка. Зь ліцэю сярэдзіны 60-х Аўрора выйшла настолькі вальнадумнай, што замест Сарбоны лідэр накіраваў яе на «перавыхаваньне» ў Маскву. На Ленінскіх гарах гішпанка сустракае вэнэсуэльскага студэнта, герыльера з Каракасу, які ўцёк ад хунты за акіян — у краіну ідэалаў. Вясельле на 18-м паверсе сталінскай высоткі. Цяжарнасьць без адпаведнага кантролю. Раптоўнае адкрыцьцё, што будуць блізьняты. Праездам на крымскі адпачынак лідэр вымушаны прабіваць Крамлёўскую бальніцу. Далей — горш. Праз 10 дзён пасьля родаў адзін з блізьнятаў паміpae, другому ставяць жахлівы дыягназ — ДЦП. Дзіцячы цэрэбральны паралюш.**

**І тут пачынаецца палітычны трылер. Кампартыя Гішпаніі асуджае КПСС за Прагу, КПСС асуджае КПГ за «эўракамунізм». Дачка лідэра, якая ўжо год знаходзіцца з сынам у закрытай установе, фактычна становіцца закладніцай Крамля.**

**Хто вырашыў лёс дзіцяці — ахінута цемрай. Аўрору, што ад'ехала на Ленінскія горы здаваць іспыты, тэрмінова выклікалі назад і паказалі сына ў рэанімацыі. Хлопчык аганізаваў. Праз некалькі дзён ёй пазванілі ў інтэрнат: «Памёр». Як і зь першым блізьнюком — ні даведкі пра сьмерць, ні пасьведчаньня аб нараджэньні.**

**Хуан Карлас II пасьля сьмерці Франка легалізаваў кампартыю. Лідэр стаў дэпутатам гішпанскага парлямэнту, потым — віцэ-прэзыдэнтам і ў гэтай якасьці, разам з каралём і лідэрамі іншых партый, замацаваў сваім подпісам першую дэмакратычную Канстытуцыю Гішпаніі.**

**Пасьля траўмы родаў 20-гадовая маці ўпала ў шок, пра які цяпер прыгадвае як пра год аўтызму, татальнай нематы і такога глыбокага сымбіёзу з блізьнюком, які застаўся жывым, што нават у думках яна ніяк яго не называла. Такім — безыменным — яго і аднялі, абвясьцілі памерлым. Але хтосьці ж потым загадаў даць хлопчыку імя зь сьвятцаў гішпанскай кампартыі — Рубэн. Так звалі сына Ібаруры, які загінуў пад Сталінградам.**

**Гэты хлопчык, у крыві якога Андалюзія, адкуль дзед, зьмяшалася з Краінай Баскаў, адкуль бабуля, з крамлёўскіх бальніц быў адвезены ў сяло Карташава пад Волхавам, дзе прабыў чатыры гады, потым у Ленінградзкі НДІ, адтуль у Бранскую вобласьць, у горад Трубчэўск, потым у Пензенскую вобласьць, у рабочы пасёлак электралямпавага заводу Ніжні Ломаў і, нарэшце, у горад расстралянага пралетарыяту Новачаркаск.**

**...Год 1985. Масква. Крэмль. У Георгіеўскай залі — чарга генсекаў. Міхаіл Сяргеевіч прымае віншаваньні. На экране — генэральны сакратар Кампартыі народаў Гішпаніі Ігнасіё Гальега. Сівавалосы каржакаваты гішпанец, якога блаславіў сам Сталін, цісьне руку новаму гаспадару Крамля. «Ці ня твой дзед, Рубэн?» — абяртаюцца тэлегледачы ў дзіцячым доме далёка ад Масквы. «Каб быў мой дзед, я б з вамі тут баланды ня сёрбаў», — адказвае юны інвалід, якога з дня на дзень мусяць перавесьці ў дом састарэлых....**

**У Новачаркаску ён скончыў два каледжы — ангельскі і юрыдычны. Ажаніўся, нарадзіў дачку-прыгажуню. Зарабіў на кампутар. Пабыў у Амэрыцы — ад Нью-Ёрку да Сан-Францыска. Вярнуўся, разьвёўся і ажаніўся зноў. Другая дачка — ізноў прыгажуня.**

**Спраўдзілася і «амэрыканская мара» — пра мабільнасьць. Вазок, зроблены ў Мюнхене, кіруецца двума пальцамі, разьвіваючы хуткасьць, за якой ня ўгнацца, — 15 км за гадзіну.**

**Бласлаўёныя прынцам Астурыйскім, маці і сын вярнуліся на гістарычную радзіму. Самалёт сеў у мадрыдзкім аэрапорце 22 верасьня 2001 г. За дзень да гэтага Рубэну споўнілася 33.**

**Сяргей Юр'енен**

## Мары

Калі я быў зусім маленькім, я марыў пра маму, марыў гадоў да шасьці. Потым я зразумеў, дакладней, мне патлумачылі, што мая маці — чарнажопая сука, якая кінула мяне. Мне непрыемна пісаць такое, але мне тлумачылі менавіта ў гэтых тэрмінах.

Тыя, хто тлумачыў, былі вялікімі і моцнымі, яны мелі рацыю ва ўсім — адпаведна, і ў такой дробязі. Вядома, былі і іншыя дарослыя. Яны былі настаўнікамі. Настаўнікі распавядалі мне пра далёкія краіны, пра вялікіх пісьменьнікаў, пра тое, што жыцьцё цудоўнае і кожнаму знойдзецца месца на зямлі, калі толькі добра вучыцца і слухацца дарослых. Яны заўсёды хлусілі. Хлусілі ва ўсім. Яны распавядалі пра зоры і мацерыкі, але не дазвалялі выходзіць за вароты дзіцячага дому. Яны казалі пра роўнасьць усіх людзей, але ў цырк і ў кіно бралі толькі хадзячых.

Не хлусілі толькі нянечкі. Дзіўнае расейскае слова — «нянечка». Ласкавае слова. Адразу прыгадваецца Пушкін: вып'ем, няня... Звычайныя сельскія цёткі. Часам злыя, часам добрыя, але заўсёды простыя і шчырыя. Даючы цукерку, яны казалі: «Беднае дзіцятка, хутчэй бы ўжо памерла, ні сябе, ні нас ня мучыла б». Ці, выносячы нябожчыка: «Ну, і дзякуй богу, адпакутаваў, бедненькі». Калі я, застуджаны, заставаўся ў спальным корпусе сам-насам з такой нянечкай, яна, добрая цётка, прыносіла мне якой слодычы ці грушку з кампоту і распавядала пра сваіх дзяцей, што загінулі на фронце, пра мужыка-п'яніцу — безьліч розных цікавых рэчаў. Я слухаў і верыў усяму, як вераць праўдзе дзеці, а можа, толькі дзеці. Дарослыя часьцяком ужо ні могуць верыць ні ў што. Дык вось, пра «чарнажопую суку» нянечкі расказвалі мне проста і натуральна, як пра дождж альбо сьнег.

У шэсьць гадоў я перастаў марыць пра маму. Я марыў стаць «хадзячым». Хадзячымі былі амаль усе. Нават тыя, хто ледзьве-ледзьве мог совацца на мыліцах. Да хадзячых ставіліся лепш, чым да нас. Яны былі людзьмі. Многія атрымлівалі добрую адукацыю, «выбіваліся ў людзі». Пасьля выпуску зь дзетдому яны прыяжджалі на дарагіх машынах. Тады нас зьбіралі ў вялікай залі, распавядалі, якую пасаду займае былы вучань нашай школы. З расповедаў складалася, што гэтыя таўстыя дзядзькі і цёткі заўсёды слухаліся старэйшых, добра вучыліся і дамагліся ўсяго сваім розумам і настойлівасьцю. Але яны былі хадзячымі! На які ляд я мусіў слухаць іхную пахвальбу, калі й так ведаў, што трэба рабіць пасьля таго, як станеш хадзячым? Як зрабіцца хадзячым, ніхто не распавядаў.

У восем я зразумеў адну вельмі простую рэч: я адзін і нікому не патрэбны. Дарослыя і дзеці думаюць толькі пра сябе. Натуральна, я ведаў, што дзесьці на іншай плянэце існуюць мамы, таты і дзядулі з бабулямі. Але гэта было так далёка і неправаканаўча, што я аднёс ўсе гэтыя трызьненьні да вобласьці зорак і мацерыкоў.

У дзевяць я зразумеў, што хадзіць ніколі ня здолею. Гэта было вельмі сумна. Гэпнуліся далёкія краіны, зоркі і іншыя радасьці. Засталася сьмерць. Доўгая і непатрэбная.

У дзесяць — прачытаў пра камікадзэ. Гэтыя бравыя вaякі несьлі сьмерць ворагу. Палётам у адзін канец яны аддавалі радзіме ўсе пазыкі за зьедзеныя рыс, за спэцканы пялюшкі, за школьныя сшыткі, за ўсьмешкі дзяўчынак, за сонца і зоры, за права кожны дзень бачыць маму. Гэта мне падыходзіла. Я разумеў, што ў самалёт мяне ніхто не пасадзіць. Я марыў пра тарпэду. Кіраваную тарпэду, начыненую выбухоўкай. Я марыў ціхацiха падцікацца да варожага авіяносца і націснуць чырвоную кнопку.

З таго часу мінула шмат гадоў. Я ўжо дарослы дзядзька і ўсё разумею. Я ня маю права жадаць сьмерці, бо ад мяне залежыць многае ў лёсе маёй сям'і. Мяне любяць жонка і дзеці, я таксама вельмі-вельмі іх люблю. Але часам, калі ляжу ўначы і не магу заснуць, я ўсё-такі мару пра тарпэду з чырвонай кнопкай. Гэтая наіўная дзіцячая мара так і не пакінула мяне і, можа быць, ніколі не пакіне.

* * *

Вялікдзень. Усе нянечкі сьвяточна апранутыя. Адчуваньне сьвята ва ўсім. У тым, што нянечкі такія па-асабліваму добрыя да нас, у насьцярожанасьці выхавальнікаў. Я нічога не разумею. Бо падчас сьвятаў па тэлевізары паказваюць парады і дэманстрацыі.

Парадаў няма толькі на Новы год. Але на Новы год ёсьць ёлка і падарункі.

Пасьля сьняданку нянечка раздае ўсім па фарбаванаму яйку. Усярэдзіне яйка такое ж белае, як і звычайнае. Я зьядаю велікоднае яйка. Дзятдомаўскія яйкі пераварaныя, цьвёрдыя, а гэтае мяккае і вельмі-вельмі смачнае.

Як ні дзіўна, але, дзе б я ні быў, ці ў дзетдоме, ці ў бальніцы, ці ў доме для састарэлых, якая-небудзь добрая душа заўсёды давала мне на Вялікдзень фарбаванае яйка. І гэта проста файна.

* * *

Да нас прыйшлі шэфы. Шэфамі ў нас былі студэнты з пэдінстытуту.

Нас сабралі ў актавай залі, шэфы пасьпявалі нам песенькі і сышлі. Дакладней, сышлі на ўсе. Паводле пляну шэфскае дапамогі, студэнты павінны былі праводзіць з намі нейкія мерапрыемствы, дапамагаць рыхтаваць урокі і гэтак далей. Але большасьць глядзела на нас як на пракажоных. Гэты выраз «як на пракажоных» я вычытаў потым, і ён мне вельмі спадабаўся. А як яшчэ можна перадаць вырачаныя вочы і кепска схаваную агіду?

Але некаторыя прыходзілі. Як ні дзіўна, гэта былі студэнткі, якія зорак зь неба не хапалі. Прыродная дабрыня і шкадаваньне, а мо цікаўнасьць прыводзілі іх сюды зноў і зноў.

Адна такая дзяўчына зайшла і да нас.

— Хлопчыкі, вам чым-небудзь дапамагчы?

— Чыфір будзеш піць?

— Што?

— Чай моцны.

— Буду.

— Тады дастань у мяне з-пад матраца кіпяцільнік, слоік з тумбачкі, схадзі па ваду і зарадзі ўсё гэта пад ложкам.

Гэтая студэнтка была ў нас некалькі разоў, пацаны частавалі яе шакаладнымі цукеркамі, травілі показкі. Зь ёй было добра і весела.

Неяк яна забавілася ў нас, і ёй час было сыходзіць. Адпускаць яе нікому, канечне, не хацелася.

— Хлопчыкі, ну мне трэба яшчэ фізыку рабіць і матэматыку, а сьпісаць адразу не дадуць.

— Ты на якім курсе?

— На другім.

— Падручнік пры табе?

— У торбе.

— Даставай, чытай заданьне.

А гэта казаў Генка з кутняй койкі.

Дастала, села чытаць.

— Але я тут нічога не разумею.

— Я таксама. Я толькі год вышку вучу. Чытай услых.

— А формулы?

— І формулы чытай.

Яна чытала свой падручнік, мы радаваліся, што яна яшчэ не сыходзіць, і не сумняваліся, што Генка рашыць усе яе задачы. Яна чытала доўга, а потым Генка сказаў ёй сесьці за стол і пісаць.

— Але ты ж ня бачыш, што я пішу!

— Але ты бачыш?

— Бачу.

— Ну і пішы.

Ён прадыктаваў ёй рашэньні ўсіх яе задач і змоўк.

— А можна, я праверу? Тут у мяне адказы выпісаныя.

— Правер.

— Усё супала! Але як ты гэта? Ня гледзячы ў сшытак. Ты ж такі маленькі!

Генка важыў кіляграмаў дзесяць. Акрамя таго, што ён ня мог хадзіць, у яго штосьці было яшчэ з шчытападобнай залозай і ён ня рос. Звычайна яго накрывалі да барады коўдрай, з-пад якой вызіраў тварык васьмігадовага хлопчыка. Хоць гэта было і да лепшага. Яго часам выносілі на вуліцу. Мы з Васільком маглі выпаўзаць на асфальт самі, а астатнія вуліцы ня бачылі.

— Мне васямнаццаць. Я такі ж «маленькі», як і ты.

— Ой, хлопчыкі (яна называла нас «хлопчыкі», больш нас так ніхто не называў). А я думала, вы яшчэ ў школе вучыцеся.

— Афіцыйна вучымся. Другагоднікі. А некаторыя па два гады ў адной клясе сядзелі. Гэта проста ў нас дырэктар дзетдому добры. Ня хоча нас у дом састарэлых адвозіць. Там за намі даглядаць ня будзе каму і мы памром.

— А чаму ж вы ў інстытут не паступіце? Вы ж там выдатнікамі былі б.

— У інстытут толькі хадзячых бяруць.

Яна хутка-хутка зазьбіралася і пайшла. Я выпаўз у калідор. Ішоў дождж, і я хацеў падпаўзьці да выхаду.

Было халаднавата — позьняя восень ці ранняя вясна. Уваходных дзьвярэй не зачынялі, і я любіў падпаўзаць да самага выхаду,

---

* Ляўрэат расейскае Букераўскае прэміі за 2003 год.

** Урыўкі з кнігі «Белае на чорным», што складаецца з кароткіх запісаў, у якіх занатаваная гісторыя жыцьця аўтара.

# герой

## Дакумэнтальная проза**



**Мая дачка лепіць тату. Ляпіць тату лёгка. Прасьцей, чым грыбок. Трэба раскачаць дзьве круглыя ляпёшкі плястыліну. Дзьве аднолькавыя ляпёшкі, два колы інваліднага вазка.**

глядзець на дождж. Рэдкія кроплі траплялі ўсярэдзіну, падалі на мяне. Было хораша і сумна.

Але гэтым разам маё месца ля дзьвярэй было занятае. Цяжка прываліўшыся да вушака, стаяла тая самая студэнтка і прагна, узацяг, паліла. І плакала. Я ня памятаю, як яна была апранутая. Памятаю толькі туфлі на абцасах. Яна была вельмі прыгожая. Мне здалося, што такой прыгожай дзяўчыны я ніколі больш ня ўбачу. Яна паліла і плакала. Потым дапаліла і пайшла пад дождж. Без плашча і парасона. Больш яна да нас не прыходзіла.

### Амэрыка

Краіну гэтую трэ было ненавідзець. У Амэрыцы жылі ворагі, буржуі, што п'юць крoў працоўнае клясы. Амэрыканскі імпэрыялізм рыхтаваў для нас атамную бомбу.

Рабочыя ў Амэрыцы ўвесь час галадалі і мерлі, да пасольства Савецкага Саюзу бясконцай плынню лілася чарга ахвотных зьмяніць грамадзянства. Так нас вучылі, мы верылі.

Я Амэрыку любіў, любіў зь дзевяці гадоў. Менавіта ў дзевяць гадоў мне распавялі, што ў Амэрыцы інвалідаў няма. Іх забіваюць. Усіх. Калі ў сям'і нараджаецца інвалід, лекар робіць дзіцяці сьмяротны ўкол.

— Цяпер вы разумееце, дзеці, як вам пашанцавала нарадзіцца ў нашай краіне? У Савецкім Саюзе дзяцей-інвалідаў не забіваюць. Вас вучаць, лечаць і кормяць бясплатна. Вы павінны добра вучыцца, атрымаць патрэбную прафэсію.

Я не жадаю, каб мяне кармілі бясплатна, я ніколі ня здолею атрымаць патрэбную прафэсію. Я хачу ўкол, сьмяротны ўкол. Я хачу ў Амэрыку.

### Гішпанка

Больніца. Я ляжу загіпсаваны да поясу. Ляжу на сьпіне. Ляжу ўжо больш за год. Гляджу ў столь. Больш за год гляджу ў адно і тое самае месца на столі. Жыць зусім ня хочацца. Я імкнуся менш есьці і піць. Чым радзей ясі, тым радзей табе патрабуецца дапамога. Прасіць дапамогі ў іншых — самая страшная і непрыемная рэч у жыцьці.

Абыход. Атачаны маладзенькімі студэнтамі, па палатах ходзіць лекар. Падыходзіць да майго ложка. Зазірае ў маю гісторыю хваробы і чытае ўголас. Гаворыць пра мае рукі, ногі і пра разумовую недастатковасьць. Я прывык. Абыходы бываюць часта.

Лекар здымае зь мяне прасьціну, дастае ўказку, доўга і нудна паказвае інэртным студэнтам маё цела. Тлумачыць ім мэтады лекаваньня і іншую лухцень. Студэнты амаль сьпяць.

— Колькі будзе два плюс два? — пытае ён мяне нечакана.

— Чатыры.

— А тры плюс тры?

— Шэсьць.

Студэнты весялеюць, амаль прачынаюцца. Лекар каротка і пераканаўча тлумачыць ім, што ў мяне пашкоджаныя ня ўсе ўчасткі мозга. «Хлопчык нават памятае сваё імя і пазнае лекараў». Ён пасьміхаецца мне. Я ведаю такія ўсьмешкі, ненавіджу іх. Так пасьміхаюцца вельмі маленькім дзецям ці жывёлам. Нязшчыра пасьміхаюцца.

— А колькі будзе два памножыць на два?

Слова «памножыць» ён вымаўляе з асаблівым націскам. Гэта ўжо занадта. Нават для мяне гэта ўжо занадта, нават у гэтай клятай больніцы.

— Двойчы два будзе чатыры, тройчы тры — дзевяць, чатыры на чатыры — шаснаццаць. Мне халодна. Накрыйце мяне прасьціной ці хаця б зачыніце фортку. Так, я дэбіл, я гэта ведаю, але дэбілам таксама бывае халодна. Я вам не паддосьледны трусік.

Словаспалучэньне «паддосьледны трусік» я падслухаў у перавязачнай. Лекар вельмі дзіўна глядзіць на мяне. Стаіць. Маўчыць. Дзяўчына зь ягонай сьвіты хутка схіляецца да мяне, накрывае прасьцінай і гэтаксама хутка адыходзіць.

Абыход завершаны.

Увечары да мяне прыходзіць жанчына ў хатняй сукенцы, маладая і прыгожая. Яна без халата. Ужо больш за год я ня бачыў людзей без халатаў. Рашуча нахіляецца да мяне, пытае:

— Ты гішпанец?

— Так.

— Я таксама гішпанка. Вучуся ў пэдагагічным інстытуце. Нам задалі перакazаць «Слова пра паход Ігаравы». Тэкст складаны, я нічога не разумею, ты не дапаможаш?

— Але я яшчэ маленькі, а вы ў інстытуце вучыцеся.

— Кажы мне «ты».

— Добра, я паспрабую табе дапамагчы.

Яна дастае з торбачкі кнігу, прысоўвае крэсла да майго ложка, чытае. Чытае павольна, амаль па складах. Большасьць «незразумелых» словаў я ведаю, а для тых, што мне незнаёмыя, у кнізе зробленыя зручныя спасылкі. Добрая кніга.

Цямнее. Ёй час сыходзіць. Яна загортвае кнігу, падводзіцца.

— Мы яшчэ ня ўсё прачыталі, я прыйду заўтра. Мяне завуць Лаліта.

— Мяне — Рубэн.

Яна ўсьміхаецца.

— Я ведаю, як цябе завуць. Я прыйду заўтра, Рубэн.

Уначы я амаль ня спаў. Да мяне яшчэ ніхто ніколі не прыходзіў. Амаль ва ўсіх «на волі» хтосьці быў: бацькі, бабулі зь дзядулямі, браты і сёстры. Да аднаго хлопца-грузіна прыязджаў нават стрыечны брат. Ягоныя бацькі памерлі, ён рос у дзядзькі. Грузін тлумачыў мне, што стрыечны брат — яго крэўны сваяк. А крэўны сваяк, казаў ён мне, гэта самы блізкі чалавек на зямлі. У яго было шмат крэўных сваякоў. У мяне не было нікога.

На наступны дзень да нас прыйшлі шэфы. Пэдагагічны інстытут раптам узяў шэфства над дзіцячым аддзяленьнем нашай больніцы. То бок фармальна шэфамі, яны, пэўна, былі і да гэтага, але менавіта ў гэты дзень яны прыйшлі менавіта ў нашу палату. Сярод шэфаў, натуральна, была Лаліта. Паўзьверх сукенкі яна накінула белы халат.

— Бачыш, я прыйшла. Чаму ты плачаш?

### Рукі

У мяне няма рук. Тое, чым я вымушаны абыходзіцца, можна назваць рукамі толькі зь вялікай нацяжкай. Я прывык. Указальным пальцам левай рукі я здольны друкаваць на кампутары, у правую ў стане ўкласьці лыжку і нармальна паесьці.

Жыць бяз рук можна. Я ведаў бязрукага хлопца, які няблага прыстасаваўся да сваёй сытуацыі. Ён рабіў усё нагамі. Нагамі еў, прычэсваўся, распранаўся і апранаўся. Нагамі галіўся. Нават навучыўся прышываць гузікі. Нітку ў іголку ён таксама прасоўваў самастойна. Кожны дзень ён трэніраваў сваё хлапечае цела — «качаўся». У дзетдомаўскіх бойках ён без асаблівых намаганьняў мог ударыць суперніка нагой у пах ці сківіцу. Піў гарэлку, заціскаючы шклянку зубамі. Нармальны дзетдомаўскі пацан.

Жыць бяз рук ня так ужо і цяжка, калі ў цябе ёсьць усё астатняе. Усё астатняе — маё цела — развывітае яшчэ горш за рукі. Рукі — галоўнае. Можна сказаць, што галоўнае ў чалавека галава. Можна і не казаць. І так зразумела, што галава бяз рук выжыць ня зможа. Ня важна, свае гэта рукі ці чужыя.

У Сяргея рукі былі. Дзьве абсалютна здаровыя моцныя рукі. Рукі, плечы, галава. Сьветлая галава. Сяргей Міхалкоў. Сярожа. У школе ён быў адным з найлепшых вучняў. Гэтага яму было мала. Ён увесь час чытаў навукова-папулярныя часопісы, удзельнічаў у завочных конкурсах для школьнікаў, выконваў надрукаваныя ў часопісах заданьні, пасылаў, атрымліваў нейкія граматы.

Ніжэй поясу ляжалі ў пастаянннай позе лотасу дзьве скручаныя ножкі. Ніжэй поясу ён нічога не адчуваў, абсалютна нічога, таму вымушаны быў увесь час насіць мочапрыёмнік. Калі мача з мочапрыёмніка пралівалася, ён мяняў нагавіцы сам. Ён усё рабіў сам. Яму ня трэба было клікаць нянечак, прынімжацца, прасіць дапамогі. Ён сам дапамагаў тым, каму пашанцавала менш. Карміў сябра з лыжкі, дапамагаў мыць галаву, пераапранацца.

У яго не было бацькоў. Ён ня быў хадзячым. Пасьля школы яго адвезьлі ў дом састарэлых.

У доме састарэлых яго паклалі ў палату з двума дзядулямі. Бяскрыўдныя дзядулі. Адзін — шавец — варыў шавецкі клей на электрычнай печцы, другі — дахадзяга — амаль нічога ўжо ня цяміў, зь ягонага ложка сьцякала мача. Зьменнай бялізны Сярожу не далі. Патлумачылі, што мяняць нагавіцы яму палажана раз на дзесяць дзён. Тры тыдні ён ляжаў у палаце з пахам дзярма і шавецкага клею. Тры тыдні нічога ня еў, імкнуўся піць менш вады. Прывязаны да свайго мочапрыёмніка, ён не наважыўся выпаўзьці на вуліцу голым, каб у апошні раз убачыць сонца. Праз тры тыдні ён памёр.

Праз год у гэты дом састарэлых павінны былі адвезьці мяне. У Сяргея былі рукі, у мяне не было.

### Мова

Інтэрнат. Дом састарэлых. Дом апошняга майго прытулку. Канец. Тупік. Я выпісваю ў сшытак няправільныя ангельскія дзеясловы. Па калідоры вязуць каталку з трупам. Дзядулі і бабулі абмяркоўваюць заўтрашняе мэню. Я выпісваю ў сшытак няправільныя ангельскія дзеясловы. Мае пагодкі-інваліды зладзілі камсамольскі сход. Дырэктар інтэрнату зачытаў у актавай залі вітальную прамову, прысьвечаную чарговай гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Я выпісваю ў сшытак няправільныя ангельскія дзеясловы. Дзядуля, былы зьняволены, падчас чарговай п'янкі праламіў мыліцаю галаву суседу па палаце. Бабулька, заслужаны вэтэран працы, павесілася ў сьцянной шафе. Жанчына ў інвалідным вазку зьела жменю таблетак на сон, каб назаўсёды пакінуць гэты правільны сьвет. Я выпісваю ў сшытак няправільныя ангельскія дзеясловы.

Усё правільна. Я не чалавек. Я не заслужыў большага, ня стаў трактарыстам ці навукоўцам. Мяне кормяць з жалю. Усё правільна. Так трэба. Правільна, правільна, правільна.

Няправільныя толькі дзеясловы. Яны ўпарта кладуцца ў сшытак, прабіраюцца праз шоргат радыёперашкод. Я слухаю няправільныя дзеясловы няправільнай, ангельскай, мовы. Іх чытае няправільны дыктар зь няправільнай Амэрыкі. Няправільны чалавек у наскрозь правільным сьвеце, я ўпарта вучу англійскую мову. Вучу проста так, каб не звар'яцець, каб ня стаць правільным.

* * *

Мая дачка лепіць тату. Ляпіць тату лёгка. Прасьцей, чым грыбок. Трэба раскачаць дзьве круглыя ляпёшкі плястыліну. Дзьве аднолькавыя ляпёшкі, два колы інваліднага вазка.

### I go

Ангельская мова. Мова міжнацыянальных стасункаў. На расейскую можна перакласьці амаль усё. Ад паэзіі Шэксьпіра да інструкцыі па эксплюатацыі лядоўні. Амаль усё. Амаль.

* * *

Інвалідны вазок. Амэрыканскі інвалідны вазок. У мяне ў руцэ — джойстык кіраваньня. Паслухмяная машына перасоўвае маё нерухомае цела па вуліцы амэрыканскага мястэчка.

Я пераяжджаю на чырвонае сьвятло. Гэта й ня дзіва. Я пераходжу першую ў сваім жыцьці вуліцу. Вазок яшчэ не зусім паслухмяны загадам маёй спаралізаванай рукі.

Машыны стаяць.

З машыны, якая стаіць у левым скрайнім шэрагу, высоўваецца радасны кіроўца, махае рукой і крычыць нешта ўхвальнае.

Падыходзіць паліцыянт. Па маім ашалелым выглядзе ён здагадваецца, чаму я парушыў правілы.

— У вас усё добра?

— Так.

— Вы зрабілі вельмі правільна, калі вырашылі выйсьці на вуліцу. Удачы вам!

* * *

Дзяўчына-амэрыканка ў інвалідным вазку з гонарам паказвае мне мікраaўтобус з пад'ёмнікам і распавядае, што такія мікраaўтобусы маюць усе таксапаркі Амэрыкі.

— А хіба нельга было пераабсталяваць для інвалідаў звычайныя легкавікі? Гэта было б таньней, — пытаю я.

Дзяўчына глядзіць на мяне разгублена і ніякавата.

— Але ж у пераабсталяваным легкавіку можна перавозіць толькі аднаго чалавека ў вазку! А калі гэта будуць хлопец зь дзяўчынай? Яны што, па-твойму, павінны ехаць у розных машынах?

* * *

На расейскую можна перакласьці амаль усё. Ад паэзіі Шэксьпіра да інструкцыі па эксплюатацыі лядоўні. Амаль усё. Амаль.

Я магу доўга распавядаць пра Амэрыку. Магу бясконца распавядаць пра інвалідныя вазкі, пра ліфты, якія гавораць, пра роўныя дарогі, пандусы, мікраaўтобусы з пад'ёмнікамі. Пра сьляпых праграмістаў, паралізаваных навукоўцаў. Пра тое, як я плакаў, калі мне сказалі, што трэба вяртацца ў Расею і вазок давядзецца пакінуць.

Але тое, што я адчуў, калі сапраўды скрануў зь месца цуд амэрыканскай тэхналёгіі, лепш за ўсё перадаецца кароткай і ёмістай ангельскай фразай: «I go». І на расейскую мову гэтая фраза не перакладаецца.

* * *

Гэта Амэрыка. Тут усё прадецца і ўсё купляецца. Жудасная, жорсткая краіна. Разьлічваць на шкадаваньне не выпадае. Але шкадаваньня я ўдосыць наеўся яшчэ ў Расеі. Мяне задавольваць звычайны бізнэс. Гэта Амэрыка.

— Што прадаецца?

— Дзень волі. Сапраўднай волі. Сонца, паветра. Цалуюцца парачкі на лавах. Хіпі грае на гітары. Права яшчэ раз убачыць, як маленькая дзяўчынка корміць вавёрку з далоні. Першы і адзіны раз у сваім жыцьці ўбачыць начны горад, сьвятло тысяч аўтамабільных фараў. У апошні раз палюбавацца на нэонавыя шыльды, памарыць пра немагчымае шчасьце нарадзіцца ў гэтай цудоўнай краіне. Зроблена ў Амэрыцы.

— Колькі каштуе?

— Ледзь-ледзь менш за жыцьцё.

— Купляю. Рэшты ня трэба.

* * *

А потым у Расеі я цэлы месяц жор гарэлку з ранку да вечару, плакаў уначы і ў п'яным трызьненьні спрабаваў намацаць джойстык кіраваньня няіснага, мітычнага вазка. І кожны дзень шкадаваў аб тым, што ў адказны момант зрабіў няправільны выбар.

### Чорны

Я не люблю белага колеру. Белы — колер бясьсільля і асуджанасьці, колер больнічнай столі і белых прасьцінаў. Гарантаваны клопат і апека, цішыня, спакой, нішто. Вечнае нішто больнічнага жыцьця.

Чорны — колер барацьбы і надзеі. Колер начнога неба, упэўнены і выразны фон сноў, часовых паўзаў паміж белымі, бясконца доўгімі дзённымі прамежкамі цялеснае немачы. Колер мары і казкі, колер унутранага сьвятла закрытых павекаў. Колер свабоды, колер, які я выбраў для свайго электравазка.

А калі я прайду сваёй чаргой праз шэраг добразычліва-безаблічных манэкенаў у белых халатах і нарэшце прыйду да свайго канца, да маёй асабістай вечнай ночы, пасьля мяне застануцца толькі літары.

Мае літары, мае чорныя літары на белым фоне.

Я спадзяюся.

**Паводле «Иностранной литературы», №1'2002**

Сяргей Астравец

# Цыфэрблят

Не люблю, калі пасьля Калядаў раптам мароз зусім раствараецца ў паветры, падае ціск. Ходзіш як прыгаломшаны. Сонца зьнікла разам з холадам. Шэры каламутны дзень. Сьнег спакваля траціць свае якасьці. Нябачная падэсьць зьнішчае яго моц і здароўе. Яго бадзёрасьць і аптымізм. Як кавалак рафінаду ў шклянцы з гарбатай зьнікае навідавоку. А наперадзе — прывід мокрага Новага году. На сьцяне сапсаваны гадзіньнік і ў шуфлядзе таксама. Нядобрая прыкмета? Вядома: лепей, каб усе стрэлкі рухаліся, каб адлюстроўвалі зьмены часу. Каб дзялілі жыцьцё на хвіліны-гадзіны. Але спыненыя або жвавыя — гадзіньнікі адбіваюць рэчаісны стан гарадзкога жыцьця.

Не зіхатліва, ня срэбна, не іскрыста? Ня надта сьвяточна. Не параўнаць зь леташнім. Ніякіх падставаў для аптымізму тады быць не магло. А вось жа, нейкі імпэт, навізна — беспадстаўныя, нематываваныя. Крыху абсурдна. Магчыма. Але чаканьне нейкай прыемнасьці лунала ў зімовым паветры. Адчувалася ў жвавасьці мінакоў, усьмешках, радасных выгуках. Хоць чакаць, бадай, не выпадала. Але так зроблены чалавек. Спрыялі настрою навацыі. У дадатак да своеасаблівага ўнутранага стану, неакрэсьленых надзеяў. Упершыню некалькі асьветленых уначы камяніц. Халодныя нэонныя фаервэркі. Зіхатлівыя агеньчыкі ў вокнах. Ялінка з каляднай музычкай на банкаўскім бальконе. Ці яна сапсавалася? Хоць, здаецца, банк ляснуў. Давялося доўга швэндацца па рынку, выбіраючы гірлянды зь лямпачак. Пакуль я не пераканаўся, што абыякавы да іх. Яшчэ летась мы адныя ў доме вывешвалі на акне ў сьвяточны час сьціплую гронку старых лямпачак. Спадзяваліся: наступным разам набудзем новыя — шмат і міготкія.

Елкі, ілюмінацыя ў вокнах — замест асьвятляць, мігатліва афарбоўваць сьнежную бель, адбіваюцца блікамі ў лужынах. Залюбіў зіму? Неверагодна! У цябе пытаюцца: што з табой, Вітольдзе? Няўжо табе стала даспадобы славэтная сібірская зіма, якой працягваюць мроіць жанчыны ў вялізных футрах і шапках?! Якіясьці футраныя сьнежныя бабы на вуліцах, зьнявечаных і зьнядужаных адлігай. Потныя і дыхавічныя. Ты што, з глузду зьехаў? Ды не, чаму. Я ня ведаю, папросту я заўжды ненавідзеў зіму з марозам і ўсячасным ветрам. Ненавідзеў замерзлую пасьля адлігі слату. А тут клясычная зіма. Бяз прыкрасьцяў. І яшчэ ўлічыце натуральную рэакцыю на лета, якое зрабілася трапічным.

Перад Калядамі званок з радыёстанцыі, папрасілі што-небудзь «прыгожае і мілае». Пайшоў да касьцёлу. Спачатку на ганку пачакаў з дыктафонам у руцэ, пакуль не пачне адбіваць час гадзіньнік на званіцы. Мароз пстрыкаўся. Бом-бом-бом! Сьпяшаўся мой гадзіньнік ці адставаў вежавы. Перад шопкай стаялі на каленях. Дзяўчаты. Малады мужчына ўзьняўся з каленяў неўзабаве, як укленчыў ты. Спачатку перажагнацца, затым агледзецца. Каб запомніць і пераказаць, што тутака — у стайні, дзе нарадзіўся хлопчык, — ёсьць. Здаецца, фігуры людзей і жывёлаў іншыя, чымся летась. І яны перастаўленыя, сцэна зроблена крыху інакш. Але запомніць парадак, падрабязнасьці заўжды цяжка.

Рука цягнецца па дыктафон. Адчуваю на сабе погляд гладкага маладога ксяндза, які назірае седзячы ззаду і, здаецца, выдае за ахвяраваныя грошы аплаткі. (Галоўнае — не сказаць «прадае».) І ўвогуле — абапал людзі. Яны моўчкі моляцца. Гаварыць у дыктафон, нават ціхенька, не выпадае. Перажагнацца і ўстаць. Краем вока заўважыць недаверлівы ксяндзоў позірк. Памачаць пальцы ў каменнай купелі зь сьвятой вадою, перажагнацца, прыкласьціся вуснамі да ўкрыжаваньня. Выйсьці і паведаць у дыктафон, што бачыў. Мужчыны, паставіўшы рыштаваньні, абкручвалі статую сьвятога ў фасаднай нішы шнуром зь лямпачкамі.

Я вярнуўся дахаты і напісаў: «СЁНЬНЯ З РАНІЦЫ КАТЭДРАЛЬНЫ КАСЬЦЁЛ АЗДАБЛЯЛІ ІЛЮМІНАЦЫЯЙ. УПЕРШЫНЮ НА БОЖАЕ НАРАДЖЭНЬНЕ ЁН БУДЗЕ АСЬВЕТЛЕНЫ». І далей: «Падсьвечвацца таксама будуць статуі апосталаў на фасадзе. 24 сьнежня ўвечары заўжды адбываецца «пастэрка». Так называюць набажэнства, прысьвечанае нараджэньню Езуса Хрыста. З пачатку дня ў Катэдры можна было набыць аплаткі, якімі каталікі дзеляцца падчас вігілійнай вячэры.

Штогод у касьцёле да гэтай даты стаўляюць «шопку». Гэта імітацыя вядомай біблійнай сцэны: маленькі Езус у ясьлях і навокал фігуры — людзкія і жывёлаў. А таксама — ялінкі. Дзеці павесілі на іх выразаныя з паперы рознакаляровыя сэрцы. Кожны напісаў імя і — пра свае добрыя ўчынкі, зробленыя да дня народзінаў Хрыста. Напрыклад, «я прапыласосіла і прыбралася ў сваім пакоі». Або — «я ня слухала музыкі, ня танчыла, а дапамагала маці і добра вывучыла урокі». «Я сябравала з коцікам, лашчыла яго і налівала яму малачко».

Сядзеў і марудзіў з адпраўкай. Заманулася дадаць, што спаўняецца трыста гадоў з часу асьвячэньня катэдры. Трэба ўдакладніць. Безвыніковыя пошукі. Не адказвала касьцельная канцылярыя. Заўпарціўся, стаў марнаваць час. Знайшоў! Абач, памыліўся з датай, але асьвячалі катэдру нават двойчы. Другім разам — дзеля палітычных разьлікаў. У горад прыбыў вельмі баявы і ваяўнічы цар-імпэратар. Шмат кавалерыі, рушніц, гарматаў. Штандары і барабаны. Яго запусьцілі разам з каралём у катэдру. Ліса з маскай авечкі.

Ужо тады на катэдральнай званіцы паказваў эўрапейскі час стары ратушны дзыгар. Ратушу разбамбавалі. Гадзіньнік дзівам ацалеў. Тады гэта быў вельмі дарагі мэханізм. Як сёньня, прыкладам, гелікоптэр. Але, адрозна ад яго, яшчэ вельмі рэдкі, паасобны мэханізм. На ратушы гораду не асабліва шанцавала. Другую, навейшую, ацалелую пасьля самай бязьлітаснай вайны, зруйнавалі самі пераможцы. А вось ратушны гадзіньнік неяк ацалеў, па сутнасьці выпадкова. Але ў самім факце, у яго нетрываласьці, адчуваецца пэўны сымбаль. Гэта горад, дзе ўсё можа здарыцца. Могуць рэквізаваць храм, перарабіць яго на швальню, паставіць канвэер, а могуць і адразу зруйнаваць, каб зьверху — танк або статую. Могуць узнагародзіць, а могуць — і бізуноў. Могуць даць акампаніятара, а могуць кляп.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Сяргей Астравец — пісьменьнік, журналіст, жыве ў Горадні. Ягоная апошняя кніга — «Лісты да хома саветыкуса».**

Вось такі ў нас горад. Але я пасьпяшаю ў каралеўскі палац, там гадзіньнікі. Каб потым напісаць першыя радкі — вялікімі літарамі: «САМЫ СТАРАЖЫТНЫ ГАДЗІНЬНІК КРАІНЫ ЗНАХОДЗІЦЦА МЕНАВІТА Ў НАШЫМ ГОРАДЗЕ. СЁНЬНЯ Ў АВАЛЬНАЙ ЗАЛІ ПАЛАЦУ ЭКСПАНУЕЦЦА ЦЭЛАЯ КАЛЕКЦЫЯ РАЗНАСТАЙНЫХ ГАДЗІНЬНІКАЎ». У перадсьвяточныя дні на такія паведамленьні попыт. Хочацца прыгожага, прыемнага, што стварае настрой, не дае зусім замаркоціцца. А зараз сядай ды пішы: «Гараджанам паказвае час ратушны гадзіньнік, якому каля паўтысячагодзьдзя. Ён на высокай званіцы Катэдральнага касьцёлу. Тамака, адкуль бачна ўсё. А гучыць вельмі самавіта. (Гук). Ягоны стары цыфэрблят выстаўляецца сёньня ў авальнай залі Каралеўскага палацу. Ён вельмі вялікі і ляжыць на падлозе. А навокал мноства гадзіньнікаў. Пераносныя, камінныя, карэтныя, марскія храномэтры. Гаворыць захавальніца гадзіньнікаў спн.Віслава: «Усяго тут каля 90 гадзіньнікаў. Толькі палова заводзіцца, і яны працуюць. Цяжка іх заводзіць, таму што яны такія чулыя. Трэба, каб роўная паверхня была. Гадзіньнікі — яны як жывыя істоты. Мы гаворым пра іх, што яны ходзяць, б'юць. І хацелася б, каб усе гэтыя гадзіньнікі зараз хадзілі».

А паказваюць час толькі чатыры. Вось як гучыць падлогавы гадзіньнік. (Гук). Ён зроблены ў Нямеччыне ў 30-х гадох мінулага стагодзьдзя. (Хацеў быў напісаць: у часы фюрэра… Але падумаў, што можа выйсьці недакладнасьць. Дый не пасьвяточнаму зусім.) Побач — ангельскі падлогавы гадзіньнік XIX ст. Але ён не заведзены. У палацавых памяшканьнях адчуваецца подых гісторыі. Ён стаў апошняй рэзыдэнцыяй апошняга караля шляхецкай Рэспублікі Liberum Veto. Тут адбыўся славэтны «сойм з вадой у роце». Фэдэратыўную дзяржаву падзялілі паміж сабой Остэррайх, Прусьлянд ды Імпэрыя. Пра тыя часы нагадвае адзін экспанат.

Гаворыць музэйная супрацоўніца: «Ёсьць у нас сонечны гадзіньнік XVIII ст. Зроблены ў 1781 годзе на тэрыторыі Вялікага Княства Шляхецкага. Па замове прадстаўніка роду Бучынскіх. Гэты гадзіньнік зрабіў майстар Ігнаці Манувэр». Яна ганарыцца, што ў яе горадзе дагэтуль адмервае час знакаміты гадзіньнік на званіцы Катэдральнага касьцёлу: «Наш гадзіньнік — адзін з найстаражытнейшых у Эўропе. Яму амаль пяцьсот гадоў. Гэта ўнікальны помнік сярэднявечнай мэханікі».

Пры Памяранскай Буржуазнай Рэспубліцы ў горадзе існавала сваё ювэлірна-гадзіньнікавае прадпры-


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Гэта горад, дзе ўсё можа здарыцца. Сьцёршы леташні надпіс на дзьвярах, я вывеў крэйдай наноў: «К+М+В 2003. Каспар, Мэльхіёр, Бальтазар».

# Апавяданьне з гадзіньнікамі



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

емства. Зроблены на ім буднік можна сёньня ўбачыць у Каралеўскім палацы сярод іншых гадзіньнікаў. Буржуям трэ было мець свой час, замаўляць яго, уплываць, кантраляваць. І каб усё прыгожа. Ня проста стрэлкі з цыфэрблятам, але ў залатым футарале, у аздобе каштоўных каменьчыкаў. А потым гэтую справу цэнтралізавалі. Вырабляць гадзіньнікавыя мэханізмы, як і друк грошай, дазвалялася толькі ў далёкім бабілёнскім горадзе. За высокім чырвоным мурам.

Вось жа, для гадзіньнікаў патрэбны асаблівыя, але адначасам — папросту нармальныя ўмовы. Нармальныя. Як чалавеку — чыстае паветра, крынічная вада, сонца. Крама з кітайскімі гадзіньнікамі — насупраць гмаху нашай улады. Драўляныя, нават лякаваныя асады, але цыфэрбляты бутафорскія. Выгнуты кардон з намаляванымі лічбамі, бляшанымі стрэлкамі. Тандэт. Кітайскі шлях уладам вельмі даспадобы. Крама з кітайскімі. Майстэрня з старымі савецкімі, якія хранічна псуюцца.

Свой пясочны кабінэтны гадзіньнік былы кароль забраў у халодную чужую сталіцу, сам адпраўлены туды пад хатні арышт. У доўгія белыя ночы пясок абыякава перасыпаўся ў колбах, выклікаючы сум у экс-каралеўскай душы. Галоўны палацавы гадзіньнік, які аздабляў порцік, разам з каралём вывезьлі ў якасьці трафэю. Замест яго павесілі гербавага дзьвюхгаловага драпежніка. У імпэрыі не павінна быць у нікога свайго часу, час — адзіны, бабілёнскі. Войны, зьмены сталіц, межаў. Імпэрыя вярнулася. І заманулася зьнішчыць касьцёл з гадзіньнікам. Каб не паказваў часу, каб не маліліся і не было над горадам крыжоў ды анёлаў з музычнымі трубамі. Як проста! Бабах! — і пустое месца. Бог абараніў сьвятыя муры, але гадзіньнік улады спынілі. І — плёмбы сьвінцовыя.

Каляды. У Рыме дождж. У Ватыканскай бібліятэцы рамонт. Упершыню Сьвяты Айцец чытае сваё каляднае пасланьне не з вышыні бібліятэчнага акна, а седзячы на вуліцы пад павецьцю. Ён абвяшчае адпушчэньне грахоў усім, хто яго цяпер чуе і бачыць, у тым ліку тэлегледачам. (Але ўсё адно трэба наведаць абавязкова касьцёл, нагадвае ён). Віншаваньне на пяцідзесяці пяці мовах. Чаканьне са стоеным сэрцам. «Дарагія беларусы! Вясёлых калядных сьвятаў!» А ў адказ цішыня. Нечаканыя сьлёзы ў Агнеты ў вачах. Аркестар карабінэраў у чорных жандарскіх — часоў Гарыбальдзі — капелюшах з плюмажам. Батальён італьянскага войска — розных родаў роты. Бутафорская папская гвардыя з алебардамі і дзідамі.

А віно мы так і не пасьвяцілі. На дзень сьвятога Стэфана толькі польская імша. «Шакаляд» — назва начнога фільму. З Жульет Бінош. Каменная вёска з мураванымі тысячагадовымі дамамі. Вельмі стары касьцёлік і нечакана досыць сучасная, крыху карыкатурная статуя перад уваходам. Паказная бажлівасьць, да крывадушнасьці. Пурытанскія норавы. Увечары ўся вёска абавязкова ў касьцёле. Зьяўленьне кавярні-«шакалядніцы» выклікае байкот. Густы гарачы шакаляд, салодкія піроржныя, экзатычныя арэхі, якія выклікаюць жаданьне кахацца. Не заходзіць, не купляць, ня есьці! Урэшце завадатар ціхай вайны апынаецца крадком у вітрыне, сквапна пачынае пажыраць вежы шакаляднага замку. Яго знаходзяць раніцай на месцы злачынства. З разьняволеным, перапэцканым у шакаляду тварам. Яму сьніцца штосьці прыемнае.

Адчуваньне сябе на лініі фронту. «Што яны нам навязваюць гэтага замежнага Санта Клаўса? У нас ёсьць свой славянскі Дзед Мароз», — шчыруюць на вуліцы дзьве кабеткі. А Сьвяты Мікола — ён ужо не славянскі? Барацьба гэтая адлюстроўвае трагікамічнасьць, фарс сёньняшняга жыцьця тут і цяпер. Тэлебачаньне настойліва паўтарае сюжэт пра Цьмутаракань, дзе жыве Дзед Мароз. Ляпляндыя лічыцца ледзьве не варожай тэрыторыяй. У тэлевізары размаляваная, як прастытутка, Сьнягурка ў велізарным какошніку, якіх не бывае. На дзяржаўных ёлках з начальствам, якое частуе цукрам-мядовічам. Электронная пошта дастаўляе каляровыя віншавальныя паштоўкі. Санта Клаўса, які танчыць з аленямі макарэну. Або Дзеда, які са Сьнягуркай вырабляе якуюсьці цыганачку. На сталічнай фабрычцы расфарбоўваюць для елак зоркі зь сярпамі-молатамі, шары і дзядоў марозаў старарэжымнага выгляду.

З Новага году не запомнілася нічога. Можна сказаць, што нічога. Папросту начная вячэра. Адно што электрычнасьць зьнікла а другой гадзіне. Адвесілі вокны, запалілі рэшткі сьвечак. Штосьці ў розных баках выбухала, лётала па небе з галасьлівым посьвістам. Але безь весялосьці, безь пераможнасьці. Гэта штосьці няўлоўнае, суб'ектыўнае, але лунае ў паветры. Адчуваецца ў мінаках. Цяпер гэтага я не заўважыў. Так, яшчэ не ўдалося ружовага шампанскага купіць. Ня страшна, але трансыльванскае Batory усё ж лепей ад звыклага савецкага. Куды ж яно зьнікла? Цікавыя толькі экзатычныя драўляныя каты з падарункавай крамкі.

Раскруціў драцяны жгуцік, зьняў фальговы каптур, абхапіў корак. Але ўперад скасаваў загрымаваны тэлетвар. У руцэ келіх. Непрыхільныя вочы з штучнай саладжавасьцю. Кісляваты брут, выдаваны за салодкае шампанскае. Бом-бом-бом! Хутчэй! Дзвынк-дзвынк-дзвынк — ура! «Мы, панславяне, царкоўныя атэісты... Станем сьцяною на нашай мяжы. NATO адпрэчым, мір адваюем. І з панславізмам пайдзём па зямлі... Вып'ем за волю, вып'ем за долю. Чырвона-цагляная крэпасьць — сьвятыня — твая і мая!» Хор у модных вушанках і дарагіх кажухах сьпяваў на тле каталіцкага храму, перарobленага ў бацюшкаву бажніцу. Сьвяточнае тэлемэню — бы комплексныя абеды.

Хіба што «Тры каралі», улюбёны дзень, пакінуў у душы штось падобнае да сьвяточнасьці. Я быў нягалены. Закончыў, праўда, своечасова, адлучыў кампутар, пайшоў пад'есьці. Агнета сказала: а як жа «Тры каралі»? Але я нягалены, я ўжо не зьбіраўся. Як жа, гэта ж нашае ўлюбёнае сьвята?! Як ты можаш? Мы ж дамаўляліся! Мароз здаўся самым моцным з пачатку зімы. Вольнае месца знайшлося толькі на бакавой лаве, адкуль ня бачна ксяндза. Насупраць каралеўскага гарэльефу. Аднекуль зьявіўся зусім зялёны жаўнер, апрануты нібы апалчэнец. (Глыток іншага паветра пасьля казармы, дзе ўсіх пагалоўна стрыжэ на свой капыл барадаты бацюшка.) Ня ўсё яшчэ страчана! Ксяндза мы ўсё ж убачылі, калі ён прайшоў узад-уперад ад алтара да дзьвярэй, апырскваючы сьвятой вадою налева-направа. Некаторыя з бакавых лаваў памкнуліся, каб на іх таксама трапіла. А потым асьвячэньне крэйды і кадзідла (а як жа міра і золата?!). Сьцёршы леташні надпіс на дзьвярах, я вывеў крэйдай наноў: «К+М+В 2003. Каспар, Мэльхіёр, Бальтазар».

Гадзіньнік у пакоі. Загадкавы рух стрэлак. Гук зьнікае, яго не чутно, толькі бачна, што стрэлкі не спыняюцца. Цік-цік-цік-цік — бязгучна. Невытлумачальна. Сэкундаў праз дзесяць яны зноўку выразна гучаць. Як сэрца абрываецца зьнянацку. Вітольд зрынаецца ў калодзеж, у бяздоньне. Колькі разоў у дзеях гораду абрывалася сэрца часу, замірала сьцятае. Спынялася хада вялікага гадзіньніка. Псаваўся або яго спынялі. Дэкрэтам, указам, рэскрыптам ці звычайным загадам. Або пастановай якога-небудзь нікчэмнага Івана Іваныча. Банальным галасаваньнем на партбюро, на сходзе помсьлівых няўдакаў.

Ратушны гадзіньнік дзесяцігодзьдзі стаяў. Спачатку забаранілі накручваць. І майстры неўзабаве перавяліся. Памерлі, не пакінуўшы сакрэтаў прафэсіі. Па-над горадам панавалі спыненыя стрэлкі. Раптоўны інфаркт. Людзі жылі, не ўзьнімаючы вачэй. Вядома, звонку гэта ня Бог вед які гадзіньнік. Звычайны цыфэрблят, адно мэханізм старасьвецкі, але яго не відаць. А большасьць мінакоў нават не падазрае аб ягоным веку. Такія рэчы іх не цікавяць. Так, гэта ня праскі і ня мюнхенскі — з каляровымі рухомымі фігуркамі, з мэханічнай батлейкай, так бы мовіць. Рух па коле пад сярэднявечную музыку нябачнай катрынкі. Карагод, прадстаўленьне, якое паўтараецца штогадзіны. Гэтага ў нас няма. Нашыя кляйноты схаваны ад пабочнага вока.

Уражаньне ад старога цыфэрблята, які ляжыць на музэйнай падлозе. У памяшканьні, дзе кароль падпісаў акт адрачэньня, дзе скончыліся старыя добрыя часы, дзе пахавалі Liberum Veto. Вялікі цыфэрблят на паркеце. Пакінуты панцыр чарапахі, усё, што ад яе засталося. Зьмяіная скура. А таксама — чамусьці — вялізныя сеткаватыя крылы кузуркі. Гіганцкага коніка, саранчы. Грэгара, які ператварыўся ў насякомае, у прусака. Крылы, зробленыя Леанарда. Або якія належалі Дэдалу з Ікарам. Цыфэрблят нагадвае мне таксама стары герб на фасадзе. Аграмадную сьцёртую манэту, знойдзеную археолягамі. Гінэю з Гулівэравай кішэні. Нават рыцарскі шчыт, прыпетаваны да замкавай брамы.

Спаткаліся выпадкова на сьлізкай гразкай вуліцы з чыноўнікам зь вялікага гмаху. Раней змагаліся зь ім у газэце — за колькасьць радкоў, за перабудову і публічнасьць. Ты ведаеш, гаворыць, яшчэ, здаецца, нядаўна прыяжджалі знаёмыя палякі, начавалі ў мяне на канапе, на падлозе. Езьдзілі па райцэнтрах, шукалі плітку чорную, дальныя апараты — усё запар. У іх былі пустыя паліцы. А цяпер некаторыя толькі шкадуюць нас, іншыя кпяць. А большасьць намі не цікавіцца. Мы страцілі дзесяць гадоў. У іх цяпер усё іншае — час, жыцьцё... І газэты таксама, дадаў я. Так, і газэты, згадзіўся ён. І, павагаўшыся, закончыў: а шмат хто яшчэ не разумее, што ў нас гэта надоўга, вельмі надоўга. Liberum Veto...

Вось і аскомны Старановагод. Рэшткі салютаў. Шумавіньне сьвяточнасьці. Але ты ўжо даўно спаў. Нічога ня чуў і ня ведаў. І не хацеў. Нараніцу сьнег пачаў імпэтна раставаць, дажджыла. Каб наступнага дня сьнегу не засталося, і — з пэўнай вінаватасьцю — каб запанавала студзеньская вясна. Сьнег растаў, ілюмінацыя пагашана. Яліну рэжуць сярод лужын на дровы перад бронзавай статуяй дзядзькі ў фуфайках. Адно расквечвае пачарнелае вільготнае неба асьветлены касьцёл. Сьвяточны сылуэт бачны здалёк. Апроч цыфэрблята. Ён цёмны. Таямнічасьць часу. Схаваны рух стрэлак. Немагчымасьць ведаць час, спраўдзіць са сваім гадзіньнікам пры наяўнасьці вельмі вялікага вулічнага, вельмі старажытнага і дакладнага. Ён пануе над горадам. На касьцельных шпіцах яго ахоўваюць арханёлы. Войска Гасподняе. А калі іхнія трубы — ерыхонскія?

**Скончана 23 студзеня 2003 г.**

# Каляды ў Лёндане

Працяг са старонкі 23.

— Калі ласка, Дэрмат, замірыся зь містэрам Джойсам. Заедзь да яго, перадай шалік і папрасі выбачэньня.

— Выбачэньня?

— Ты ведаеш, пра што я, — насуперак яе жаданьню, у голасе пачуліся ноткі раздражнёнасьці ды неўласьцівай ёй раззлаванасьці. Яна ніколі не размаўляла так з Дэрматам. Здаралася, гэткім чынам яна зьвярталася да дзяцей.

— За што мне выбачацца, Нора?

— За тое, што сказаў тады ўвечары, — яна ўсьміхнулася, каб суняць хваляваньне. Ён запаліў яшчэ адну цыгарэту, полымя запальнічкі на імгненьне асьвятліла ягоны твар. На ім не зьмянілася ніводнай рыскі. Дэрмат прамовіў:

— Мне падаецца, Нора, паміж мною і містэрам Джойсам не было аніякай сваркі.

— Я ведаю, Дэрмат. Ты нічога такога не хацеў...

— Сваркі не было, любая.

Так, не было. Але ў той жнівеньскі вечар адбылося нешта іншае. А дзявятай у выпуску навінаў перадалі пра чарговы тэракт, і, калі Дэрмат выключыў тэлевізар, яны, як заўсёды, пачалі абмяркоўваць падзею. Містэр Джойс ізноў зазначыў, што не разумее людзей, якія могуць забіць першага-лепшага, бесьпрычынна. Дэрмат пакруціў галавою, сама яна назвала такія дзеяньні барбарствам. Пасьля Дэрмат дадаў, што, безумоўна, неабходна памятаць пра прыніжэньні, перажытыя каталікамі ў Паўночнай Ірляндыі. Выбухі — злачынства, але гэта не падстава, каб забыцца, што злачынства не адбылося б, калі б на Поўначы да некалькіх пакаленьняў каталікоў ня ставіліся як да быдла. Навісла ціша, невыносная ціша, якую яна сама й перарвала. «Усё гэта — у мінулым, — пасьпешліва, з напружаньнем вымавіла яна. — Аніщто ў мінулым або ў сучаснасьці, увогуле аніщто ня можа апраўдаць забойства бязьвінных людзей». «Нават калі й так, — дадаў Дэрмат, — гэта не падстава, каб замоўчваць праўду». Містэр Джойс маўчаў.

— Я кажу, Нора, ня трэба адвозіць яму шалік. Ён сам пастараецца прыйсьці да нас на Раство.

— Не, вядома ж, сам ён ня прыйдзе, — яна павысіла голас, у ім гучала цяпер ня проста раздражнёнасьць. Але яна кантралявала сваю злосьць. — Няма сумневу, ён ня прыйдзе.

— Цяпер самы час, Нора. Яшчэ адное Раство — напамін нам...

Ён гаварыў павольна. Зь ягонага цьвёрдага тону яна здагадалася, што гэта былі словы Божыя, пачутыя ў адказ на малітву.

Сама не жадаючы, яна з гарыччу выгукнула:

— Гэта ня проста новае Раство. Гэта нейкае жудаснае Раство, Раство, за якое павінна быць сорамна. І ты, Дэрмат, робіш яго яшчэ горшым!

Яе вусны непрыгожа ўздрыгвалі. Калі б цяпер яна паспрабавала супакоіцца, дык толькі б яшчэ болей разнэрвавалася і, магчыма, расплакалася б.

— Містэр Джойс паводзіў сябе высакародна і тактоўна, — голасна вымавіла яна. — Ён не зважаў на тое, што мы ірляндцы, што нашыя дзеці ходзяць у школу разам зь дзецьмі ўдзельнікаў ІРА. І вось ягоную высакароднасьць і тактоўнасьць шпурнулі яму ў твар. Кожнаму вядома, што на Поўначы каталікоў прыніжалі, што доўгія гады несправядлівасьці абярнуліся ў непрымірымасьць. Аднак нельга казаць так старому, які за сваё жыцьцё наўрад ці быў дзе-небудзь па-за межамі Фулгему. Нельга так гаварыць, бо з тваіх вуснаў гэта гучыць нібыта апраўданьне забойцаў.

— Трэба прызнаць праўду. Я мусіў гэта выказаць.

— Мне няма ніякай справы да жыхароў Паўночнай Ірляндыі — каталікоў ці пратэстантаў. Няхай яны змагаюцца між сабою, але не чапаюць нас.

— Ня варта казаць так, Нора.

— Вось табе твая праўда!

Ён не адказаў. На хвіліну, калі ён схіліўся над цыгарэтаю, ягоны твар успыхнуў. За ўсё іхнае сямейнае жыцьцё яны ані разу сур'ёзна не пасварыліся, і вось цяпер яна адчувала, што справа зайшла вельмі далёка. Яна раптам паявіла яму, што малілася пасьля кожнага новага выбуху, каб гэта аказалася справа рук «Энгры Брыгейд» альбо любой іншай неірляндзкай групоўкі. Яна казала, што ў крамах ёй рабілася сорамна за сваё ўотэрфордзкае вымаўленьне. Ён адказваў, што яна павінна быць мужнаю. І цяпер яна зразумела: ён і ад сябе патрабаваў мужнасьці, калі запярэчыў містэру Джойсу. Ён, відавочна, перад тым маліўся й разважаў, ды ўрэшце палічыў такі ўчынак абавязкам каталіка.

— Ён вырашыў, што ты не асуджаеш забойства людзей, — яна гаварыла ціха, хаця ўнутры яе ўсё кіпела. Яна адчувала, што цяпер мусіць быць на вуліцы і крычаць, крычаць на сваёй ўотэрфордзкай гаворцы, апантана сьцьвярджаючы, што кожны ўздых тэрарыстаў толькі ўзмацняе пагарду да іх і адзінае, чаго яны заслугоўваюць, — гэта нянавісьць ды сьмерць. Яна ўяўляла, як на Фулгем-бродвэй зьвяртаецца з палымянаю прамовою да мінакоў: яе кранутыя сівізною валасы разьвявае вецер, голас гучыць як ніколі палка. Але яна не змагла б зрабіць анічога падобнага, бо гэта было не для яе. Ёй бы не хапіла мужнасьці, гэтаксама як ёй не хапіла мужнасьці выбухнуць гневам тут, ва ўласнай гасьцёўні. За ўсе гады замужжа ў яе ніколі не ўзьнікала патрэбы сапраўды быць мужнаю. Яна разумела гэта, аднак палёгкі ня мела.

— Мне здаецца, цяпер ён ужо зразумеў, як адно прыявіло да другога, — вымавіў Дэрмат.

Ягоныя словы абразілі яе. Яна паспрабавала сабраць усю сваю моц, каб закрычаць, каб выплюхнуць на яго злосьць. Але моцы не было. Падняўшыся, яна ў паўзмроку спатыкнулася й адчула пад падэшваю галінку астралісту. Запаліла сьвятло.

— Я буду маліцца, каб містэр Джойс прыйшоў, — сказаў ён.

Нора зірнула яму ў твар, бледны й худы твар сьвятара. Упершыню з таго часу, як Дэрмат папрасіў яе рукі ў танцзале «Тара», яна не адчувала да яго прыязнасьці. Ён разумнейшы за яе, дык, можа, ён асьлепнуў? Ён добры, але ж у ягонай дабрыні ёсьць нешта цяжкое, нібыта безь яе лепш. Падман будзе жыць да самай апошняй хвіліны Сьвятога вечару: а раптам гаспадар дому прыйдзе, а раптам Бог адкажа на малітвы, — бо тут шануюць Ягоную праўду. Для Норы гэта было крывадушнасьцю, і яна нічога не магла з сабою парабіць.

Ён нешта казаў, але яна ня слухала. Ён разважаў пра адданасьць сваёй веры, пра тое, што трэба заставацца каталікамі.

— Злачынствы спараджае злачынства, — прамаўляў ён. — Бог жадае, каб мы ведалі, што адное зло абавязкова вядзе да іншага.

Яна ўсё глядзела на яго, пакуль ён гаварыў, рабіла выгляд, што слухае, а насамрэч думала, ці будзе ён праз дванаццаць месяцаў, калі прыйдуць наступныя Каляды, гэтаксама езьдзіць ад хаты да хаты ды здымаць паказаньні газавых лічыльнікаў. Ці, можа, людзі адчуюць да яго непрыязнасьць і запатрабуюць іншага інспэктара — не ірляндца? Непрыхільнае стаўленьне да чалавека з ірляндзкім вымаўленьнем — гэта прызямлена й будзённа. Гэта не адносіцца да такіх высокіх матэрыяў, як праўда й сумленьне, як спараджэньне злачынства злачынствам або імкненьне Бога нешта нам давесьці. У сёньняшніх абставінах непрыязнасьць была б цалкам зразумелаю й справядліваю. І, здаецца, зусім слушна, што так і будзе, бо цяперашнія хваляваньні абудзілі ў гэтым чалавеку з ірляндзкім вымаўленьнем самае горшае, і ён вінаваты ў жорсткасьці, на якую, як падавалася, ня быў нават і здатны. А іхны стары, ані ў чым не вінаваты дамаўласьнік, магчыма, за гэтыя дванаццаць месяцаў памрэ. І сяброўства, якое ён так цаніў, не аднавіцца. Тое, што можна было прыняць за веліч, аказалася насамрэч нікчэмнасьцю.

Некалі, дзяўчынаю, Нора абавязкова б расплакалася, але ўдалае замужжа адвучыла яе ад сьлёзаў. Прыбіраючы кубкі й імбрычак, яна разважала пра тое, што тэрарысты былі б надзвычай задаволеныя, пабачыўшы перамогу, якую атрымалі ў адной з гасьцёўняў Фулгему. І на Каляды, калі сям'я зьбярэцца за традыцыйнай вячэрай, іх перамога будзе куды больш значнаю. Тады будуць хлапушкі, вясёлая гамонка, узрушэньне, каралева ды Папа прачытаюць свае прамовы. Дэрмат будзе абмяркоўваць калядныя пасланьні з Патрыкам і Брэнданам, як некалі абмяркоўваў зь містэрам Джойсам. Ён будзе такі ж добры, як заўсёды. Ён будзе суцяшаць Брыджыт, Кейтала ды Тома, што містэр Джойс ня змог прыехаць праз слабое здароўе. І кожны раз, зірнуўшы на Дэрмата, яна ўзгадае Каляды папярэдніх гадоў. І ёй будзе сорамна за яго. І за сябе.

**Пераклад з ангельскае**
**Тацяны Вабішчэвіч**

* Фраза з рэкламы (заўв. перакл.)

# 2003 вясельлі



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Лета прайшло дарма, калі не згуляна аніводнага вясельля. Сёлета вясельляў было як ніколі. Чэргі перад беларускімі ЗАГСамі расьлі: у чэрвені людзі запісваліся на кастрычнік. Бяседныя сталы сьціскаліся: выкрэсьліваліся дзядзькі й цёткі. Пасьля кожнага вясельля палёгка: збагрылі! Толькі адбудзеш адно, як трэба ісьці прапіваць наступную сяброўку.**

Сёлета вясельны бум пракаціўся па ўсёй планэце. Адбылося першае касьмічнае вясельле — нявеста на зямлі, жаніх на арбіце. Маладая-амэрыканка нават зарабіла грошай на трансьляцыі цырымоніі тэлевізіяй. А начальства маладога — расейскага касманаўта — не асабліва было задаволенае. Шлях да вызваленьня жанчынаў Усходу паменшаў на адзін вярблюджы крок: у Саудаўскай Арабіі прынялі закон, паводле якога выкуп нявесты мае складаць 30 вярблюдаў з падарункамі максымум. Бо жаніхі сароміліся абыходзіцца менш як трыццацьцю, і тыя, хто меў меней, ня бралі шлюб. У ЗША людзі за год выдаткавалі на вясельныя патрэбы 50 млрд даляраў — «Макдональдз» мае меншыя прыбыткі.

У беларускіх ЗАГСах цёткі па-ранейшаму ўціраюць «брачующымся» пра «саюз любві і дружбы»; нявесты трымаюцца «на шчасьце» за бронзавае шчасьце хлопчыка-анёльчыка з «Вострава сьлёзаў». Можна зрабіць рыцарскае вясельле, зьезьдзіць да Мірскага замку, зьляпіць гарлачык у Траецкім перадмесьці, каб добра жылося. Такі дэфіцыт вясельных забаваў не замінаў маладым улетку па некалькі гадзінаў стаяць у чарзе перад ЗАГСам, каб забіць месца на кастрычнік.

Патроху мяняецца мода на застольле. Вясельлі на сто гасьцей у сталоўках з тамадой — па сумяшчальніцтве выкладчыкам кулька, выкупам нявесты, лабухамі, конкурсамі, плякатамі на сьценах «Смотри в оба — берешь педагога!» саступаюць месца камэрным вячэрам для сябе і для сяброў. Колькасьць гасьцей абмяжоўваюць, выкрэсьліваючы цётак і дзядзькоў, дый з завядзёнкамі ніхто не цырымоніцца: якое, маўляў, вясельле, калі мы да яго два гады разам жылі!

Памятаючы сумную статыстыку (кожная другая сям'я распадаецца), я пастанавіла хадзіць толькі на кожнае першае вясельле, другое прапускаючы. Пагатоў што бывалі выходныя, на якія прызначаліся адразу два вясельлі. Пасьля кожнага — нечуваная палёгка: збагрылі! Толькі адгуляна адно вясельле, як трэба ісьці на новы дзявочы вечар прапіваць наступную сяброўку.

На адно зь вясельляў нявеста і яе сяброўкі, не згаворваючыся, папрыходзілі ў блакітных сукенках. Пасьля даведаліся пра звычай: усе сяброўкі апранаюцца ў той самы колер, што і нявеста, каб зьбіць з панталыку злых духаў. Галоўны абавязак сяброўкі нявесты — актыўна абмяркоўваць, ці варта мяняць прозьвішча, якія пярсьцёнкі (сукенкі, фрызуры...) лепшыя за ўсё. У самы разгар вясельля — красьці нявесту, на якую ўсе госьці разам з жаніхом даўно забыліся і ў якой здарылася гістэрыка. Плача нявеста — добрая прыкмета: значыць, добры будзе шлюб.

І мамкі на вясельлях плачуць. Хоць насамрэч ад нараджэньня дачкі толькі й думаюць, як зьбыць яе з рук. Першае, што пытаюцца ў мамак былыя суседкі: «Дзевак замуж не аддала?» Жанчыны почасту забываюцца свае вясельлі: так хвалююцца, што ад моманту подпісу ў ЗАГСе нічога ня памятаюць.

Штосьці вусьцішнае ёсьць у вясельлі. Адна мая сяброўка ўвесь час трызьніла, як яна літаральна зьбягае з-пад вянца. Вясельле — страшная трызна, пераход у іншы стан, паміраньне. Вясельле — аднаразовае, як і сьмерць. Каханьне і сьмерць заўсёды побач. Як падгадаць вясельле, каб ніхто не памёр з сваякоў? Наша гісторыя, уласна, і пачынаецца з «крывавага вясельля», калі Рагнеда не захацела «разуці рабыніча».

У беларускай эканамічнай сытуацыі шлюб — самы эканомны спосаб існаваньня. Разам здымаем кватэру, разам харчуемся. Хто ня зьехаў за мяжу годам раней, той ажаніўся сёлета. У беларускіх умовах шлюб — гэта яшчэ і форма ўнутранай эміграцыі, форма абароны ад рэчаіснасьці: удваіх лягчэй супрацьстаяць варожаму асяродзьдзю.

У дзяцінстве ловіш на вясельлях цукеркі, потым гуляеш на чужых вясельлях, ставіш подпісы пад чужымі шлюбнымі пратаколамі... Хто не ажаніўся сёлета, той не ажэніцца ніколі.

**Каця Цітовіч**

Марыя Вайцяшонак

# Тэрарыстка

Быць беларусам — проста работа.
**Сяргей Дубавец**

Выдавалася, што ляціш не ў самалёце Рым—Менск. А сам па сабе, зграяй, — усё, што было лятучага ў лясах, на дрэвах, на дратах у горадзе, паднялося ў паветра. Дзьвесьце? трыста? інтэрнацкіх дзяцей вярталіся з адпачынку ў Італіі. Галасы калыхаліся ў цеснай прасторы; нешта зычнае, дзікаватае чулася ў іх, не такое, як у хатніх дзяцей. Рознагалосай хваляй мяне раптам адкінула, прыбіла да колішняга голага стала ў дзіцячым прытулку, якраз тая гаманкая хвіліна перад тым, як будуць дзяліць ежу. Я бачу свой лёс увочы і... стойваюся, каб ніхто не здагадаўся, што я таксама дзетдомаўка. Бо дзяўчаты адразу ж залезуць да мяне ў сумку. Перапэцкаюцца шмінкай, будуць прымяраць мой шалік, пантофлі, як гэта мы рабілі, калі да нас прыязджаў хто з выпускнікоў. Будуць абнюхваць адзеньне, водар дарослага жыцьця.

Іншы раз прызнаньне служыла паролем. Як тады... гуляючы з сабакам, раскідаю хлеб птушкам у сквэры на старых кладах ля царквы Магдалены і адыходжуся. Азірнулася... Хлеб зьбіралі двое мужчын! Амаль у шоку вяртаюся. «Мы выйшлі з турмы... мы дзетдомаўскія», — кажуць. Дастаю грошы, доўга маруджуся, не магу патрапіць зачыніць кашалёк і раптам бачу напружаны, чаплівы позірк: чалавек рыхтуецца драпежнікам выхапіць здабычу. На маім горле ўдушлівая рука нашага зь ім супольнага лёсу, мы ўжо амаль бораемся, як толькі не качаемся па зямлі. «Я таксама дзетдомаўка...» — ледзьве прамаўляю, бы выходжу з бойкі, пільнуючы ягоны позірк. Чалавечыя змыслы прабіваюцца праз тоўшчу ягоных бядот. Мужчыны дзякуюць і адыходзяцца. Я нясу дамоў сваю цэлую галаву і пачуцьцё паразуменьня, якое рэдка паспытаеш з сытым чалавекам.



PHOTO.BYMEDIA.NET

У салёне пацішэла. Раскрываюцца тэчкі, заплечнікі (дзеці адпачывалі ў сем'ях), дастаюцца, пераглядаюцца падарункі, жуйкі, цукеркі. Якраз перада мной дзяўчынка пад аксамітным барэтам, нязграбная, пульхная, фалянгі слаба абазначаны, як у жабяняці, барэт даросьлы, і парасолька ў руках з загнутым канцом таксама не дзіцячая. З тых дзяцей, якіх можна апрануць у што заўгодна. Яе заўсёды прыбіралі чужыя рукі, сама нічога не выбірала, не прасіла, для яе адзежа — гэта покрыва, як для сьвятой. Спрабуе расчыніць парасон і, калі ўжо ўдасца, падымецца пад столь салёну і хутка вернецца, бо тут ейныя першыя асабістыя рэчы. Барэт спаўзае на вочы, не даючы ходу, дзяўчо паслухмяна асядае глыбей у крэсла, запіхваючы ў рот жуйку. Павярнулася назад, да мяне тварам, нахілілася блізка, вочы стаячыя, як вада, — што ўкінеш, тое і будзе боўтацца, сьлінкі ад жуйкі зараз сьцякуць у мой падол. Побач дзіця тузаюць ваніты. Нахіляецца выхавацелька, я пазнаю тую, што яшчэ ў аэрапорце казала: мы вязём дзяцей з абмежаванымі разумовымі здольнасьцямі. Я якраз пасярэдзіне гэтай групы.

Раптам з розных куткоў салёну падымаюцца старэйшыя дзяўчаты, ідуць па праходзе, ідуць павольна, хістаючыся, сыходзяцца, абхапіўшы адна адну, складаюць галовы вянком — плачуць уголас. Што? Чаму? Іх, розных — можа, раней і не сябравалі, — сашчапіла крэпкай моцай страшная бяда — адчужанасьць. Яны ня хочуць вяртацца дамоў. Выхавацелькі сядзелі асобна, размаўлялі, усьміхаліся стомлена, жавалі жуйкі: а што, усе дзеці цэлыя, ніхто не згубіўся. Яны быццам і не здагадваліся, што чыніцца здрада, што шмат хто «застаўся» ў чужой краіне назаўсёды. Побач з выхавацелькамі іх дзеці, яны ўвесь час на матчыным воку, яны захінёныя ад спакусы.

Мы ляцім, дзяўчаты разыходзіліся — папіць салодкай вады, пасядзець каля разапхнёнага ад падарункаў заплечніка. Ізноў сыходзіліся, зноў плакалі счапіўшыся, тварам уніз. Толькі што ня зьвязвалі касаў, быццам зьбіраліся скочыць з самалёта самагубкамі і не разлучацца і пасьля сьмерці.

Наш вырай не хацеў вяртацца.

Зьнізу, зь зямлі, самалёт пэўна нагадваў параненую птушку зь мігатлівымі белымі крыламі.

Дзяўчо пад барэтам зноў нахіляецца да мяне яшчэ бліжэй, зараз дакранецца пальцамі да твару, каб апазнаць, але каго?! Левае паўшар'е ў маёй галаве таксама ўжо захінёна зацьменьнем. Спрабую занатаваць па звычцы ўбачанае, перачытваю і заўважаю, што запісваю бяз знакаў прыпынку. Зьніклі нават коскі?! Дастаю жуйку, упіраюся нагамі ў пярэдняе крэсла, рэзка адкідваюся назад — разварочваю самалёт. Як лёгкі вазок на высокіх рысорах. Разварочваю ў часе, каб пачаць гэты вояж у Італію з самага пачатку наноў.

Нам трэба адрэгуляваць аб'ектыў зроку. Паставіць унутраны голас, каб не сарвацца да плачу.

Самалёт нахіліўся, зорны пыл пасыпаўся, як са страхі. Адумысьля раблю добрае кола, каб убачыць аўстралійскае ранча, куды сасланы памагатым пастуха авечак дуроны прынц Гары. Так, лічыць ангельская бабуля Лізавета, пазнаецца сапраўднае жыцьцё. Старэйшы Ўільям сам паехаў у Чылі з кампаніяй нядобранадзейных падлеткаў, будуе масты, жыве ў інтэрнаце, дзяжурыць па кухні, абірае бульбу. І гэта перад тым, як, магчыма, неўзабаве прыйдзецца надзець на галаву карону?! А нам навошта тое ранча? Мы не каралеўскія ўнукі! Тут да месца будзе нагадаць: Генрых IV дазваляў лупцаваць нават каралеўскіх дзяцей — вопыт даўні, трывушчы калі што якое.

Сонца ўжо з другога боку, якраз з таго, як зафіксаванае ў ячэйках нашае памяці, сьвятло расьсеянае, бы скрозь абажур, — мы дома! Найперш трэба ўспомніць закінутыя на гарышча навыкі суладзьдзя з прыродай. Мы йдзём туды, дзе яшчэ кратаюцца карані сьсечаных дрэў, лічым па пнях колцы гадоў — зьнішчаны нясьпелыя лясы. Зямля слаба родзіць, бо ёй вочы гарэлкай залілі, жаляцца навокал людзі, жаляцца зьвыкла, ім і тое рабое, і гэтае, і няхай сабе, маўляў, «не сьмяротнае». Мы пералічваем усіх птушак, усіх зьвяроў, шмат каго не далічваемся, патручаных, пабітых, і раптам знаходзім гняздоўе лебедзя-крыкуна — яго ў нас даўней не было. Гукі клявікордаў у нябеснай залі — гэта ягоны голас. Прырода йдзе да рук з даверам дзіцяці. Па дарозе вясковай сустракаем старую жанчыну. Замораная, цела цяжкое, душыць здыхаўка, пара йдзе, курыцца ад самой косткі, нагрэтай на сонцы, як ад роснага каменя. На ейным панадворку, накіраваўшыся на аўтобус у горад, стаіць унук. Узрост каралеўскіх хлапцоў, стаіць, плача, ня хоча заставацца ў бабы, а самая ж касавіца. Гавораць да яго, ушчуваюць, просяць, а ён павярнуў галаву ад двара, ад усіх, зь якога боку ні зайдзіся — дасьць азадкам. Шыя таўстая, наетая, хамут ня ўзьдзенеш, рады не дасі — не завернеш.

Ідзём, схмысьціўшыся, у горад, несучы на ахвярным падносе нашу веру. Скрозь чуваць чужая мова, там-сям узвышаюцца новабудоўлі на зруйнаваных могілках. Узрыты цяжкі дзірван. Мэталічны крыж устае з-пад каўша экскаватара, жагнае парушальнікаў вечнасьці і зноў падае ніц, пад ногі, пад падмурак дому... Хопіць! Толькі не пужайцеся, кажу дзецям, трэба ведаць праўду — жыцьцё ня мае замены.

А зараз мы паляцім у краіну, дзе ў пашане кожнае дрэва, кожны камень, дзе фантаны маюць сьвятарнае дзеяньне. Там яшчэ Цэзар забараняў рух колішняга транспарту пры дзённым сьвятле, каб чуваць былі галасы птушак, галасы травы, музыкаў. Там зямля да таго перапоўненая несьмяротнымі, што наўдачу будзе лягчэй напаткаць Бога, чым чалавека. І гэта ня рай — там працуюць з дня ў дзень, зь веку ў век, каб быць італьянцамі. Мы будзем да іх прыглядацца, вучыцца, каб «заміж пэрсідзкага ўзору» выткаць дома свой сьвет. «У нас ня выйдзе... Мы гэтак ня здужаем...» — пачуліся галасы. Ну, гэта натуралёва пры нашай памяркоўнай мэнтальнасьці. Засталося толькі наастатку зайсьціся да знаёмага мастака, ён жыве ў вёсцы, будуе ў сваім агародзе... аэрадром. А што калі і праўда насамрэч пляц ужо гатоў — тады нам будзе ямчэй адлятаць у Італію адгэтуль.

Мастак стаяў з рыдлёўкай, скрозь разрытая зямля, конаўкі — і пазнатку няма на тое. Сам у лахманах, згаладалы, людзі сьмяяліся, дурніліся зь яго. Ты высіліўся... трэба спыніцца, пэўна, немагчыма аднаму зрабіць такую вялікую работу, ледзь прамаўляю, шкадуючы. «Не кажы так... Вусны маюць вялікую моц... Ты можаш мне нашкодзіць недаверам...» — адказвае. Сонца зайшло, словы ягоныя сьвяціліся ў цемры — яны былі зь Бібліі.

Якраз набліжалася Калядная ноч. У прамежку паміж другой і пятай гадзінамі расчыняюцца нябёсы. У гэты час можна папрасіць Бога, каб дапамог нам адчуць сваю недасканаласьць, перастаць апраўдваць сваю ляноту, свой хаос, пераадолець векавую нямогласьць, каб зьдзейсьніць мары. І няхай у зямлі нашых сэрцаў пусьціць карані парасткі Ягонай надзеі, маліліся сьвятары.

Сьвяты вечар! Самая пара калядаваць! Колькі бляск месяцу, трэск промняў пад нагамі і поўны рот сьмеху, голасу — гаварыць, крычаць пад вокнамі, нешта варожачы, прыкінуцца пярэваратнем. Бярэ рух, забірае цябе вясёлы, адчайны пуд паганства.



**Марыя Вайцяшонак — пісьменьніца, узімку жыве ў Менску, улетку — пад Ракавам. Аўтарка кнігі «Сад нявіннасьці».**

# Язьмінчыны Калядкі

Працяг са старонкі 22.

Язьмінка нічога не разумела, але на гэта ў яе й часу не было: зноў нехта да дзьвярэй крочыў.

— Пачакай тут, пакуль усе сыдуць, — сказала Язьмінка і завяла жабрака за дзяжу, толькі забылася, што там ужо мастак Аверка стаіць.

— Усе-е?! — зароў Парошка: ён раўнівы быў жахліва й адразу раўнаваць пачаў.

— Ціха, ціха! — папрасіла Язьмінка, а Парошка ўжо адчуў, што нехта ёсьць побач. І Аверка адчуў, што яго нічога добрага тут не чакае, таму перабег за печку далей ад граху. Ды наступіў судзьдзю на нагу, якая з-пад ложка тырчала. Судзьдзя напалохаўся і перапоўз за куфар. А ў дзьверы ўвайшоў фэльчар Нязіпер.

— Як здароўе маёй прыгажуні?

— Добра, — адказала Язьмінка.

— А нешта я нашага Сёмачку ля ракі ня бачыў. Мусіць, і ён у цябе закахаўся дый у раку скокнуў.

— Напэўна, — сказала Язьмінка й падумала: вось бы ён сапраўды ў мяне закахаўся! А Нязіпер разважаў:

— Я даўно казаў, што ён чалавек хворы і яму лячыцца трэба.

Язьмінка паглядзела ў цёмны кут, дзе Сёмачку пакінула, і думае: «Трэба й яго схаваць, каб ніхто не заўважыў». А ля ўваходу зноў нехта зашкробся.

— Пачакай тут, — прапанавала Язьмінка Нязіперу, паказваючы на месца за Бембелевай бочкай. Яна патроху прыгадваць пачала, што было ўчора, і разумець, што адбываецца. Пакуль не ўвайшоў невядомы, яна схавала Сёмачку за таемную лесьвічку. Ня ведала Язьмінка, што там ужо сядзіць бачар. Той напалохаўся, што да яго злы дух завітаў, і перабег за дзяжу. А там ужо стаяў Парошка, трасучыся ад рэўнасьці. Сутыкнуўся ён з Бембелем, учапіўся ў яго, і пачалі яны адзін аднаго валтузіць. Пакаціліся па падлозе, лаючыся шэптам, і апынуліся ажно каля вялізнай мастаковай дошкі. І там памірыліся, бо абодва зразумелі, што нельга давяраць жанчынам. Яны схаваліся за дошкай, а з-за суседняй бочкі да іх фэльчар далучыўся. Парошка дастаў з рызманоў карты[3], і ўтрох яны ўсю ноч у дурня гуляліся.

А да Язьмінкі ўвайшоў Шулян, палясоўшчык, і засьпяваў:

— Мая хваіначка, мая бярозанька...

А за дзьвярыма яшчэ нехта. Язьмінка ўжо заблыталася, дзе хто схаваны, і запхнула палясоўшчыка за печку. Давялося Аверку вярнуцца за дзяжыну, але Шулян за ім пагнаўся, і Аверку давялося ратавацца пад лесьвічкай. Шулян туды сунуўся, але пабачыў Сёмачку, вырашыў, што гэта прывід, і адступіў, спалоханы, за дзяжу.

У дом увайшоў Дабад, зьзяючы прыгажосьцю. Сярод зімы здабыў ён недзе кветкі. Але чуў ён, што сьледам яшчэ нехта йдзе, таму аддаў кветкі Язьмінцы і сам схаваўся за кросны: ён наагул пазьбягаў людзей.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

А ў пакой ужо ўвайшоў ганчар Кірык з прыгожай глінянай лялькай. Ён нават сказаць нічога не пасьпеў, бо за дзьвярыма тупалі, быццам конь бег. Язьмінка схавала Кірыка за Бембелеву бочку. У дзьверы ўбег падпасак Цюнік і ўсклікнуў:

— Язьміначка!

А з двара яшчэ нехта зашкробся. У Язьмінкі галава кругам пайшла. Яна схавала Цюніка за каменную бабу. Адчыніла дзьверы, а за імі аўчарка Цюнікава, Магда, прыбегла за сваім гаспадаром.

Язьмінка пачакала яшчэ трохі і ўздыхнула з палёгкай: здаецца, ніхто больш ня прыйдзе. А на дварэ ўжо ноч. Тады й дацяміла Язьмінка, навошта ўсе тыя людзі прыйшлі, і зразумела, што настаў ёй час выбраць, з кім зьвязаць свой лёс. «Мастак Аверка малюе прыгожа, — разважала Язьмінка, — бачар Бембель добрыя бочкі робіць, у судзьдзі грошы ёсьць, у фэльчара — лекі розныя цікавыя, Парошку шкада вельмі, ён жа добры чалавек, і Шулян добры чалавек ды жыве недалёка, Дабад прыгожы вельмі, хоць і гаворыць дзіўнае, Кірык цудоўную ляльку прынёс, Цюнік таксама добры хлопчык, адно што малы, а ў Сёмачкі нічога добрага няма, але сэрца да яго так і горнецца...» Ня ведала Язьмінка, на кім спыніцца. Усе добрыя, нікога пакрыўдзіць ня хочацца. Але ж і ўсім адразу не дагодзіш! Да таго ж, Язьмінка зусім ня памятала, хто дзе схаваны. Вырашыла яна ўвайсьці кудынебудзь наўздагад. Прыкінула на пальцах — папала пад таемную лесьвічку. Язьмінка ўвайшла туды. Там было два чалавекі, але адзін сышоў. Язьмінка засталася з другім, і яны прабавілі ноч разам.

Уранку Язьмінка прачнулася й не знайшла ў сваім доме нікога. Яна пайшла ў вёску і ва ўсіх пыталася (толькі ў Сёмачкі Язьмінка не спытала, бо ён быў ля рэчкі):

— Прызнайся, ты, з кім я была сёньня ноччу, і я буду тваёй назаўжды.

І ўсе мужчыны адказалі:

— Са мной.

Язьмінка ня ведала, каму верыць.

Праз патрэбную колькасьць дзён нарадзілася ў Язьмінкі дачка Руня, і ўсе мужчыны дружна абвясьцілі сябе ейнымі бацькамі. Язьмінка падумала, што, мабыць, так яно й лепей, і засталася жыць з дачушкай адна. Чужым на пытаньне, адкуль дзіця, адказвала: «Накалядавала». Здавалася б, пытаньне й вырашана.

Але часам здаралася ўвечары, седзячы на ганку зь дзіцяткам, Язьмінка задумвалася:

— Хто ж, Рунютка, усё ж такі твой бацька?

І сапраўды: хто?

[3] Парошка быў вядомы картыжнік. Ягонае адзінае вока нічога ня бачыла, а карты бачыла, нават калі яны да яго плячыма павернутыя.

# Дзіцячае каляднае

Аляксандар Прышывалка

## Як зь Месяцу салацінкі падалі

**Маладзік маладзенькі, ражок залаценькі ўжо з гадзіну пагглядаў далоўку.** На дварэ цемнавата, і гэта была ўлюбёная пара для дзетак — калі тваіго сябрука, за якім ты гонішся, амаль не відаць.

І Месяц вырашыў крышачку нахіліцца. Уніз паляцелі салацінкі са сьмехам. Некаторых зь іх было не відаць, але гэта ж ня значыць, што іх не было. Чырвоныя, блакітныя, жоўтыя, рудыя, зялёныя, ружовыя крупінкі, птушкі, жабкі, гузікі, цукеркі, алоўкі, чарапашкі, хітрыкі, гадзіньнікі — усё гэта Месяц загадзя прыдбаў у краме.

— На што гэта ўсё? — цікавіліся ў яго.

— На салату.

Кожная салацінка імкнулася ўпасьці першаю, ды не абы-як, а каб абавязкова ў фортку, а потым у пасьцель пад падушку да якойсьці дзяўчынкі ці хлапчука. Каб тыя ўсюўсю ночку глядзелі каляровыя мроі. А раніцою яны б марылі стаць хто балотнаю чарапашкаю, а хто ружовым гузікам, хто блакітнаю птушкаю, а хто блакітным хітрыкам. Ну а покуль дзеткі кінулі гульню з крыкамі:

— Салют!

— Салют!

## Як Волька зорку запусьціла

Зорачкі на нашым небе калі-нікалі праскокваюць зь месца на месца: яны, бач ты, раптам мяняюцца месцамі, а вунь тая таечка скокнула да сваёй сяброўкі, а іхная суседка, — вуньдзека, глядзі, — паляцела некуды за лес.

Волька падгледзела гэта, а па тым-таго йшчэ доўга стаяла, ускінуўшы галоўку.

А праз дзён колькі ў Волькі быў дзень нараджэньня. І ў шарую гадзіну яна зноўку прыбегла да таго месца, дзе бачыла дзівосныя дзеі. Гэтым разам рукою яна трымала паветраны кульчак. Той быў ня надта-такі круглы й ружовы.

Волька ўсьміхнулася й напісала на ім: «Зорка Волька».

І адпусьціла кульчак.

Ён, відаць, не хацеў пакідаць яе, бо сьпярша паволі лунаў па-над Волькаю, а потым паляцеў угору, усё спрытней і спрытней.

Волька й кульчак рабіліся ўсё драбнейшымі і драбнейшымі.

## Як Янка лятаў на сьнежцы

Была аднаго году дужа халодная зіма. Янка хварэў на горла й дзень цэлы сядзеў у хаце.

Сядзеў сабе, сядзеў ды глядзеў на сьняжынкі вонках.

Ось гэтыя во прабягаюць, бы пралятаюць, а тыя, што маладзейшыя, гарэзьліва стукаюцца аб шыбіну, са сьмехам адскокваюць ад яе і зноўку кідаюцца далоўку; а вунь тыя, што далей ад хаты, ідуць задуменна-павольна, нібы таксама разглядаюць яго ды разважаюць, чаму ён сядзіць такі сумны, чаму не далучаецца да нашае гульні. Бо ён такі ж, як мы; хіба крыху большы.

Глядзеў Янка, глядзеў ды заўважыў, што адна сьняжынка чамусь спынілася дый цікуе на яго. А потым — шусь — і праз шчыліну ў раме яна апынулася на Янкавай далоні, а праз імгненьне малец ужо быў ня большы за пылінку.

Янка не адразу ўцяміў, што гэта зь ім здарылася й дзе ён цяпер.

— Ты ў мяне ў гасьціне.

— У каго «ў мяне»?

— У мяне. У Сьнежкі.

Янка агледзеўся, але нікога побач не было.

— Не дзівіся. Ты мяне ня ўбачыш. Я вакол цябе.

Ён пакаштаваў драбок сьнегу з падлогі.

— М-м. Салодка! — потым зірнуў на ўласны пакойчык. Ён быў та-а-кі вялізарны, што Янка нават ухмыльнуўся. Дый пракрычаў:

— Ну дык паляцелі!

І яны, не зважаючы на зьдзіўленага караеда Барыса (дарэчы, даўняга Янкавага сябра), вылецелі на двор.

Янка адразу пачуў з усіх бакоў сьмех ды нейкія надта знаёмыя сьпевы. А тым часам яны зь Сьнежкаю ляцелі чамусь не далоў, а ўверх.

«Не, то ня сьпевы», — падумаў Янка й заўважыў, як побач праляцеў ягоны сябар Алесь, а вунь — Андрэйка, а тамака мільгнула Зоська.

Раптам Сьнежка на імгненьне спынілася недзе ля вяршыні старога дуба, Янка адно пасьпеў пачуць працяглае «ка-а-а-р-рр».

І-і-і чамусь сонца апынулася далавах, потым зноў наверсе, і зноў далавах. А-а-а!

— Гэ-э-та-а фа-а-йне-е-й за-а ка-а-ру-сэ-э-ль!

І яны пранесьліся побач з Барысам, які ўжо прыдбаў сабе бінокль. Потым — уздоўж хаты са сьмехам. І зноў уверх. І зноў далоў. У вялікую гурбу іскрыстага сьнегу.

— Будзь маім сябрам.

— А ты — маёю сяброўкаю.


ТАКІНДАНГ

## Барыс ПАСТАРНАК

# Калядная зорка

Гудзелі вятры
Без канца і пачатку.
І зімна ў пячоры было немаўлятку
На схіле гары.

Яго сагравала дыханьне вала.
Жывёла ў пакоры
Стаяла ў пячоры.
Над яслямі цёпла дымінка плыла.

Атросшы даху ад пасьцельнай трухі
І зернетак проса,
Глядзелі з надкоса
Спрасонку ў паўночную даль пастухі.

Далей было поле ў сьнягох і клады,
Магілкі ў самоце,
Аглобля ў сумёце,
Над могільлем неба і зор халады.

Зіхцела нязнаная зорка адна,
Усьмешкай газьніцы
Ў акне вартаўніцы
Шляхі ў Бэтлеем асьвятляла яна.

Яна палымнела, як стог, у баку
Ад неба і Бога,
Як жар, як трывога,
Бы ў полымі хутар, пажар на таку.

У небе высознай гарэла тарпой
Саломы з прылецьця
У цэлым сусьвеце,
Стрывожаным новаю зоркай скупой.

І зарыва рдзела над ёй і расло,
І ў смутным настроі
Астролягаў трое
Сьпяшалі на кліч, дзе трывала сьвятло.

І везьлі яшчэ на вярблюдах дары.
І вослікі ў збруі ступалі памалу,
Часьцілі, спускаліся пудка з гары.

І дзіўнай праявай наступнай пары
Ўсё тое ўставала, што потым настала.
Ўсе думкі вякоў, навасьвецьця муры,
Наступнасьць усіх галерэяў, музэяў,
Свавольствы ўсіх фэяў, адчай чарадзеяў,
Ўсе елкі на сьвеце, ўсе сны дзетвары.

Усё пазапальваных сьвечак дасьвецьце,
Ўсё колернае хараство мішуры...
...Са стэпу дзьмуў вецер, нібы з апрамецьця...
...Ўсе яблыкі, ўсе залатыя шары.

Алешына стаў захінала глухі,
Ды быў ён часьцінай відзён ля запруды,
Праз гнёзды гракоў і сухія вярхі.
Ступалі маруды — аслы і вярблюды,
Іх добра разгледзець маглі пастухі.

— Хадземце з усімі, паклонімся цуду, —
Шчытней захінулі свае кажухі.

Ад шорганьня сьнегам зрабілася парка.
Па зыркай паляне лістамі сьлюды
Вялі басанож за хаціну сьляды.
На тыя сьляды, як на ўсхліпы агарка,
Гырчалі аўчаркі пад зіркі жуды.

Марозная ноч выдавалася казкай,
І хтось з навіхуранай сьнежнай грады
У шэрагах іхных туляўся худы.
Сабакі зубамі стаміліся ляскаць,
Гадзілі падпаску й чакалі бяды.

Той самай дарогай, бясслоўна, паныла,
У гушчы натоўпу анёлы ішлі.
Нябачнымі іх бесьцялеснасьць рабіла,
Ды крок адціскаўся на сьнежнай зямлі.

Ля каменя густа сышлося народу.
Сьвітала. Віднеліся кедраў стваллі.
— А хто вы такія? — спытала Марыя.
— Мы род пастухоўскі і неба паслы,
Узьнесьці прыйшлі вам абоім хвалы.
— Ня разам жа ўсе. Пачакаць ля ўваходу.

Шукалі між шэрай, як попел, імглы
Авечкагадоўцы й пагоншчыкі згоды,
На коньнікаў лаяліся пешаходы,
Ля выдзеўбанай вадапойнай калоды
Вярблюды раўлі, задкавалі аслы.

Сьвітала. І золак, як пырскі смалы,
Апошнія зоркі зьмятаў на пагоду.
Адных вешчуноў зь незьлічонага зброду
Марыя ўпусьціла ў чарэўе скалы.

У ясельках з дубу ён спаў, яснакудры,
Як маладзічок у заглыбе дупла.
Яму замянілі аўчынае футра
Асьліныя губы і храпы вала.

У цені стаялі, бы ў прыцемку хлеву.
Шапталася сьцішаная гамана.
Ды ў поцемках нехта паціху налева
Ад ясьляў рукой адхіліў вешчуна,
І той азірнуўся: з парогу на Дзеву
Калядная зорка глядзела адна.

*1947*

**Пераклаў з расейскай Рыгор Барадулін**



## Іосіф БРОДЗКІ

# Калядны раманс

*Яўгену Рэйну, зь любоўю*

Плыве ў журбоце беспрычыннай
паміж цаглянага надсаду
караблік зыркай аблачынай
ад Аляксандраўскага саду,
начны ліхтарык нечуваны,
як ружа жоўтая, прыгожы,
над галавой сваіх каханых,
ля ног прахожых.

Плыве ў журбоце беспрычыннай
пчаліны хор прапойцаў сьмешных.
Глядзіць маркотнымі вачыма
й фатаграфуецца замежнік,
і выяжджае на Ардынку
таксоўка, хворая вякамі,
і сталі мёртвыя ў абдымку
з асабнякамі.

Плыве ў журбоце беспрычыннай
сьпявак маркотны па бульвары,
ля крамкі з газаю айчыннай —
маркотны дворнік круглатвары,
плыве з паненкаю кісейнай
стары каханак-малаічына.
Картэж апоўначы вясельны
плыве ў журбоце беспрычыннай.

Плыве ў імгле замаскварэцкай
плыўца ў няшчасьце цяжкі подых,
гучыць гаворкаю габрэйскай
на жоўтых, на маркотных сходах,
і, плывучы ў журбу зь мілосьці,
калядналю, нядзельнай госьцяй
сумуе пекная дзяўчына
бяз дай прычыны.

Плыве ўваччу халодны вечар,
дрыжаць сьняжынкі на вагоне,
марозны вецер, бледны вецер
апёк чырвоныя далоні;
ў агнёх мядовых далягляды,
і пахне смачнаю халвою,
начны пірог нясуць Каляды
над галавою.

Твой Новы год на хвалі сіняй
за плыняй шуму гарадзкога
плыве ў журбоце беспрычыннай,
нібы жыццё пачнём нанова,
і будуць зноў сьвятло і слава,
удалы дзень і ўдосталь хлеба,
нібы жыццё хіснула ўправа,
хіснуўшы ўлева.

*28 сьнежня 1961*

**Пераклаў з расейскай Андрэй Хадановіч**

# 24 сьнежня 1971 г.

*V.S.*

У Раство, хоць ня ўзносім хвалы,
ўсе мы трохі біблійныя магі:
дзеля каўнай бляшанкі халвы
у аблозе трымае прадмагі
плоймай скруткаў нагружаны люд —
кожны сам сабе цар і вярблюд.

Сумкі, скруткі, авоські, кулькі,
і гамонка ня знае ўгамону;
водар елкі, гарэлкі, траскі,
мандарынаў, хурмы, цынамону;
ды шукаць паміж трактаў дарма
Бэтлеемскі, і зоркі няма.

І нашэньнікаў сьціплых дароў
перапоўнены транспарт хістае
і выплёўвае ў зеўры двароў,
хоць вядома: пячора пустая —
ні жывёлы, ні ясьляў, ні Той,
што ў кароне сьвятла залатой.

Пустата. Ды ўспамін пра яе —
як сьвятло, што ліецца зьнікуды.
Знаў бы Ірад: чым больш ён злуе,
тым няўхільней калядныя цуды.
Непарыўнасьць сяўбы і жніва —
падставовая схема Раства.

Цуд бліжэе, і ўсюды жыве,
і яднае ў сьвятое застольле
ўсе сталы. Не патрэба ў Раству
хай яшчэ, але добрая воля
ў чалавеках відаць праз грахі.
І ня сьпяць ля агню пастухі.

Валіць сьнег. Аж расьце да гаўбцоў.
Трубы-коміны трубяць дачасна.
Ірад п'е. Бабы туляць мальцоў.
Хто прыйсьціме — нікому ня ясна.
Мы ня ведаем часу й прыкмет.
Ці ж паверыць у прыхадня сьвет?

Ды калі на дзьвярным скавышы
яна выйдзе з туману густога,
у хусьціне, нібыта на мшы, —
і Дзіцяці, і Духу Сьвятога
пазнаеш у сабе хараство.
Бачыш зорку і кажаш: Раство.

**Пераклала з расейскай Марыя Мартысевіч**

# Калядная зорка

Халоднай парою ў мясцовасьці, звыклай хутчэй да пары
сьпякотнае, схільнай да плоскасьці болей, чым да гары,
Дзіця ў сьвет прыйшло, Збаўца сьвету ад ночы самой;
мяло, як толькі ў пустэльні можа месьці зімой.
Яму ўсё было велізарным: грудзі матчыны, жоўты шар
каганца, тры цары — Мэльхіёр, Бальтазар, Каспар;
дарункі іх, дбайна ўцягнутыя ў стойла вала.
Ён быў адно толькі кропкай. І кропкаю зорка была.
Уважліва, не міргаючы, цераз густую сінь
на Таго, хто ляжаў у яслях, з найвышэйшых вышынь,
зь іншага краю Сусьвету, з другога яго канца,
зорка глядзела ў пячору. І гэта быў позірк Айца.

*24 сьнежня 1987*

**Пераклала з расейскай Марыя Мартысевіч**

# Уцёкі ў Эгіпэт (II)

У лёху (які-ніякі, а дах!
Вярнейшы за гмах а простых кутах!),
У лёху ўтульна траім было.
Саломаю, зрэб'ем пахла цяпло.
Агонь унутры быў, а звонку — змрок.
У змроку завея малола пясок.
І, згадваючы пра яе памол,
храплі зьнепакоена мул і вол.
Марыя шаптала, агонь гудзеў,
Язэп задуменна ў агонь глядзеў.
Дзіця, замалое для іншых спраў,
драмала і сьніла, як вол араў.
Яшчэ адзін дзень прамінуў і зьнік,
забраўшы трывогі і страхі, зык
разьятранай ірадавай арды, —
і цэлым стагодзьдзем бліжэй гады.
Спакойна было ў тую ноч траім.
Празь дзьверы ў прахон выпараўся дым,
каб іх не трывожыць, і толькі мул
у сьне (або вол) сам сабе ўздыхнуў.
Глядзела зорка цераз парог.
Адзіным з траіх, хто напраўду мог
ведаць, што позірк той азначаў,
быў толькі Сын. Але ён маўчаў.

**Пераклала з расейскай Джэці**

## Сяргій ЖАДАН

**Фрагмэнт з батлейкі**

# «Мэры Крыстмас, Джызас Крайст!»

**Язэп займаецца самааналізам
і мэдытацыямі**

чорныя пальцы майго ісуса якімі ён трымае зярняты шыпшыны
калі саранча асьцярожна сядае яму на плечы
ад іхнага дотыку сьцены кранае іней
а ён у заплечніку носіць люстэркі з нэпалу й званочкі авечыя

як срэбраныя відэльцы ягоныя белыя косьці
а пад яго пазногцямі як пад азёрамі сьвецяцца лямпы
таму я ў яго прысутнасьці заўжды пачуваюся госьцем
нават у доме сваім дзе пасьля яго
застаюцца шэпты нібыта дамбы

калі ён плакаў то ціха зьвінелі ягоныя пацеркі
калі ён спаў на яго павеках віселі кроплі бурштыну
ён так гаварыў нібы запаўняў нябачныя ўпадзінкі
што побач былі ды не запаўняліся й на траціну

цяпер калі ўсе гавораць што ўсё адсюль пачалося
я думаю што напраўду пра іншае месца мова
бо нават калі прарочаць што прыйдзе здалёк сьвятло ўсё
то гэта зусім ня значыць што прыйдзе своечасова

а так я ведаю што ягоныя локці й калені
маюць водар дажджу маюць каштоўнасьць зброі
маюць смутак нібыта лявы ў вязеньні
маюць лёгкасьць нібыта зэбры на вадапоі

і ты ўсё адно паверыш калі яшчэ не ўдалося
вось восы хаваюцца ў яго валосьсі
вось восы займаюцца нейкаю важнаю справаю
паміж левай яго рукою і праваю

**Пераклаў з украінскай Андрэй Хадановіч**

Большыня перакладаў зробленая ўдзельнікамі «Перакладніцкай майстэрні», што працуе пры Беларускім калегіюме. «Калядная зорка» Б.Пастарнака публікуецца ў новай рэдакцыі, падрыхтаванай спэцыяльна для «НН».



Віталь Супрановіч

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Шоў-бізнэсовец Віталь Супрановіч

Традыцыйна «НН» вызначае галоўныя падзеі году, найлепшую кнігу, музычны альбом і г.д. Сёлета мы вырашылі назваць і Чалавека Году. Гэты чалавек працуе ў найважнейшым на сёньня з мастацтваў. Яго адбітак ёсьць на кожным беларускамоўным музычным дыску. Беларускую музыку ў КЗ «Менск» прывёў менавіта ён. Дысканоша **Віталь Супрановіч** па-ранейшаму ня мае канкурэнтаў. Нават «50-працэнтавы загад» па ўсіх FM-станцыях — часткова заслуга ягонай «BMA-group». Без штодзённай дзейнасьці, арганізацыі канцэртаў, выданьня і распаўсюду дыскаў, раскруткі новых гуртоў і супольных праектаў не ствларылася б патрэбная крытычная маса беларускае музычнае прадукцыі. Супрановіч засьведчыў, што на беларускай культуры можна, трэба і зусім ня сорамна зарабляць грошы. Бо гэта і значыць — любіць сваё.

## Папа Ян Павал II

Сёлета ўвесь сьвет, незважаючы на канфэсійныя падзелы, з заміраньнем сэрца сачыў за здароўем Папы — асобы ня проста году, але чвэрці веку. Бог дапамагае **Яну Паўлу II** дужацца з хваробай і не апускаць рук. Папа сёлета сьвяткаваў 25-годзьдзе свайго пантыфікату, высьвячаў новых кардыналаў, асуджаў вайну ў Іраку, а на сьвяты зноў прывітаў нас усіх па-беларуску.

## Патрыярх эміграцыі Вітаўт Кіпель

Асобай году можна назваць і **Вітаўта Кіпеля**. Ён сёлета выдаў і прывёз у Беларусь кнігу свайго жыцьця «Беларускі і беларусаведны друк на Захадзе». Дадаў да нашае культуры кантынэнт інтэлектуальнага даробку беларусаў замежжа.

## Дэпутаты Парфяновіч і Фралоў

Вылучаныя за сьмеласьць, амбітнасьць, харызму. За ўнутраную інтэлігентнасьць аднаго і непасрэднасьць другога. За тое, што адмовіліся ад камфорту добрага бізнэсу, спартовага «Мэрсэдэса», генэральскай пэнсіі і вясёлых рыбалак ды пайшлі ў сапраўдную палітыку. За стваральныя інтрыгі, нарэшце.

## «Мэдыямагнат» Сяргей Атрошчанка

Месца антыасобы году зь вялікім адрывам ад дабрадзея беларускіх прафсаюзаў Козіка, дабрадзея беларускай гісторыі Трашчанка і дабрадзея ідэалёгіі і Ліцэю Праляскоўскага займае **Сяргей Атрошчанка**, уласьнік фірмы-вытворцы бялізны «Serge». Пры канцы мінулага году ён перакрыў кісларод газэце «Свободные новости», а сёлета вызначыўся яшчэ двума экстравагантнымі ўчынкамі: спачатку абвясьціў пра намер набыць газэту «Daily Telegraph» з статутным фондам мільярд даляраў, а пасьля зарэгістраваў гандлёвую марку «Народная воля». Калі першае можна лічыць рэклямным ходам, дык другое — папросту ... Аднайменную газэту, і без таго заторганую судамі з «абражаным» Рыбаковым, чакае яшчэ адно разьбіральніцтва і выдаткі, выдаткі, выдаткі...

## Дыктатар Садам Хусэйн

Чакае суд і антыасобу сусьветнага маштабу — **Садама Хусэйна**. Той, хто шкадуе немалаводзя змучанага чалавека з карыесам, нехай перагляне хроніку эксгумацый сотняў ахвяраў яго рэжыму. Скінуўшы Садама, вялізная краіна вольна ўздыхнула. «Time» назваў асобай году амэрыканскага салдата. З гэтым можна спрачацца. Але ніхто больш нідзе не назаве асобай году Садама Хусэйна.

**Сяргей Мікулевіч**

Наступны нумар «НН» выйдзе **9 студзеня**, у пятніцу. У Менску ў продажы — з абеду чацьвярга.

4 сакавіка 1999 г., падчас судовага разьбіральніцтва крымінальнай справы па абвінавачаньні Старавойтава В.К., у залі суду Кіраўскага раёна адвакат Страмкоўская В.В., абаронца абвінавачванага, заявіла: «Прошу огласить документы, где сейчас коньяк «Белый аист». А оглашать уже нечего. Смоленцев день рождения праздновал».
Гэтыя зьвесткі не адпавядаюць сапраўднасьці.

**Запрашаем на калядна-навагоднюю вандроўку у Горадню 28 сьнежня (нядзеля)** з заездам у Мураванку (царква-крэпасьць XVI ст.). Тэл.: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 8-029-776-24-35 (Павал).

Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя — БНФ выказвае шчырае спачуваньне сябру Заводзкай рады **Пятру Казлоўскаму** з прычыны трагічнай сьмерці сына. Сумуем разам з табою, Пётра.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Спадарыню Лідзію** Прашковіч віншуем з 35-годзьдзем выкладчыцкай дзейнасьці. Студэнты

**25 сьнежня** ў маёй маці Дзень народзінаў. Віншуем! Усе, усе, усе!

**Віншую** сваю маці Бакуновіч Валянціну з Днём народзінаў. Сын Уладзімер

**Усе родныя** і блізкія жадаюць Бакуновіч Валянціне шчасьця, здароўя і ўсяго найлепшага ў сувязі зь юбілеем

**Віншуем Юру Гуменюка** з выхадам новай кнігі! Жадаем яму тыгровай упэўненасьці й архідэю ў пятліцы. Алесь Аркуш, Вінцэсь Мудроў

**Усіх Нашаніўцаў** віншуем з Новым годам і Калядамі. Зычым далейшай плённай працы на ніве Беларушчыны. Мазырчукі

**Саша Мікшта,** віншую з Хрыстовымі народзінамі і Новым годам! Здароўя табе, не замярзай і не сумуй. Прывітаньне з Раўбічаў

**Віншую** сваю Каханую з чацьвертай гадавінай нашага хаўрусу. Закаханы хаўрусьнік

**Цудоўную** дзяўчынку Ксеню віншую з прыгожымі зімовымі сьвятамі. Сінюткага неба над галавой! Сямён

**Тата,** яшчэ раз з Днём народзінаў! Мама, бабуля, я

**Vinšuju** brata-studenta z chutkim supolnym śviatam — narodzinami, a taksama z Novym hodam i Kaladami!

**Pryvitańnie** ūsim svajim i ūsim čužym! Vinšuju z nadychodziačymi śviatami! Usim — usiaho! Pečańko S.

**Віншуем з Калядамі** і Новым годам усіх удзельнікаў пленэру ў Лакцянах'2003. Сьцебуракі, Вялейка

**Радуйцеся** й весяліцеся! Хрыстос нарадзіўся! Слаўце Яго! Vivat

**З Раством** і Новым годам! Шчасьця і радасьці вам, беларусы! Грамадзянін БНР

**Тусік**, з Днём народзінаў! Чмок, пцюнь, опанькі

**Усе хатнія жывёлкі** віншуюць сваю гаспадыню Тусіка з Днём народзінаў. Галоўная зь іх

**Савецкія піянеры** віншуюць скаўтку Тусіка з Днём народзінаў. Будзь гатовая!

### КАНТАКТЫ

**Хадзі да нас**, бо ў гэты час чакаем мы цябе якраз! Моладзевая ініцыятыва «Вока». voka@day.by

**Не спадзяваўся**, што ў Rock-n-Rolle можна яшчэ нешта вынайсьці. Вялікі дзякуй табе, «ULIS», за люстэрка. Для мяне гэта сапраўдны падарунак. Andrej Ziecka

**Запрашаем** патрыётаў-нацыяналістаў, прыхільнікаў палітычнай дзейнасьці С.Высоцкага, на сустрэчы кожны аўторак а 18.00 ля помніка Купалу (насупраць цырку)

**Прапаную**: маркі, значкі, шаўроны, кукарды з гістарычнай сымболікай. Т.: 8-029-753-91-96

### КВАТЭРА

**Здыму** 1-пакаёвую кватэру. Т.: 8-029-755-08-40

### КНІГІ

**Куплю дорага** «Расейска-беларускі слоўнік» С.Некрашэвіча і М.Байкова, 1928 г. Т.: 275-49-59

**Прадам** «Этымалягічны слоўнік беларускай мовы» (т.1—4, 8). Т.: 230-91-53

**Прадам** «Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусі», «Беларускую энцыкляпэдыю», т.7, 8. Т.: 230-91-53

**Прадам** «Беларуска-расійскі слоўнік» Байкова і Некрашэвіча. Т.: 230-91-53

**Прадам** «Пан Тадэвуш» А.Міцкевіча, «Расейскую граматыку» ў 2-х частках. Т.: 230-91-53

**Прадам** энцыкляпэдычны даведнік «Культуралёгія». Т.: 230-91-53

**Прадаецца кніга** Герлінга-Грудзіньскага «Наш брат — Зло». Кантакт: bielbook@tut.by

**Кнігу прадам** (можна абмен): «Яснавяльможны Пан Сапега», «У нашай Лівоніі», «Гісторыя Беларусі» і «Сусьветная цывілізацыя», «У пошуках этнічнай памяці», «Беларускія остарбайтары», «Преобразования в Молодечненской области (1941—53)». Т.: 8-029-753-91-96

**Куплю** «Беларускую энцыкляпэдыю» (1—8), «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі» (1—6), «Археалёгія», «Фальклёр», «Этнаграфія», «Архітэктура» і інш., можна абмен. Т.: 285-00-00, аб.20227

**Кнігі** «Организация ЭВМ», 2003 г., 845 с., 25 т.р. «Я купил комп...», 2003 г., 191 с., 3 т.р. Т.: 230-66-20

**Кнігу** «Матэматычная энцыкляпэдыя» можна набыць у Гомелі. Т.: 45-11-51 (увечары)

**Беларускія кнігі**, CD, аўдыё і відэа ў Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13.00

### ПРАЦА

**Шукаю працу** цеплатэхніка ў г.Менску. Т. (у Слуцку): 6-19-64. Віктар

### ПЫЛОК

**Прадаю** экстракт пчалінага пылку — абсалютна чысты, эфэктыўны, няма алергіі. 10$ на 50 дзён. 450 г. Вышліце нумар тэлефона. А/с 306, 220007, Менск

### IN MEMORIAM

14 сьнежня памёр Аляксандар Уракаў, геніяльны музыка, гітарыст легендарнага гурту «Gods Tower»

### ВЕРШ НА КУПОНАХ

a defloration

*Aksińni*

Ja vyjdu kraski rvać u poli…
Choć nazryvaju jich davoli,
nia ścichnie mnie učućcie bolu —
ja źviedaju svaju niadolu:
bo Najpryhožajšaja Kraska
Užo sarvanaja nia mnoju,
mnie serca poūnicca tuhoju
ad nieatrymanaje łaski!
Choć kraski novyja zakvitniejuć viasnoj,
adna dziūniejšaja adnoj,
ale na ūsio žyćcio spakoj
nia znaćmu, Kraska, ja praz vobraz tvoj!
Siaržuk

Спадарыня Юзэфа Найдзюк (Каліфорнія, г.Пасадэна) падпісала на «Нашу Ніву» дзьве бібліятэкі. Вялікі дзякуй!

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Навагоднія шахматныя турніры

**У нядзелю, 28 снежня, клюб «Вясьнянка»** (Менск, пр.Машэрава, 83, трэці паверх) ладзіць турнір па хуткіх шахматах для ўсіх ахвотных. Чакаецца ўдзел чэмпіёна сьвету сярод юнакоў Сяргея Жыгалкі, грасмайстраў Сяргея Азарава і Аляксея Аляксандрава. Пачатак у 14.00. Даведкі праз т.: 8-029-678-81-06 (Уладзімер). У гэты ж дзень шахматнае спаборніцтва пройдзе ў Шчучыне, у мясцовым Доме культуры. Запрашаюцца ўсе, хто абміне Вясьнянку. Даведкі праз т.: (01514) 2-57-34, спытаць Андрэя.

### Канцэрт Вальжыны Цярэшчанкі



**27 сьнежня а 19-й у менскім Палацы вэтэранаў** (Янкі Купалы, 21) адбудзецца канцэрт знакамітай бардэсы з Гомелю Вальжыны Цярэшчанкі. Пасьля працяглага перапынку яна прэзэнтуе новы альбом «Хтось крануўся крылаў», запісаны ў Швэцыі. Разам з Вальжынай выступяць барды Андрэй Мельнікаў і Зьміцер Вінаградаў. Даведкі праз т.: 8-029-649-08-88, 8-029-766-24-25. Квіткі каштуюць 4500 руб.

**ВР, СМ**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**В.А-ву, В.К-ку зь Менску.** Ваш артыкул не газэтны. Магчыма, часопісны.

**Аляксею Ш. зь Менску.** Юбілейная нататка напісаная занадта энцыкляпэдычна, чытачы пазасынаюць.

**Сяргею А. зь Менску.** Фразу пра ўмовы для расейскага чалавека А.Л. сказаў даўно. Яна ўжо дазваньня абсмактаная ў СМІ. Ваш допіс да ранейшых публікацыяў на гэтую тэму нічога не дадае.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
выпускны рэдактар — Арцём Лява
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
16 палос фарматам А2, 8 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3417. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 24.12.2003.
Замова № .
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________